ЛіМ
Літаратура і мастацтва
газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

12 ЧЭРВЕНЯ 1998 Г. № 24/3952 КОШТ 4 000 РУБ.

БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ

Уладзімір КОНАН: "Сёння нацыянальнае адраджэнне ёсць гістарычнае прызначэнне ўсіх народаў, якім не наканавана знікнуць у "чорнай дзірцы" гісторыі. Для былых заваяваных альбо "добраахвотна" далучаных народаў — "саюзнікаў" (тэрмін, які прыдуманы яшчэ ў Рымскай імперыі для вызначэння мірных, часова небунтоўных калоній) нацыянальнае адраджэнне ёсць багадатная альтэрнатыва гістарычнай анігіляцыі".

5

"...ПАСЛЯ ПРЫЯЗНЫХ, ДОБРЫХ СЛОЎ..."

Гутарка з празаікам Андрэем ФЕДАРЭНКАМ

7

З ДУМКАЙ ПРА ЖЫЦЦЁВЫЯ НЯГЕМАСЦІ...

Вершы Віктара ЖЫБУЛЯ

8

ХУТКІЯ НОГІ

Апавяданне Янкі СІПАКОВА

8—9, 14—15

ВАМ КЕПСКА?..

Яўген РАГІН: "Асобныя паліклінікі дзяржавы нашай укамплектаваны медперсаналам на 40—50 працэнтаў. Адсюль, відаць, і норма на ўчастковага "знахара" — дзве тысячы патэнцыяльных пацыентаў (!)".

13

Зноў прад вачыма Свіцязь... А. Вазнясенскі.

Выступае А. Вярцінскі.

Паэзію вітала Свіцязь

Сапраўдным паэтычным святам сталася вечарына, што адбылася днямі на беразе Свіцязі ў Наваградскім раёне. Арганізатары імпрэзы, якая была прысвечана дзвюм постацям сусветнай літаратуры — Адаму Міцкевічу і Аляксандру Пушкіну, запрасілі на сустрэчу рускага паэта Андрэя Вазнясенскага. Яго повязь з Беларуссю, свіцязянскімі ваколіцамі мае даўнюю як на сённяшні час гісторыю. Яшчэ ў 1969 годзе паэт упершыню наведаўся да дуба, авеянага неўміручай славай Міцкевіча. Выступаючы перад гасцямі, удзельнікамі свіцязянскай сустрэчы, А. Вазнясенскі прачытаў і новы свой верш, які напісаў, двойчы абышоўшы вакол Свіцязі.

Свята, наладжанае нашымі Саюзамі пісьменнікаў і тэатральных дзеячаў, сабрала многіх знакамітых майстроў паэтычнага слова. Вёў вечарыну старшыня СПБ Уладзімір Някляеў. Чыталі вершы Вольга Іпатава, Анатоль Вярцінскі, Міхась Скобла, Браніслаў Спрынчан і іншыя. З цікавасцю слухалі ўдзельнікі свята мясцовых паэтаў. І ў іх радках гучала захапленне, пранікліваяўлюбёнасць у паэзію, у творчасць вялікага Міцкевіча.

Прыемна, што поруч з літаратарамі, людзьмі мастацтва сярод паважаных гасцей свята быў і старшыня калгаса "Савецкая Беларусь", двойчы Герой Сацыялістычнай Працы Уладзімір Бядуля (дарэчы, Вазнясенскі менавіта яму, свайму старому сябру, прысвяціў паэму "Лётае мужык"). На Свіцязянскай паэтычнай імпрэзе гасцявалі вядомы рэжысёр Барыс Луцэнка, драматург Аляксей Дударэў, публіцыст Яўген Будзінас. Сапраўдным энергетычным рухавіком свята быў намеснік старшыні пісьменніцкай арганізацыі Віктар Жак, вядомы асветнік, свайго роду імпрэсарыо прыезду на Беларусь у самыя розныя часы і Андрэя Вазнясенскага, і Бэлы Ахмадулінай, і Яўгенія Еўтушэнкі, і Андрэя Дзяменцьева...

Кастусь ЛАДУЦЬКА
Фота А. Талочкі, БелТА

БУДЗЬМА РАЗАМ!

Шаноўныя чытачы! Засталося некалькі дзён, каб падпісацца на наш тыднёвік на другое паўгоддзе 1998 года. Спадзяёмся, што Вы, нашы прыхільнікі і аднадумцы, не пакінеце сябе без "ЛіМа"...

*Кошт падпіскі застаўся ранейшым. Для індывідуальных падпісчыкаў кошт на адзін месяц — **15 тысяч рублёў**, на квартал — **45 тысяч** і на паўгоддзе — **90 тысяч**.*

Наш індэкс — 63856.

КОЛА ДЗЁН

12 чэрвеня Расійская Федэрацыя афіцыйна святкуе Дзень Незалежнасці. Сёння, мабыць, не ўсе памятаюць, што "парад суверэнітэтаў", які прывёў да дэмантажу СССР, распачала менавіта Расія. А стаўся гэты працэс неабарачальным пасля таго, як Расія абрала сабе асобнага прэзідэнта. Пасля гэтага ніякія гарбачоўскія рэферэндумы пра "обновленный союз" ужо нічога не маглі змяніць: бо, як той казаў, "процесс пошел". У Віскулях па сутнасці толькі юрыдычна засведчылі факт, які адбыўся: СССР скончыўся.

Віншуем усходніх суседзяў з іхнім святам, шчыра жадаем, каб Дзень Незалежнасці быў святам кожнага з народаў РФ, кожнага рэгіёна. Інакш кажучы, каб свята было ўсенародным.

ФЕСТЫВАЛЬ ТЫДНЯ

У мінскім Палацы культуры прафсаюзаў дэманструюцца польскія фільмы 90-х гадоў. У праграме "Паслядоўнасць пачуццяў", арганізаванай Кінаклубам і Польскім інстытутам у Мінску (дырэктар — Томаш Нягодзіш), — "вечныя тэмы" ў сучаснай трактоўцы. Калі прыняць на веру, што Беларусь увогуле ідзе "польскім шляхам" і праходзіць з пэўным спазненнем тыя ж фазы развіцця — культурнага, сацыяльнага, палітычнага, дык польскі кінематограф сёння — гэта беларускі кінематограф заўтра.

ПРАЕКТ ТЫДНЯ

Намеснік міністра ўнутраных спраў РБ Ю. Сівакоў і ўладыка Філарэт падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Унутранымі войскамі і Беларускім экзархатам Рускай Праваслаўнай царквы. Святары "запоўняць нішу", якую раней займалі зампаліты і палітрукі. Будзе сумесная газета "Христолюбивый воин". Хочацца спадзявацца, што супрацоўніцтва будзе плённым, і служачыя ўнутраных войск, выконваючы адпаведныя загады падчас мітынгаў апазіцыі, будуць памятаць хрыстовыя запаветы, першы з якіх — "Вазлюбі бліжняга".

"ВОЛЬНАСЦЬ" ТЫДНЯ

У раённым цэнтры Крычаў (Магілёўшчына) пачала выходзіць газета "Вольны горад". Заснавальнік — мясцовая грамадская арганізацыя "Гуманітарная ініцыятыва". Паколькі газета незалежная і трымаецца дэмакратычных каштоўнасцяў, яе галоўны рэдактар ужо меў афіцыйныя з мясцовым начальствам размовы. У райвыканкаме, райаддзеле міліцыі і ў адміністрацыі. Для пачатку яго папярэдзілі...

УШАНАВАННЕ ТЫДНЯ

Васіль Быкаў атрымаў Міжнародную залатую прэмію Святога Валянціна. Медаль і дыплом уручыў пісьменніку пасол Італіі Дж. Чэруці. Прэмія прысуджаецца выдатным творцам за прынцыповасць і сцвярджэнне гуманістычных каштоўнасцяў у творчасці. Сярод тых, хто быў узнагароджаны гэтай прэміяй, — кінарэжысёр Антаніоні і пісьменнік Салжаніцын.

НЕБЯСПЕКА ТЫДНЯ

Больш за 50% крыніц гаспадарча-побытавага водазабеспячэння сталічнай вобласці не адпавядае сёння гігіенічным нормам. Асаблівую занепакоенасць выклікае якасць вады ў шахтных калодзежах. У раёнах вялікіх тэхнагенных нагрузак узнікае небяспека заражэння глыбінных вод. Акрамя таго — чарнобыльскі фон: 11 раёнаў Міншчыны забруджаны радыенуклідамі. Не лепшыя справы і ў іншых абласцях Беларусі.

ГАСЦІННАСЦЬ ТЫДНЯ

Сёння ў Паставы з'язджаюцца народныя музыкі з усяе нашай краіны, а таксама выканаўцы-аматары з Латвіі, Літвы, Расіі, Украіны. Нагода — традыцыйны, у трэці раз міжнародны, фестываль "Звіняць цымбалы і гармонік". Пятніца, субота, нядзеля ў гасцінным кутку беларускага Паазер'я запомняцца ўдзельнікам ды відавочцам фэсту многімі падзеямі. У праграме — канцэрты на вольным паветры і на сцэне Дома культуры, у паркавым амфітэатры і на пляцоўках гаспадарак раёна. Плануюцца выступленні Акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Г. Цітовіча, Акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча, мастацка-гістарычная танцавальна-забаўляльная праграма "Пастаўскі баль", феерверк "Агні спадчыны", сустрэчы чальцоў журы і вядомых музыкаў са школьнікамі, традыцыйны конкурс выканаўцаў на народных інструментах "Хто каго?", канцэрт старадаўняй беларускай і акадэмічнай музыкі ў касцёле, адкрыццё выставачнай залы раённага Дома рамёстваў, сюрпрызы "Паазерскага кірмашу", "Баль пад зоркамі"... Паспрабуй паспець паўсюль!

ЛАЎРЭАТ ТЫДНЯ

Вядомы беларускі пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка", прэзідэнт Беларускага дзіцячага фонду Уладзімір Ліпскі стаў лаўрэатам адной з дзвюх прэмій імя Альберта Швейцара, якія прысуджаюцца сёлета. Гэтыя прэстыжныя міжнародныя ўзнагароды былі заснаваны ў 1969 годзе Фондам Гётэ, штаб-кватэра якога знаходзіцца ў горадзе Базелі (Швейцарыя). Паводле палажэння аб прэміях, яны ўручаюцца за бескарыслівую дзейнасць у духу чалавекалюбства і гуманнасці, як разумеў гэта вялікі філосаф, гуманіст і праведнік нашага стагоддзя, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Альберт Швейцар. Журы так высока ацаніла дзейнасць У. Ліпскага на карысць беларускіх дзяцей, якія сталі нявіннымі ахвярамі Чарнобыля. Уручэнне прэміі адбылося ў будынку Савета Еўропы ў прысутнасці яго кіраўнікоў, а таксама кіраўнікоў дыпламатычных місій, вядомых грамадскіх дзеячаў Германіі, Італіі, Францыі, Швейцарыі. Прэмію У. Ліпскі атрымаў з рук архіепіскапа Страсбурга Шарля Амарэна Брандта. Другі сёлетні намінант гэтай узнагароды — прэзідэнт французскай асацыяцыі "Куток Калумбіі" Петрык Беглат.

ПАМЯЦЬ ТЫДНЯ

Год назад беларуская культура панесла адчувальную страту. Памёр Юрый Карачун, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. У чацвер, 11 чэрвеня, гэтую сумную гадавіну адзначылі родныя, сябры і калегі Юрыя Аляксандравіча. У музеі адбыўся вечар памяці і адкрылася выстава. Ю. Карачун быў не толькі выдатным адміністратарам і арганізатарам музейнай справы. Ён быў яшчэ і мастаком. На выставе — ягоныя творы, аздобленыя ім кнігі, альбомы, дзе ён быў аўтарам-складальнікам. Таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім, за якую справу ні возьмецца.

Свята ў святым горадзе

У беларусаў два святыя гарады. У адным зарадзілася Беларуская дзяржава, у другім — дасягнула свайго росквіту. Полацак і Вільня. Сюды б яшчэ дадаць Мінск, які мае статус сталіцы зараз, але, скажам шчыра, Мінск у гэтай кампаніі выглядае, як "новы беларус" сярод старасвецкай шляхты.

5 чэрвеня ў Полацку адбылася падзея, якая яшчэ раз нагадала пра ролю гэтага горада ў беларускай (і шырэй — ва ўсходнееўрапейскай) гісторыі. Тут адзначылі дзень памяці нябеснай апякункі Беларусі святой Еўфрасінні Полацкай. Сёлета — 825 гадоў як скончылася яе зямное жыццё. Дарэчы, гэта "круглая" дата супала з 50-годдзем утварэння Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы на эміграцыі. Сабор беларускіх праваслаўных святароў, які прыняў гэтае рашэнне, праходзіў у 1948 годзе ў германскім горадзе Канстанца.

Напярэдадні дня памяці святой Еўфрасінні Полацкай уладыка Філарэт, а таксама архіепіскапы і епіскапы Беларускага экзархата Рускай Праваслаўнай царквы звярнуліся да вернікаў з пасланнем, у якім выказалі сваю версію жыцця і дзейнасці святой Еўфрасінні, трактуючы полацкую асветніцу, што будавала на зямлі нашай храмы і манастыры, як пераемніцу справы "раўнаапостальнага" князя кіеўскага Уладзіміра, які нішчыў Полацак агнём і мячом, а Еўфрасінневу прабабулю Рагнеду прылюдна гвалціў. Народ у Беларусі не надта дасведчаны ў сваёй гісторыі, таму большасць праваслаўных вернікаў гэтыя тэзісы РПЦ праглыне лёгка, але святар гісторыю ведаць абавязаны...

Як бачыце, імя і справу святой Еўфрасінні і сёння скарыстоўваюць, як сцяг, розныя палітычныя сілы. У тым ліку і тыя, для каго Беларусь — не болей чым губерня-экзархат. Зрэшты, зменіцца палітычная сітуацыя, і загавораць святары іншымі словамі. Сам жа дзень святой Еўфрасінні — гэта свята, якое не залежыць ад надвор'я. У тым ліку і надвор'я палітычнага. Гэты дзень адзначалі, калі Беларусь была пад Расійскай імперыяй; пра святую Еўфрасінню народ не забываў у час панавання бальшавіцкага атэізму; свята зноў было адноўлена ў часе фашыстоўскай акупацыі. Дарэчы, менавіта ў 1943 годзе астанкі святой Еўфрасінні былі перанесены з музея, дзе камуністы дэманстравалі іх на атэістычнай выставе, у царкву Спаса, дзе яны знаходзяцца і дагэтуль. У акупантаў, у адрозненне ад некаторых мясцовых выхаванцаў, хапала розуму, каб скарыстоўваць у сваіх мэтах нацыянальныя святыні.

5 чэрвеня ў Полацку чакалі патрыярха Маскоўскага, але той па прычыне нездароўя прыехаць не здолеў. Адпаведна не здолеў прыехаць і прэзідэнт РБ. Дзяржаву на свяце прадстаўлялі чыноўнікі меншага рангу. Але міліцыі было шмат. На тэрыторыі манастыра можна было пабачыць усемагчымыя адценні міліцэйскага камуфляжу.

Той, хто памятае, як выглядаў манастыр у 80-х гадах, не можа не ўсцешыцца з таго, што Храм адноўлены, а дарога да Храма падрамантавана. Цяпер гэта вуліца імя Еўфрасінні Полацкай. Манастыр гэта не толькі духоўны цэнтр, але і гаспадарчы комплекс. Таму натуральна, што на тэрыторыі манастыра ёсць агароды, цяпліцы, гараж, хлеў. Але гаспадарчыя пабудовы стаяць, нягледзячы на пратэсты археолагаў, на магільніку XII стагоддзя. А каб зрабіць агароды, высеклі цудоўны гай. Вялікіх намаганняў каштавала археолагам прыпыніць у манастыры будаўніцтва новых аб'ектаў, каб найперш правесці раскопкі. Археолагаў, ды і ўвогуле беларускіх інтэлігентаў, трэба адзначыць, у Полацкай епархіі не шануюць, бо тыя "перашкаджаюць жыць". У перспектыве такія стасункі могуць абярнуцца для Праваслаўнай царквы вялікімі стратамі. Спадзеючыся выключна на дзяржаўную падтрымку (РПЦ мае ў Беларусі статус дзяржаўнай царквы) і моцна трымаючыся састарэлых канонаў, царква рызыкуе...

Хрэсны ход, калі з Храма вынеслі Крыж (адроджаны) і мошчы святой Еўфрасінні, мог расчуліць самага закаранелага атэіста і нават міліцыянтаў, што стаялі ў ачапленні. Гэта, бадай, галоўнае ўражанне ад святкавання дня святой Еўфрасінні ў Полацку.

П. ВАСІЛЕЎСКІ

"Пчолы бароняць вулляў сваіх..."

ЗАЯВА НАВУЧЭНЦАЎ БЕЛАРУСКАГА ГУМАНІТАРНАГА ЛІЦЭЯ

Мы, навучэнцы Беларускага гуманітарнага ліцэя, выказваем сваё абурэнне чарговымі спробамі дзяржавы знішчыць нашу навучальную ўстанову шляхам далучэння ў якасці "аддзялення" да ліцэя пры БДУ.

Наш ліцэй — адзіная ў Беларусі навучальная ўстанова перадуніверсітэцкага тыпу, дзе ўсе прадметы выкладаюцца па-беларуску на высокім еўрапейскім узроўні.

Як вядома, у ліцэі пры БДУ выкладанне вядзецца па-руску і там вучыцца ў 3 разы болей дзяцей, таму гэта непазбежна прывядзе да паглынання нашага ліцэя і яго знішчэння. Гэта будзе лёгка зрабіць, паколькі разам з далучэннем да ліцэя БДУ і з падпарадкаваннем рэктарату БДУ мы страчваем самастойнасць, нам адводзіцца толькі сціплая роля "аддзялення".

Нашы ліцэі адрозніваюцца адзін ад аднаго не толькі мовай выкладання. У нас розныя навучальныя праграмы, складзеныя ў адпаведнасці са спецыфікай нашых ліцэяў. У нашым ліцэі даўно склаўся сталы калектыў высокапрафесійных выкладчыкаў.

Мы самі, разам са сваімі бацькамі, выбралі Беларускі ліцэй у якасці месца навучання, вытрымаўшы экзамены, каб атрымаць лепшую ў рэспубліцы гуманітарную беларускамоўную адукацыю і добра падрыхтавацца да паступлення ва універсітэт. Змена месца навучання парушыць прынцып сістэмнасці і пераемнасці, парушацца традыцыі, якія склаліся ў нашым ліцэі.

Кожны мае права выбіраць месца навучання. Мы свой выбар зрабілі, так, як і тыя, хто штогод паступаюць у наш ліцэй, прэстыж і папулярнасць якога расце з кожным годам. Пра гэта сведчыць конкурс — 5 чалавек на адно месца!

Калі дзяржава знішчыць наш ліцэй — гэта будзе найвялікшае злачынства не толькі супраць нас, навучэнцаў, але й супраць тых шкаляроў, якія ў будучым маглі б стаць нашымі калегамі па сапраўды беларускім ліцэі.

Мы ведаем, што праўда і закон на нашым баку, і мы будзем, як і летась, усімі законнымі сродкамі б а р а н і ц ь сваё права на атрыманне адукацыі на роднай мове і свой ліцэй, які даўно ўжо стаў для кожнага з нас другім, а то й першым домам. Нашу абарону ліцэя аж да перамогі будуць агучваць словы беларускага першадрукара і асветніка Францішка Скарыны: "...пчолы, і ім падобныя, бароняць вулляў сваіх — таксама й людзі, дзе нарадзіліся і ўскормленыя былі воляю Божаю, да таго месца вялікую ласку маюць".

Навучэнцы беларускага гуманітарнага ліцэя Віктар Мухін, Багдан Арлоў, Марыя Шахаўцова, Пятро Садоўскі, Васіль Песенька, Аляксей Дамарад, Кірыл Ільніцкі, Марыя Федзечкіна, Віктар Іваноў, Алесь Лях, Максім Войніч, Вольга Карповіч, Ціна Міцкевіч, Наталля Немцава, Аліна Сурскова, Ганна Асіповіч і інш.

5 чэрвеня 1998 г.

АДГАЛОСКІ

Ратунак у прыватнай ініцыятыве?

Тыдзень таму давялося на ўласныя вочы бачыць, як, нягледзячы на высокія цэны на мяса, любяць беларускую паэзію. Пад помнікам у скверы імя Янкі Купалы вядомы малады паэт прадаваў праз імправізаваны аўкцыён зборнічак сваіх вершаў. Зыходны кошт у долар паступова ўзрастаў. Блізка сотні чалавек неадназначна ўсміхаліся...

Гэтак паэт Славамір Адамовіч распачынаў творчую вечарыну, якая анансавалася ў газеце "Наша ніва" як "art-акцыя". Стасункаванне з публікай атрымалася надзвычай цікавым і шматстайным — ад уласна чытанняў вершаў да паведамленняў пра ваколкультурніцкія варункі і планы.

А незадоўга да згаданай вечарыны мінскія гарадскія ўлады адмовілі Таварыству беларускай мовы і БСДГ (Народная Грамада) у правядзенні традыцыйных паэтычных чытанняў. Творчая ж сустрэча Адамовіча адбылася нібыта ў кантэксце гэтых чытанняў. У тым жа самым месцы, у той жа час, амаль у падобных атмасферы і форме, з той жа мэтай, якую паэт ад імя ўсіх пісьменнікаў агучыў наступным чынам: "Мы не мусім заганяць сябе ў клубнае падполле". Адно што без гукаўзмацняльнай апаратуры і бел-чырвона-белага сцяга, атрыбутаў, мабыць, і неабавязковых, бо некаторых яны чамусьці нервуюць.

Што да лёсу літаратурных чытанняў, то ТБМ збіраецца нанова падаваць у Мінгарвыканкам заяўку і спадзяецца на станоўчы разумны адказ. У гэтай арганізацыі лічаць, што адбылася з пэўнай палітычнай аздобай недарэчнасць, і пазіцыю сталічнай мэрыі ў нечым разумеюць. ТБМ наракае на тое, што ў прэсе даводзяць, нібыта чытанні сезонныя — ладзяцца ўлетку і ўвосень. Тут, сапраўды, можна згледзець пэўныя памкненні да палітычных выгод, тым больш што адным з арганізатараў чытанняў з'яўляецца апазіцыйная партыя. Аднак насамрэч вечарыны не перапыняюцца, праходзіць цэлы год (толькі астатняй парой перамяшчаюцца са сквера ў музей Янкі Купалы, бо трэба берагчы галасы бардаў, заўсёдных удзельнікаў чытанняў).

Тут, дарэчы, паўстае натуральнае пытанне — ці не варта дзеля таго, каб пазбегнуць непатрэбных канфліктаў, каб захаваць выдатную традыцыю, ладзіць творчыя літаратурныя сустрэчы намаганнямі толькі ТБМ? Можа, калі што, выратуюць прыватныя ініцыятывы беларускіх пісьменнікаў.

Кірыла ПАЗНЯК

ФЕСТЫВАЛІ

"Маладзечна-98" чакае маладых

Як паведамляў "ЛіМ", праз тыдзень урачыстыя фанфары абвесцяць адкрыццё V фестывалю беларускай паэзіі і песні "Маладзечна-98". Кожны, хто неабыякавы да гэтай доўгачаканай падзеі (сапраўды, маладзечанскага фэсту давялося чакаць аж два гады — летась ён "браў тайм-аўт"), зможа спрычыніцца да яе, не пакідаючы ўласнага дома: тэлебачанне будзе весці вечаровыя трансляцыі канцэртаў і перадаваць у запісе найбольш адметныя дзённыя праграмы.

Такім чынам, беларускія гледачы змогуць "пахварэць" за ўдзельнікаў конкурсу маладых выканаўцаў, які адбудзецца ў першы ж вечар. Як лічыць мастацкі кіраўнік фестывалю народны артыст Беларусі Міхал Фінберг, сёлета каманда спаборнікаў досыць моцная і перспектыўная. У выніку папярэд—ніх адборачных праслухоўванняў на маладзечанскі конкурсны рынг выйдуць прадстаўнікі Брэстчыны ды Віцебшчыны, Магілёўшчыны ды Гомельшчыны, Міншчыны ды самой нашай сталіцы. Сярод іх ёсць імёны, ужо вядомыя ў асяроддзі прыхільнікаў маладзёжнай беларускай эстрады: Вікторыя Алешка, Ягор Чуб, Улада Валадзько... Прыемна, што ў лік шаснаццаці канкурсантаў трапіў маладзечанец Дзмітрый Мінько. А ягоная зусім юная зямлячка Насця Жук — сярод пераможцаў сёлетняга фестывалю беларускай дзіцячай эстраднай песні "Спяваем з аркестрам...", канцэрт якіх мае адбыцца таксама ў першы фестывальны дзень. Дарэчы, маладзечанцы, рыхтуючыся падчас паэтычна-песеннага свята адзначыць 610-годдзе з часу першага ўпамінання назвы горада ў летапісах, успрымаюць такія факты з асаблівай прыемнасцю.

С. Б.

ПРЭЗЕНТАЦЫІ

Прысвечана Індыі

Дом дружбы сустрэў гасцей водарам пахкіх палачак і меладычнымі спевамі. Тут на колькі гадзін усталявалася аўра Індыі — краіны далёкай і па сутнасці малавядомай. "Веды" і "Рыгведа", "Махабхарата" і "Упанішады"... За гэтымі назвамі тысячагадовая традыцыя і багацце фальклору, глыбіня філасофіі і трансцэндэнтны досвед, разгаданыя і неразгаданыя таямніцы Усходу. Што з усяго гэтага дайшло да нашага часу, што незваротна страчана, што займела працяг і дасць парасткі ў будучыні — не дадзена ведаць. Аднак кожны, хто прагне Ведання, не можа не цікавіцца скарбніцай даўніны.

Напярэдадні Тройцы адбылася прэзентацыя трэцяга за гэты год нумара "Всемирной литературы", які цалкам прысвечаны пісьменству Індыі. Галоўны рэдактар Таіса Бондар назвала часопіс мосцікам паміж культурамі. Дзеля падрыхтоўкі нумара яна наладзіла кантакт з індыйскім пасольствам, карысталася яго бібліятэкай, наведала саму Індыю, каб пранікнуцца яе духам. "Краіна, дзе паўмільёна яшчэ не прачытаных рукапісаў на санскрыце, — не проста цывілізацыя, — сказала яна, — суперцывілізацыя".

Падобныя думкі выказаў і Георгій Марчук: "Геній Рабіндраната Тагора яшчэ не асэнсаваны і не ацэнены чалавецтвам".

У нумар увайшлі творы пісьменнікаў, што пісалі на розных мовах: бенгальскай (Р. Тагор), малаялам (Ананд), канада (У. Р. Анантха Муртхі), хіндзі (Шрыкант Варма) і дыялектах (Кабір). На старонках сустрэліся як нашы сучаснікі, так і старажытныя аўтары. Сярод іх і легендарны Вальмікі, які напісаў першапачатковы тэкст паэмы "Рамаяна". Тут змешчана і п'еса Маду Мхадуры — пісьменніцы, якая прысутнічала на сустрэчы ў якасці афіцыйнай асобы: як пасол Індыі ў РБ. Цікава, што яшчэ адзін аўтар нумара, Мохан Менан, з'яўляецца саветнікам пасольства Індыі ў Маскве. Відавочна, індыйскі ўрад шануе творча адораных людзей...

Спадарыня пасол зазначыла, што гэтая сустрэча адбываецца ў рамках святкавання Дня незалежнасці Індыі, аб'яўленай 15 жніўня 1947 года. Яна выказала ўдзячнасць Т. Бондар за падрыхтоўку нумара, а таксама А. Ваніцкаму за гасціннасць.

З выступлення А. Шаўчэнкі, дацэнта БДУ, мы даведаліся, што на філфаку ўжо тры гады вывучаецца курс літаратуры Старажытнага Усходу (Егіпет, шумеры, Індыя). Студэнты знаёмяцца не толькі з "Ведамі", але — ва ўрыўках — і са шматвяковай "Махабхаратай", роўнай па аб'ёме васьмі гамераўскім "Адысеям".

Слова бралі З. Азгур, сын вядомага скульптара, стваральніка бюстаў Р. Тагора, і Г. Паплаўскі, чыімі работамі была ўпрыгожана прыёмная зала Дома дружбы падчас прэзентацыі.

Святлана Баркун (яна вучыцца ў індыйскай Акадэміі танца) прадэманстравала **малітву** танцам, адмысловую па жэстах і міміцы.

Стварэнне нумара, прысвечанага прыгожаму пісьменству Індыі, вымагала пошуку перакладчыкаў і спецыялістаў, знаўцаў санскрыта. Такім спецыялістам аказаўся Аляксандр Елізар'еў, сын нашага славутага балетмайстра. Ён пераклаў з арыгінала ўрывак з "Ранішняй малітвы сікхаў" — уступную частку Свяшчэннага пісання сікхаў (1604 г.). Кніга была ўкрадзена з храма і, як сведчыць паданне, адноўлена па памяці адным з Гуру. Там ёсць словы, сугучныя нашым сённяшнім бедам і турботам:

Много дураков, слепцов,
мошенников.
Много воров и нахлебников.
Много уходит из этого мира,
кто правил силой.
Много головорезов —
копят убийства.
Много грешников уходят
из этого мира в скверне.
Много мерзавцев, погрязших
в грехах...

І яшчэ раз працытую дырэктара "Мастацкай літаратуры" (дзе, дарэчы, ляжаць гатовыя да выдання "Упанішады") Г. Марчука: "Дзякуй за святло краіне, без якой чалавецтва было б паўчалавецтвам".

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ
Фота Сяргея ЛУК'ЯНАВА

Натхнёныя Свіцяззю

Задума была адмысловай: у дзень нараджэння Пушкіна, у гонар 200-х угодкаў Міцкевіча правесці на Свіцязі свята з удзелам Андрэя Вазнясенскага. А потым і другая задума выспела: выдаць да гэтай культуровай падзеі шматмоўную кнігу. Выйшла яна напярэдадні — ледзьве паспела. У ёй "Свіцяззянка" славутага рамантыка: у арыгінале, па-руску (пер. А. Фета) і па-беларуску (пер. Ą. Зарыцкага), санеты і балады яго ж, пераствораныя Рыгорам Барадуліным. Вось адна з мініяцюр А. Міцкевіча:

Бог сам гэты свет
можа знішчыць
і другі збудаваць,
Ды без дапамогі нашай яму нас
не ўратаваць.

Рускамоўная частка кніжкі-перакруткі ўключае таксама вершы А. Вазнясенскага розных гадоў. Сярод іх такія вядомыя, як "Васількі Шагала", "Гойя", "Сага" ("Ты меня на рассвете разбудишь..."). У значнай частцы вершаў праходзіць беларуская тэматыка. Барадулінскія пераклады ўзяты з даўнейшага выдання і даволі дакладна перадаюць "канструктывісцкі" стыль паэта.

Фінансава падтрымалі зборнік многія дзяржаўныя і недзяржаўныя ўстановы Мінска, калгас "Савецкая Беларусь" (старшыня У. Бядуля), два творчыя саюзы — пісьменніцкі і тэатральны, адміністрацыя Фрунзенскага раёна сталіцы. Гэта якраз той выпадак, калі "са свету па нітцы..." З выходных дадзеных: выдавецкая суполка "ПЕЙТО", 1998. Аўтар праекта — Віктар Жак, вялікі аматар паэзіі, афармленне Сымона Свістуновіча. Кажучы словамі прадмовы (яна належыць Алесю Карлюкевічу), гэтая кніга здолела "паяднаць тры культуры, тры паэтычныя... прасторы".

Г. К.

АБСЯГІ

МАГІЛЁЎ...

Перамога "Парадокса"

Народны студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр "Парадокс" Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў заключным туры фестывалю "Студэнцкая вясна-98", які праходзіў у Віцебску, заваяваў гран-пры і званне лаўрэата. Перамога для горацкіх тэатралаў вельмі прэстыжная, бо атрымана была яна ў нялёгкай барацьбе з 24-ма канкурэнтамі, сярод якіх аказаліся і прафесійныя калектывы...

Алесь ПЯТРОВІЧ

ГОМЕЛЬ...

"Мы малюем навакольны свет"

У калоннай зале Гомельскага палаца піянераў і навучэнцаў адбыўся злёт пераможцаў абласнога конкурсу дзіцячага экалагічнага малюнка "Мы малюем навакольны свет". Сабраліся тут юнакі і дзяўчаты з усіх раёнаў вобласці. Папярэднічала конкурсу вялікая арганізацыйная работа, у якой самы актыўны ўдзел прыняла абласная станцыя юных натуралістаў (дырэктар У. Будзюхін). Дастаткова сказаць, што на выставу было прадстаўлена 600 работ. Пераможцам конкурсу ўручаны падарункі ад яго арганізатараў. Лепшыя работы юных мастакоў Гомельшчыны ўключаны ў рэспубліканскую экспазіцыю.

Дабрачынная акцыя мастака

Ва ўчастковай бальніцы, што ў вёсцы Старыя Дзятлавічы Гомельскага раёна, галоўным урачом працуе Аляксандр Мікалаевіч Ефімовіч. Ён вялікі аматар мастацтва, шмат зрабіў для таго, каб бальніца і тэрыторыя вакол яе выглядалі больш эстэтычна. Цяпер ля цэнтральнага хола гэтай лячэбнай установы пачаў рабіць манументальны роспіс член Беларускага саюза мастакоў Пётр Мураўчук. Яго сюжэты і пра боль чалавечы, і пра радасць жыцця. Гэты роспіс — дабрачынная акцыя мастака. У планах Пятра Мураўчука — напісаць і серыю пейзажаў аб маляўнічых мясцінах, якія раскінуліся вакол Старых Дзятлавічаў.

"Дэбют" працягвае традыцыі

Акцябрскі раён вядомы як край партызанскай славы. Нямала нарадзілася тут і знакамітых людзей. Калі арганізоўвалася карцінная галерэя ў гарадскім пасёлку, свае творы для яе перадаў зямляк, доктар мастацтвазнаўства, загадчык сектара выяўленчага мастацтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі Леанід Міканоравіч Дробаў. На Акцябршчыне і карані творчасці беларускага пісьменніка Уладзіміра Правасуда. Цяпер падрастае новая таленавітая змена. Садзейнічае гэтаму конкурс "Дэбют", які арганізавалі і правялі аддзелы па справах моладзі і адукацыі райвыканкама сумесна з рэдакцыяй мясцовай райгазеты. Гэтымі днямі падведзены вынікі конкурсу. Ва ўрачыстай абстаноўцы ў цэнтральнай раённай бібліятэцы віншаванні прымалі пераможцы: маладыя празаікі, паэты, краязнаўцы...

Аляксей ШНЫПАРКОЎ

ВІЦЕБСК...

Галерэя ў калегіуме

Дваццаць пяць карцін беларускіх мастакоў (сярод імён — Драздовіч, Бялыніцкі-Біруля, Ліцвінава, Шчамялёў, Кішчанка, Басаў, Малішэўскі, Мацієвіч) папоўнілі днямі калекцыю Полацкага езуіцкага калегіума. Справа ў тым, што рэстаўрацыя аднаго крыла калегіума, у якім размяшчаецца карцінная галерэя, ужо завяршаецца. На працягу многіх год Полацкі гісторыка-культурны запаведнік збіраў калекцыю карцін беларускіх мастакоў. Усе гэтыя творы зоймуць дастойнае месца ў галерэі.

Ад Браслава да Дуброўна

У мінулыя выхадныя ў Дуброўне прайшло традыцыйнае свята "Дняпроўскія галасы". На фестывалі песні і музыкі прыехалі творчыя калектывы з беларускіх гарадоў, што стаяць на Дняпры, а таксама з Чарнігаўскай і Смаленскай абласцей. Прыняў удзел у свяце і Дзяржаўны хор імя Цітовіча.

Гучна і самавіта адзіхацелі на Віцебшчыне "Браслаўскія зарніцы". Як адзначыў начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Мікалай Пашынскі, Браслаўскі фестываль стаў святам традыцыйнай культуры, адраджэння рамёстваў. Упершыню тут праходзіў конкурс майстроў лозапляцення. Спаборнічалі майстры з Гарадоцкага, Лепельскага, Наваполацкага, Міёрскага раёнаў. Пераможца атрымаў пральную машыну.

У гэтыя выхадныя на сваё свята запрашаюць Паставы: тут зазвіняць цымбалы і загучыць гармонік.

Экспедыцыя па Заходняй Дзвіне

Журналісты і навукоўцы з Віцебска і Цверы (Расія) удзельнічалі ў беспрэцэдэнтнай экспедыцыі па Заходняй Дзвіне ад яе вытокаў да Віцебска. За два травеньскія тыдні яны прайшлі на байдарках амаль 400 кіламетраў. Аўтар гэтага нестандартнага праекта — калектыў рэдакцыі газеты "Тверская жизнь". Падтрымала калег папулярная абласная газета Віцебска "Народнае слова". У час экспедыцыі эколагі і археолагі вывучалі сітуацыю з захаваннем прыроднай і гістарычнай спадчыны на берагах Заходняй Дзвіны, а журналісты накапілі ў сваіх блакнотах багаты жыццёвы матэрыял, які ў хуткім часе будзе выкладзены ў дарожных нататках.

Арыгінальную ідэю падтрымалі і на дзяржаўным узроўні. Міжнародную экспедыцыю паўсюдна сустракалі кіраўнікі гарадоў і раёнаў, а ў Віцебску быў наладжаны прыём у старшыні аблвыканкама Уладзіміра Андрэйчанкі. Мэта экспедыцыі "Заходняя Дзвіна-98" — прыцягнуць увагу грамадскасці да праблем экалогіі шляхам народнай дыпламатыі.

Святлана ГУК

"Магілёўская музычная вясна-98"

Выступленнем дзяржаўнага ансамбля песні і танцы "Умарына" з Мардовіі пачалася "Магілёўская музычная вясна-98". На Міжнародны фестываль у абласны цэнтр прыехалі прадстаўнікі суседніх дзяржаў — розныя мастацкія калектывы, як прафесійныя, так і самадзейныя.

Фота Мікалая ЦІТОВА, БЕЛТА

Асаблівасці прыроды: погляд з горада

У галерэі візуальных мастацтваў "NOVA", што месціцца ў цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы, — чарговая сустрэча з фотамастацтвам. Яе наладзіў Польскі інстытут у Мінску (спонсар праекта LOT — Польскія авіялініі). Выстава "Асаблівасці прыроды" прадстаўляе творы Эльжбеты Санчыкоўскай. Аўтарка нарадзілася ў Лодзі, вывучала гісторыю мастацтва ў Люблінскім каталіцкім універсітэце, доўгі час супрацоўнічала з Нацыянальным музеем у Варшаве. Напачатку спадарыня Эльжбета спецыялізавалася ў фатаграфаванні аб'ектаў мастацтва, што для гісторыка культуры вельмі лагічна, потым захапілася жывою прыродай. Станаўленню яе эстэтычных поглядаў паспрыялі вандроўкі ў экзатычныя (для еўрапейца) краіны — Кітай, Манголію, Тыбет. У творах Эльжбеты Санчыкоўскай, прадстаўленых у галерэі "NOVA", праявы прыроды збольшага знаёмыя, але ракурс бачання нечаканы. Гэта вельмі спецыфічны погляд на прыроду. Погляд гараджаніна. Адвечная мара таго, хто жыве сярод бетону і асфальту і бачыць жывыя фарбы прыроды праз вакно аўтамабіля: аднойчы пакінуць аўтамабіль на ўзбочыне і, нікуды не спяшаючыся, прайсціся па лесе, забыць на пэўны час пра штодзённыя клопаты. Сярод некранутай прыроды нават закаранелы атэіст хоць на момант паверыць у Бога...

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Можна чытаць, можна ставіць...

Дзякуючы выдавецтву "Беларуская думка" ў серыі "Школьная бібліятэка" пабачыла свет кніга "На Купалле". У гэты зборнік, укладальнікам якога з'яўляецца Н. Тарасевіч, увайшлі п'есы, добра вядомыя не аднаму пакаленню: "Залёты" Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, "Модны шляхцюк" Каруся Каганца, "Паўлінка" і "Прымакі" Янкі Купалы, "Мікітаў лапаць" і "На Купалле" Міхася Чарота. Творы можна чытаць, а можна (трэба спадзявацца, што ў многіх школах так і адбудзецца) паставіць на самадзейнай сцэне.

З НАГОДЫ

Ад Масквы да самых да ўскраін...

Пасля красавіцкага саміту кіраўнікоў дзяржаў СНД, які адбыўся ў Маскве, Беларусь страціла пасаду выканаўчага сакратара СНД, якую з 1993 года нязменна займаў беларус Іван Каратчэня. На гэтае месца "сеў" прадстаўнік Расіі, буйны бізнесмен і вядомы палітык, "круты" да кончыкаў пазногцяў Барыс Беразоўскі. Здавалася б, нічога істотнага не здарылася, бо дасюль сама тая пасада была не вельмі істотнай — істотным хіба што з'яўляўся аклад за яе, вызначаны на ўзроўні старшыні расійскага ўрада. Ды і шмат хто з вышэйшых кіраўнікоў краін СНД неяк вельмі актыўна паспяшаліся пра гэтую неістотнасць заявіць — маўляў, нічога асаблівага не здарылася, чыста тэхнічны момант. Момант, вядома, сапраўды тэхнічны, і каб замест Івана Каратчэні прызначылі якога-небудзь Івана Сідарава, сам гэты факт быў бы адзначаны хіба што некалькімі радкамі ў СМІ і пра яго хутка забыліся б.

Але згадаем добрую рускую прымаўку, што "не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек месца", і, прааналізаваўшы магчымасці гэтага канкрэтнага чалавека, лёгка зразумеем, што ўсё далёка не так проста, як многім здаецца. Вядома, калі зорку Барыса Беразоўскага дружна і надзвычай актыўна "распальваюць" на небасхіле СНД, і калі гэтая "акула" бізнесу і, трэба адзначыць, чалавек вельмі заняты, згадзіўся на такую, быццам бы фармальную, пасаду, "значит, это комунибудь нужно". Найперш, вядома, самому Барысу Абрамавічу, які ўжо даўно мае "зуб" на залатое дно транзіту праз Беларусь, на заманлівыя перспектывы вялікай прыватызацыі на Украіне, не кажучы ўжо пра гіганцкія нафтавыя праекты ў Закаўказзі і Сярэдняй Азіі. Але і не толькі яму...

Падчас прадстаўлення Беразоўскага ў выступленнях некаторых кіраўнікоў краін СНД і выступленні яго самога прагучалі новыя і даволі дзіўныя ноткі, якія датычылі будучых перспектыў Садружнасці. На думку гэтых выступоўцаў, СНД трэба пераўтвараць з фармальнага аб'яднання ў клуб дзелавых людзей, даўшы ў пытаннях інтэграцыі зялёнае святло прыватнаму бізнесу, ці, дакладней кажучы, тым самым яго маладым і энергічным акулам. Не сакрэт, што прыватны капітал у амаль што ўсіх краінах СНД займае сёння даволі значныя пазіцыі. Амаль ва ўсіх, за выключэннем Беларусі. Пры такіх вось планах СНД паступова стане інструментам каардынацыі падзелу сфер уплыву прыватнага капіталу, а Беларусь, дакладней яе эканоміка, адным махам можа быць адрэзана ад такога вось "працэсу", бо не сакрэт, што ў нас правіць баль не прыватны, а самы што ні ёсць дзяржаўна-манапалістычны капітал. Гэта значыць, мы выступаем, мякка кажучы, у іншым жанры і на той вялікай эканамічнай сцэне нам проста могуць не прадаставіць ролі, і калі і дадуць, то хіба што ў эпізодах. А гэта, як вядома, зусім не па густу нашаму самалюбіваму кіраўніцтву. Нам падавай самыя галоўныя ролі!

Вядома, вылучаны калісьці на пасаду выканаўчага сакратара СНД Станіславам Шушкевічам, Іван Каратчэня не вельмі моцна ўзняў яе рэнамэ, не меўшы прамых і шчыльных сувязяў з вялікімі "мира сего". Ён добрасумленна запаўняў яе чыста чыноўніцкі змест. Іншая справа — адзін з багацейшых людзей Расіі, капітал якога ацэньваецца ў суму каля 3 мільярдаў долараў, і які мае сёння моцны ўплыў на палітычную зліту, і не толькі ў Расіі. Але Каратчэня быў прадстаўніком менавіта Беларусі, інтарэсы якой ён у меру сваіх магчымасцяў імкнуўся абараняць. Ды і многае змянілася за апошнія пяць гадоў у светапоглядзе былога першага сакратара правінцыйнага райкама. Але ягоны час мінуў, і на авансцэне СНД, як і ў ва ўсіх іншых сферах жыцця, пачынаюць асвойвацца "крутыя"...

Такім чынам, перспектывы СНД, якую ўжо не раз хавалі, сёння вымалёўваюцца ў зусім іншым ракурсе. Відавочна, што яе апаратам зацікавіліся т. зв. алігархі — тыя расійскія капіталістычныя фірмы, што маюць найбольшую вагу. Мэта іх таксама відавочная — стварыць для сябе пад крылом СНД эфектыўны і незалежны ад дзяржаўных уплываў механізм акцызна-тарыфна-мытных ільготаў. Не трэба, бадай што, скідваць з рахунку і тое, што большасць з кіраўнікоў краін-удзельніц усвядомілі ўрэшце, што альтэрнатывы гэтаму аб'яднанню ў жорсткім бізнесавым кантэксце свету для эканомікі постсавецкіх краін пакуль што няма. Хаця б у плане элементарнай узаемадапамогі. Усе спробы ліхім кавалерыйскім наскокам прарвацца на заходні рынак са сваімі прамысловымі тавамі скончыліся фіяска. Ёсць вялікія праблемы і для сыр'я. Правілы гульні фарміраваліся там не адно дзесяцігоддзе, і канкурэнтаў не любіць ніхто.

Таму пра перспектывы СНД загаварылі нават тыя з лідэраў СНД, хто раней выяўляў найбольш самастойную пазіцыю. Найперш — прэзідэнт Украіны Леанід Кучма, які, дарэчы, і вылучыў Беразоўскага, спаслаўшыся на тое, што СНД не Дзяржплан, а таму неабходна вылучаць разумных яго каардынатараў з ліку дзелавых людзей. "Мы гатовыя да будучага супрацоўніцтва, — заявіў ён, — і настолькі сур'ёзна, што ні ў кога не павінна ўзнікнуць сумненняў". Такая вось "сур'ёзнасць" Украіны на дадзеным этапе зусім невыпадковая, бо выяўляе найперш частковае змяненне яе стратэгічных прыярытэтаў. Гэта датычыць і іншых краін СНД, якія ўрэшце зразумелі, што шчыльнае стратэгічнае супрацоўніцтва з Захадам нямала каштуе. Жаданага дажджу інвестыцыяў адтуль не пайшло, ды і не магло пайсці, бо заходні бізнес, хутка зняўшы ў нас і ў нашых суседзяў "вяршкі", зразумеў непамерную цяжкапад'ёмнасць эканомік постсавецкіх краін.

Але, паўтоўрым, усё гэта ў меншай ступені датычыць Беларусі, дзе і прыватны бізнес так і не змог выйсці з зачаткавага стану, і ў нас, акрамя дзяржавы, няма каму "згуляць" з алігархамі. Прычым выключна па сваіх правілах, бо іншыя для нас непрымальныя і могуць проста выбіць з каляіны. Ды вось ці захочуць яны? Бо планы іхнія, мяркуючы па ўсім, вельмі адрозныя ад планаў кіруючай беларускай палітычнай зліты. Хутчэй наадварот, яны згодзяцца гуляць выключна па сваіх правілах, якія ўсё больш актыўна ўкараняюцца ў Расіі, а цяпер, як бачым, і ў СНД. І развіццё сённяшніх палітычных падзей у Расіі таму сведчанне. Асабліва пасля прыходу на пасаду расійскага прэм'ера Сяргея Кірыенкі, урад якога аналітыкі ад правых да левых ледзь не хорам называюць прачубайсаўскім, а значыць празаходнім. А якімі цёплымі былі адносіны ў нашага кіраўніцтва з Анатолем Барысавічам, вядома ўсім...

Улічваючы, у святле пэўных складанасцяў з Захадам, звышважнасць для Беларусі яе сённяшніх стасункаў са сваёй вялікай суседкай, прыход там да рычагоў улады яшчэ аднаго маладога, прычым, на гэты раз вельмі маладога рэфарматара, да таго ж з бліскучым камсамольскім мінулым, можа аказацца для нашай краіны сапраўды фатальным. Бо падобна на тое, што Сяргей Уладзіленавіч зусім не "временщик" — ён прыйшоў усур'ёз і надоўга і, вядома ж, не займацца дабрачыннасцю. Ён прыйшоў калі не адразу "даць волю" беднаму рускаму народу, то, прынамсі, праз два гады, пасля чарговых прэзідэнцкіх выбараў. Хутчэй за ўсё гэты мэтаімкнёны чалавек-камп'ютэр і ёсць той з "новых, якіх трэба вылучаць" (пра што зусім нядаўна гаварыў Беразоўскі), з прычыны непрымальнасці для вялікага бізнесу ў Расіі або "непраходнасці" нікога з той чацвёркі-пяцёркі найбольш папулярных расійскіх лідэраў.

Сёння такія довады могуць падацца некаму смешнымі і нават абсурднымі. Але відавочна, што Кірыенка-Ізраіцель у сілу сваіх здольнасцяў і маральных посткамсамольскіх характарыстык з'яўляецца ці не ідэальнай фігурай для тых колаў у Расіі, якія маюць доступ да ўладнага пірага. Пытанне толькі ў "праходнасці". Але яно вырашальнае! Схема гэтай самай "праходнасці" ўяўляецца нам не вельмі складанай. Кірыенку будуць "раскручваць" хутчэй за ўсё па адным з двух варыянтаў.

Для таго, каб перамагчы праз два гады на прэзідэнцкіх выбарах, неабходна стварыць маладому і "энергічнаму" палітыку імідж народнага збавіцеля. Прычым, збавіцеля-выратавальніка ад безвыходнай беднасці і несправядлівасці. Па першым варыянце, такі імідж будзе "раскручвацца" за некалькі месяцаў да выбараў, але для яго ажыццяўлення неабходная будзе нейкая часовая "нейтралізацыя" дзейнага прэзідэнта Расіі (яго, напрыклад, могуць "захварэць"), што ўяўляецца нам малаверагодным. Але ў тым выпадку малады і абаяльны прэм'ер становіцца па Канстытуцыі выконваючым абавязкі кіраўніка краіны і ўсе вялізныя сродкі на сваю кампанію (а тое, што яны будуць вялізнымі, няма сумненняў) ён пускае на вырашэнне набалелых сацыяльна-эканамічных праблем. Прынамсі, калі не на вырашэнне, то на бліскучую яго імітацыю.

Па другім, на нашу думку, больш рэальным і дзейсным, варыянце тыя ж сродкі Кірыенка атрымае ўжо праз год і эфектыўна і эфектна дасць ім ход. Вынікі не прымусяць сябе доўга чакаць. Будуць аднамомантна зліквідаваны ўсе запазычанасці па заработнай плаце і пенсіях. (А гэта ўрэшце, не такая ўжо і вялікая сума для сапраўдных расійскіх і заходніх таўстасумаў). Масы, вядома, бдуць моцна ўсцешаны і задаволены. І вось тут будзе задзейнічаны казырны ход. Мвладога прэм'ера за няўрымслівасць у "разбазарванні" дзяржаўных сродкаў з вялікім трэскам і скандалам рэпрэсуюць. "Рэпрэсіі" тыя будуць заключацца ў знятці з пасады з шумнай фармулёўкай. Лёгка і проста ў свядомасць простага народа будзе ўведзены вобраз народнага "благодетеля", які так многа паспеў зрабіць для людзей за такі кароткі час і атрымаў пакуты за сваю празмерную любоў да народа. Для ягонай раскруткі, вядома, будуць задзейнічаны практычна ўсе сродкі масавай інфармацыі па самых найноўшых заходніх тэхналогіях. Куды там Лебедзю ці Зюганаву? Ці трэба казаць, што падобны варыянт для беларускіх уладаў "смерці падобны", улічваючы, што "чубайсаўцы" ў любым варыянце з'яўляюцца іх непрымірымымі ворагамі. Надта ж разыходзяцца іх далёкія стратэгічныя планы.

Але падкрэслім, што нашы дапушчэнні — гэта ўсяго толькі гульнёвая містыфікацыя будучых палітычных падзей, як, зрэшты, і ўвогуле ўсялякая спроба палітычнага прагнозу. Як яно будзе на справе, ведае толькі адзін Бог. Ён урэшце і вырашыць лёс і Беларусі, і Расіі і іх надзвычай імпэтных кіраўнікоў, мала зважаючы на нашы меркаванні і пажаданні. І ўсё ж у інтарэсах любой дзяржавы — пралічваць, хаця б у аналітычна-гульнёвым плане, усялякія магчымыя палітычныя наступствы, нават тыя, якія на першы погляд здаюцца быццам бы абсурднымі і нерэальнымі. І рабіць засцерагальныя высновы, бо рэальнасць часам бывае больш смешнаю, чым самыя абсурдныя фантазіі.

Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ

БРАВА!

Са "Спадчынай" — у заўтра

Для студэнцкага творчага калектыву 15 гадоў — гэта ўзрост сталасці, які сведчыць пра ўкаранёнасць у плённы грунт традыцый, пра жывую сувязь з днём сённяшнім і — пра скіраванасць у заўтра. За свае 15 гадоў "Спадчына", застаючыся вучэбным калектывам Беларускага універсітэта культуры, набыла славу нацыянальнай інструментальнай капэлы, якая развівае сучаснае аркестравае і ансамблевай народнае выканальніцтва ў сувязі са спрадвечнымі традыцыямі. "Спадчына" — гэта своеасаблівая лабараторыя па асваенні старадаўняга беларускага інструментарыя, па стварэнні арыгінальнага музычнага рэпертуару... А ўзначальвае яе Альбіна Скорабагатчанка — мастацкі кіраўнік і дырыжор, дацэнт БУКа, добра знаёмая нашым чытачам паводле нядаўніх публікацый.

У Дзяржаўным маладзёжным тэатры эстрады сталіцы адбыўся юбілейны вечар народна-інструментальнай капэлы "Спадчына", які стаўся і святам для яе кіраўніцы, у чыім жыцці сёлетні год таксама знамянальны. Гэта было і свята для ўсіх студэнтаў і колішніх выхаванцаў, захопленых любоўю да народна-інструментальнай музыкі і апантаных імкненнем перадаць гэтую любоў новым слухачам ды будучым музыкам.

ШЛЯХІ

Уладзімір КОНАН

Беларуская нацыянальная ідэя: гістарычны аспект і сучасныя праблемы

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ ёсць духоўна-творчы аналаг гістарычнага быцця народа ў яго трох вымярэннях — мінуўшчыне, сучаснасці і будучыні. Кожны этнас, які выявіў свае творчыя магчымасці і сфармаваўся ў нацыю, увасабляе сваім быццём пэўную ідэю, альбо, кажучы тэалагічна, пэўную задуму Сусветнага тварца, якая рэалізуецца ў гістарычных дзеях народа і яго самабытнай культуры.

Ёсць па меншай меры тры грані выяўлення нацыянальнай ідэі народа: яго гістарычныя дзеі і геапалітычныя праекты, нацыянальны характар ва ўсіх яго супярэчнасцях, урэшце, самабытнасць яго культуры, уключаючы ў гэтае паняцце эканоміку, сацыяльна-палітычныя структуры, літаратуру ды іншыя віды мастацтва, філасофію, рэлігію, мараль і прававыя інстытуты. На тэарэтычным (розумаспасцігальным) узроўні нацыянальная ідэя выяўляецца ў культурна-гістарычным тыпе народа, яго нацыянальнай асабістасці; на штодзённа-эмпірычным узроўні — у нацыянальным менталітэце.

Праблема нацыянальнай ідэі, такім чынам, ахоплівае ўсе тры аспекты быцця народа — яго гісторыю, геапалітыку і культуру ў самым шырокім значэнні гэтага паняцця. Нацыянальную беларускую ідэю ў яе паўнаце можна было б раскрыць толькі ў фундаментальнай манаграфіі. У гэтым кароткім рэфераце абмяжуюся лаканічнымі тэзісамі.

Геапалітычныя і агульналюдскія аспекты гэтай праблемы раскрыты ў філасофіі, этналогіі, літаратуры і публіцыстыцы XX стагоддзя (У. Салаўёў, М. Данілеўскі, К. Ляонцьеў у Расіі, О. Шпенглер у Германіі, "Наша Ніва", перыядычны друк Беларускай Народнай Рэспублікі ў Беларусі, Ігнат Канчэўскі, Уладзімір Самойла і Адам Станкевіч разам з яго сябрамі па Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў Заходняй Беларусі). Можна вывесці агульную парадыгму гэтага універсальнага ўсведамлення нацыянальнай ідэі. Вось яна ў няпоўным вызначэнні.

Кожны гістарычны народ мае сваю ўласную задачу, сваю ідэю. Кожны народ, які выявіў гэтую ідэю ў гістарычных дзеях і ў самабытнай культуры, мае права на арганізацыю ў суверэнную нацыю і незалежную дзяржаву. Задача нацыянальнай дзяржавы — стварыць аптымальныя ўмовы для самарэалізацыі народа ў самабытнай мове і культуры ў цэлым, стварыць сваю непаўторную грань рэгіянальнай і універсальнай цывілізацыі. Агульналюдская культура рэалізуецца як сугучнасць, сімфонія нацыянальных і рэгіянальных культур. Аднатыпная агульналюдская культура, калі б яна была магчымая, аказалася б ні чым іншым, як разбурэннем духоўнай самабытнасці так званых "меншых" народаў псеўдамесіянскімі імперыямі іхніх "большых" братоў.

Сёння сістэматычна пакуль што даследавана руская, дакладней, расійская ідэя ў навукова-папулярнай кніжцы М. Бярдзяева "Русская идея" (Парыж, 1946). Яе варта грунтоўна ведаць беларускім палітыкам, каб дакладна вызначаць свае геапалітычныя і культурна-творчыя стратэгічныя інтарэсы. Прывяду тут толькі агульную характарыстыку "расійскасці" Бярдзяевым: "Рускі народ, — пісаў Бярдзяеў, — ёсць у найвышэйшай ступені палярызаваны народ, ён — сумяшчэнне супрацьлегласцяў (...). Рускі народ не ёсць ні чыста еўрапейскі, ні чыста азіяцкі народ. Расія — цэлая частка свету, вялізны Усход—Захад, яна злучае два светы. І заўсёды ў рускай душы змагаліся два пачаткі — усходні і заходні (...). Рускі народ не быў пераважна народам культуры ў першую чаргу, як народы Заходняй Еўропы, ён быў пераважна народам адкравенняў і натхненняў, ён не ведаў меры і лёгка ўпадаў у крайнасці (...). Два супрацьлеглыя пачаткі леглі ў аснову фармацыі рускай душы: прыродная, язычніцкая, дыянісійская стыхія і аскетычна-манашае праваслаўе. Можна адкрыць дзве палярныя ўласцівасці ў рускім народзе: дэспатызм, гіпертрафія дзяржавы і анархізм, вольнасць; жорсткасць, схільнасць да гвалту — і дабрыня, чалавечнасць і мяккасць; абрадавая вера ("обрядоверье") — і пошукі праўды; індывідуалізм, вострае ўсведамленне асабістасці — і безасабовы калектывізм; нацыяналізм, бахвальства — і універсалізм, усячалавечнасць; эсхаталагічна-месіянская рэлігійнасць — і вонкавая набожнасць; шуканне Бога — і ваяўнічая бязбожнасць; пакорлівасць — і нахабства, рабства — і бунт".

Сёння "Русская идея" М. Бярдзяева надзвычай папулярная ў асяроддзі расійскай эміграцкай інтэлігенцыі: там па радыё "Свабода", здаецца, ужо пяты год Барыс Парамонаў вядзе аднайменную філасофска-публіцыстычную праграму. На жаль, мала хто ведае прарока беларускага нацыянальнага Адраджэння, які за трыццаць пяць гадоў да выхаду ў свет "Русской идеи" Бярдзяева апублікаваў пад псеўданімам Ігнат Абдзіраловіч філасофскае эсэ "Адвечным шляхам: Даследзіны беларускага светапогляду" (Вільня, 1921). Гэта быў малады паэт Ігнат Канчэўскі, якога напаткаў трагічны лёс Максіма Багдановіча (памёр на 27-й вясне свайго жыцця ад сухотаў).

І. Канчэўскі на аснове філасофскага абагульнення духоўнага вопыту нашай літаратуры даволі дакладна вызначыў сутнасць беларускай ідэі. Ён пісаў: "Беларусь ад X веку да гэтай пары (маецца на ўвазе 1921 год. — **У. К.**) фактычна з'яўляецца полем змагання двух кірункаў еўрапейскай, пэўна — арыйскай культуры — заходняга і ўсходняга. Граніца абодвух уплываў, падзяляючы славянства на два станы, праходзіць праз Беларусь, Украіну і хаваецца ў балканскіх краях. Дзесяцігадовае ваганне сведчыць аб тым, што беларусы, як украінцы і балканскія славяне, не маглі шчыра прылучыцца ні да аднаго, ні да другога кірунку".

Паводле І. Канчэўскага, беларуская ментальнасць, альбо нашая нацыянальная ідэя — гэта адмаўленне крайніх, "месіянскіх" формаў усходняга "візантызму" (унітарнасць грамадска-палітычнага жыцця, нецярпімасць да іншадумання, канцэнтрацыя ўлады ў адных руках, абшчыннасць і слабае выяўленне асабістасці, татальны экспансіянізм) і заходняга індывідуалізму (бо ў ім прыхавана тэндэнцыя да захопу ў сваю зону ўплыву слабейшых народаў ды іх асіміляцыі), і сінтэз лепшых бакоў гэтых двух культурна-гістарычных тыпаў на аснове самабытных нацыянальных формаў грамадскага жыцця і культуры. Сутнасць яе — няспынная творчасць, непрыманне раз і назаўсёды вызначаных, аб'ектызаваных і дэгуманізаваных ідэй і прынцыпаў, накшталт "сацыялізму" альбо "капіталізму".

У гістарычным плане ўвасабленнем беларускай нацыянальнай ідэі былі выдатныя дзяржаўныя нацыянальна-культурныя і рэлігійныя дзеячы Беларусі. Полацкі князь Усяслаў Чарадзей быў не толькі вялікім князем і палкаводцам, але аб'ектыўна і прарокам: ён, верагодна, прадбачыў гістарычны лёс беларуска-крывіцкай дзяржавы, імкнуўся ваеннымі і дыпламатычнымі сродкамі забяспечыць яе незалежнасць і выгаднае геапалітычнае становішча — ключавыя пазіцыі на "шляху з варагаў у грэкі", што злучаў паўночную і цэнтральную Еўропу з Візантыяй, а праз яе — з цэнтрамі азіяцкай цывілізацыі. Яго прадаўжальнікам у гэтым плане быў канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега (1557—1633), які прадбачыў небяспеку станаўлення Расійскай захопніцкай імперыі і спрабаваў нейтралізаваць яе — спачатку смелым геапалітычным праектам стварэння супердзяржаўнай канфедэрацыі Масковіі-Расіі і Рэчы Паспалітай, палітычным ядром якой стала б Беларусь-Літва, а пазней — стварэннем "смуты" ў Расіі.

Яшчэ да канцлера Сапегі беларускі асветнік і славянскі першадрукар Францішак Скарына недзе ў сярэдзіне 1520-х гадоў, верагодна, паспрабаваў ажыццявіць сваю маскоўскую місію — пашырыць сваё вольнае кнігавыдавецтва на Маскоўскую дзяржаву і праз гэта забяспечыць прыярытэт старабеларускай мовы, а праз яе і ўсёй беларускай культуры ва ўсходнеславянскім рэгіёне. Няўдача гэтай місіі (спальванне "ератычных" кніг Скарыны і выгнанне першадрукара з Масквы) азначала, між іншым, нарастанне ідэалагічнай канфрантацыі паміж двума цэнтрамі аб'яднання ўсходнеславянскіх народаў — Масквой і Беларуссю-Літвой. Зусім верагодна, што калі б місія Ф. Скарыны, а пазней геапалітычны праект Льва Сапегі ўдаліся, калі б адбылася ў XVI—XVII стст. гэтая духоўная і палітычная сустрэчы Усходу і Захаду, то яна падрыхтавала б пазней павольную стыкоўку і пазітыўнае ўзаемадзеянне двух культурна-гістарычных тыпаў — расійскай Еўра-Азіі з Цэнтральнай і Усходняй Еўропай.

У духоўна-рэлігійным аспекце беларуская ідэя самабытна выявілася ў праектах сусветнай царкоўнай Уніі XV-XVI стст., якія часткова рэалізаваліся ў рэгіянальнай Брэсцкай Уніі 1596 года. Яна праіснавала каля двух з паловай стагоддзяў, стаўшы па сваёй сутнасці беларуска-сялянскай царквою, трэцяй духоўнай сілаю паміж нацыяналізаванымі ў XVII—XVIII стст. расійскім праваслаўем і польскім каталіцтвам. Яркімі асобамі, якія ўвасаблялі гэтую рэлігійную ідэю, былі мітрапаліты Іпат Пацей у 1599—1613 гг., Язэп Руцкі ў 1613—1637 гг. і полацкі архіепіскап Ісафат Кунцэвіч, які стаў ахвярай сваёй ідэі яднання цэркваў падчас віцебскага антыуніяцкага бунту ў 1623 годзе.

Прадаўжальнікамі дзяржаўна-палітычнай і духоўна-культурнай беларускай ідэі ў эпоху станаўлення беларускай нацыі (XIX — пачатак XX ст.) былі Кастусь Каліноўскі (1838—1864), беларускія народнікі Ігнат Грынявіцкі і выдаўцы падпольнага часопіса "Гоман" (1884), Беларуская Сацыялістычная Грамада (БСГ, 1903—1917), газеты "Наша Ніва" (1906—1915) і "Гоман" (1916—1918), беларуская класічная літаратура (Янка Купала, Цётка, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Алесь Гарун, Максім Гарэцкі і іх паслядоўнікі). Урэшце, дзеячы БНР паядналі духоўна-культурнае і дзяржаўна-палітычнае адраджэнне і ў 1917—1920 гг. часткова рэалізавалі беларускую нацыянальную ідэю. Як няўдача, падзел Беларусі паводле Рыжскага міру Расіі і Польшчы былі вынікам стратэгічнага і духоўнага праліку аб'яднанай Еўропы ў асобе Антанты: яна падтрымала менш развітыя нацыянальныя ідэі народаў Цэнтральнай Еўропы (этнічнай Літвы, Латвіі, Эстоніі і інш.), без усякага ўліку культурна-гістарычнай традыцыі і геапалітычных інтарэсаў дазволіла бальшавікам і прыхільнікам Вялікай Польшчы падзяліць Беларусь.

З гэтага часу пачаўся новы, драматычны шлях духоўнай барацьбы беларускай нацыянальнай эліты за адраджэнне Беларусі ў новых умовах — апошняга этапу распаду тэрытарыяльных імперый. Беларуская нацыянальная эліта ў БССР у гады беларусізацыі (1920-я гады) правільна разлічыла, што аднаўленне Расійскай імперыі ў вобліку СССР — з'ява часовая, несумяшчальная з гістарычным прагрэсам, вынікам якога стаў распад імперый, гэтых "вавілонскіх вежаў" Новай гісторыі. Але яны змагаліся за Беларусь і яе культуру ў гады часовага абнаўлення гэтай імперыі, а не яе заняпаду. У выніку наша эліта была знішчана, а рэшта яе падаўлена бальшавіцкім імперыялізмам з няведанай у гісторыі жорсткасцю і скрытасцю ад сусветнай інфарматыўнай прасторы. Аднак паўразбуранае гвалтоўнай індустрыялізацыяй і калектывізацыяй этнічнае ядро беларускай нацыі ў сярэдзіне XX ст. яшчэ захавалася: яно нараджала з сябе новую нацыянальную эліту, якая ў рэшце рэшт агульнымі намаганнямі з нацыянальнымі элітамі іншых народаў разбурыла гэтую апошнюю Вавілонскую Вежу.

Настаў час усеагульнага нацыянальнага адраджэння ў складаных умовах, калі аказалася разбураным ужо само этнічнае ядро нацыі. У такіх умовах узросшая колькасна нацыянальная эліта сама павінна хоць часткова кампенсаваць адсутнасць згуртаванага этнічнага ядра.

Сёння нацыянальнае адраджэнне ёсць гістарычнае прызначэнне ўсіх народаў, якім не наканавана знікнуць у "чорнай дзірцы" гісторыі. Для былых заваяваных альбо "добраахвотна" далучаных народаў-"саюзнікаў" (тэрмін, які прыдуманы яшчэ ў Рымскай імперыі для вызначэння мірных, часова небунтоўных калоній) нацыянальнае адраджэнне ёсць багадатная альтэрнатыва гістарычнай анігіляцыі. Але і для народаў-метраполій, для імперскіх нацый яно таксама ёсць пазітыўны варыянт вырашэння спрадвечнага пытання — быць альбо не быць.

Жанр кароткага рэферата не дазваляе мне аргументаваць гэтую, на мой погляд, відавочную ісціну. Напомню толькі, што стабільнасць нацыі забяспечваецца, па-першае, яе трывалым этнічным ядром і, па-другое, яе духоўна актыўнай і сацыяльна пасіянарнай элітай. У народаў, пазбаўленых паўнацэннай нацыянальнай дзяржаўнасці, духоўная эліта і этнічнае ядро (яно больш устойлівае толькі ў эпоху неглыбокай сацыяльнай мабільнасці і павярхоўнай уключанасці народа ў пануючую "дзяржаўную" культуру) разбураюцца шляхам планамернага расцярушвання на абшарах імперыі, эміграцыі і асабліва метадамі дэнацыяналізацыі. А на адваротным полюсе аналагічная дэстабілізацыя адбываецца ў асяроддзі метраполіі: актыўная частка насельніцтва і нацыянальная эліта самарассейваюцца на абшарах далучаных іншанацыянальных тэрыторый, эканамічныя і духоўныя сілы трацяцца на ўтрыманне імперыі (войска, дзяржаўны апарат, культуртрэгерства і інш.), адзіная нацыянальная мова распадаецца на каланіяльныя жаргоны, эканоміка і культура развіваюцца не інтэнсіўна і не ў глыбіню, а экстэнсіўна і павярхоўна. Іспанцы, англічане, французы своечасова пайшлі насустрач лёсу, дэманцiравалі свае імперыі. Германіі і Японіі "дапамаглі" іх паразы ў Другой сусветнай вайне. Палякам наогул пашэнціла: іхняя імперыя не адбылася. Сёння — чарга за Расіяй.

Што сёння трэба рабіць і куды ісці, калі наступіў драматычны час страты нацыянальных ідэалаў дэмаралізаванай псеўданароднай масы і адхілення нацыянальнай эліты ад палітычнай стратэгіі і дзяржаўнага кіравання? Адказ на гэтае пытанне тут магчымы толькі ў форме кароткіх тэзісаў.

1. Па-першае, не страчваць перспектыву нацыянальнай ідэі. Яна рэалізуецца ў скажонай форме нават тымі, хто сёння на чале нашай дзяржавы. Бо такі час, такі гістарычны кантэкст. Эпоха тэрытарыяльных, па сутнасці, напаўфеадальных імперыяў даўно мінула. Сёння магчыма толькі фінансавая імперыя. У нашай сітуацыі — гэта тады, калі расійскі рубель пераможа амерыканскі долар у сусветным маштабе. Варыянт цяжкі. Цягнік, як гаворыцца, даўно прайшоў. Варта было трансфармаваць сваю феадальную імперыю яшчэ ў 1920-я гады — па прыкладзе Англіі, Францыі ды іншых разумных дзяржаў.

2. З часоў Гегеля і самога Маркса захавалася філасофская прымаўка: Разумны ідзе насустрач свайму наканаванню, а неразумнага лёс валачэ да гэтай мэты. У XXI ст. для тэрытарыяльных імперый няма перспектывы: Расія пры наяўнасці разумнага дэмакратычнага кіраўніцтва магла б захаваць свае эканамічныя ды інфармацыйныя дамінанты на прасторы былой імперыі і былога СССР. З расійскай фінансавай імперыяй амерыканскага тыпу памірыліся б нават лідэры Чачні. З другога боку, у Расійскай Федэрацыі, куды хацелі б уцягнуць Беларусь расійскія палітыкі ад правых да левых (усе яны адносна Беларусі і Украіны ў той ці іншай меры банальныя чарнасоценцы), беларусаў чакае этна-культурная анігіляцыя, незайздросны лёс псеўдарускіх другога ці трэцяга гатунку, лёс хімернага этнасу, які гаворыць на жаргоне вялікай рускай мовы.

3. Гэтая аб'ектыўна аптымістычная перспектыва ажыццяўлення беларускай нацыянальнай ідэі зусім не азначае, што яно прыйдзе як манна нябесная. Нават пра Царства Нябеснае сказана, што яно пасля прарокаў "сілаю здабываецца". Тым больш — царства зямное. Неабходна духоўнае і грамадска-палітычнае змаганне за яго. Яўрзі пасля свайго расцярушання Рымскай імперыяй у I ст. н.э. змагаліся за сваю нацыянальную ідэю амаль два тысячагоддзі. Беларусы ваююць за сваю пакуль што каля двух стагоддзяў. У гэтай барацьбе ёсць патрэба ў тактычных кампрамісах, асабліва ў сферах эканомікі і палітыкі. Але немагчымы кампрамісы па крайняй меры ў сферы духоўных каштоўнасцяў — нашых трох святынях: роднай мовы і сваёй самабытнай культуры, нацыянальнай сімволікі, суверэннай дзяржавы. Страцім іх — загубім усё іншае. Барацьба за іх павінна быць няспыннай, хоць бы абазначанай сімвалічна. Тут ёсць евангельскі архетып. Калі слугі стараяўрэйскіх першасвятароў бралі Хрыста, каб забіць яго, апосталы не ведалі, што рабіць. Але "Сымон Пётр, дастаўшы меч, ударыў першасвятаровага раба, і адсек яму правае вуха" (Ян 18:10).

Зразумела, гэта сімвалічнае "вуха". Маецца на ўвазе вайна духоўная і меч духоўны.

ЛіМ ЧАСАПІС

А песень — больш за 200

Вечарына, прысвечаная 60-м угодкам з дня нараджэння паэта-песенніка Уладзіміра Карызны, прайшла ў літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. Адкрыў яе супрацоўнік музея Іван Курбека. Юбіляра павіншавалі Мікола Аўрамчык, Уладзімір Буднік, навучэнцы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа. Віктар Гардзей прачытаў верш, прысвечаны У. Карызну. Дырэктар дома-музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская ўручыла юбіляру коласаўскі медаль і кнігу песняра.

Напрыканцы вечарыны слова ўзяў сам юбіляр.

Музыку на вершы У. Карызны пісалі Ю. Семяняка, Л. Захлеўны, У. Буднік, І. Лучанок і іншыя кампазітары. Песні на словы юбіляра выконваюць В. Пархоменка, Т. Раеўская, Я. Навуменка, В. Дайнека, ансамбль "Песняры", ансамбль "Верасы". А песень у паэта — каля 240. На вечарыне прагучалі "Ліўні светлыя" і "Дні прыгожыя" ў выкананні кампазітара У. Будніка.

Алена ДУБОВІК,
навучэнка Мінскага педкаледжа
Фота У. ГУЗОЎСКАГА

"Раса нябёсаў на зямлі тутэйшай"

Да 200-х угодкаў Адама Міцкевіча выйшаў у свет анталагічны зборнік паэзіі XIX ст. "Раса нябёсаў на зямлі тутэйшай". У яго ўвайшлі выбраныя вершы больш за семдзесят аўтараў, якія сваім паходжаннем і творчасцю былі звязаны з Беларуссю. Сярод іх — вялікі наваградчанін Адам Міцкевіч і вясковы лірнік Уладзіслаў Сыракомля, Ян Чачот і Ян Баршчэўскі, Францішак Багушэвіч і Янка Лучына, Эдвард Жалігоўскі і Вінцэсь Каратынскі, ЯН, Ігнат, Аляксандр і Міхал Ходзькі, а таксама амаль забытыя і невядомыя (не толькі беларускаму) чытачу Ксавэры Эдвард Вайніловіч, Ян Дварэцкі, А. Карловіч, Г. Клімашэўскі, Раймунд, Юзаф, Юліян Корсакі, Ігнат Кулакоўскі, Каміла Нарбут, Ігнат Шыдлоўскі і іншыя.

"Беларуская польскамоўная паэзія XIX стагоддзя — гэта паэзія надзвычайнай цеплыні і спагады, цнатлівасці і чысціні, паэзія самапазнання нашых продкаў, без якое няма гістарычнай гарантыі нашага самапазнання", — піша ў прадмове да зборніка яго ўкладальнік Уладзімір Мархель.

Тэксты пададзены на мове арыгінала (па-польску) і ў перакладзе на беларускую мову. Зборнік можна выкарыстоўваць не толькі як змястоўнае чытанне для душы, але як дапаможнік пры вывучэнні польскай і беларускай моў і як даведнік па гісторыі беларускай і польскай паэзіі XIX ст.

Над перакладамі працавалі Пятро Бітэль, Максім Лужанін, Уладзімір Мархель, Рыгор Барадулін, Уладзімір Паўлаў, Віктар Шніп, Іван Чыгрын, Кастусь Цвірка і інш.

В. СТАНКЕВІЧ

СПАДЧЫНА

Талент, які не адбыўся...

Маладой беларускай прозе 20-х гг. уласцівы стылявое багацце і жанравая разнастайнасць, абумоўленыя прыхільнасцю пісьменнікаў да пэўных мастацкіх прынцыпаў. Адны аўтары захапляліся рэвалюцыйнай рамантыкай, арнаменталізмам, другія арыентаваліся на назапашанае, традыцыйнае.

Эстэтыка "Маладняка" аказала ўплыў на першыя творы Васіля Каваля. Так, апавяданне "Як вясну гукалі" можна назваць тыпова маладнякоўскім, паколькі змены ў прыродзе, традыцыйныя абрады разглядаюцца мастаком з пункту гледжання сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў. Аналагічныя пераасэнсаванні, спробы стылізацыі ёсць і ў апавяданнях "Буй-Вецер", "Пра кветку "брат-сястра", "Легенда пра песню". Больш важны зварот да фальклорных матываў, відавочная схільнасць аўтара да традыцыйных рашэнняў, імкненне выкарыстаць вопыт таленавітых рускіх пісьменнікаў, хоць і на фармальна-стылічным узроўні.

Ва ўзгаданых апавяданнях зборніка "Як вясну гукалі" мала акрэслена творчая індывідуальнасць В. Каваля. Адзін толькі твор "Сяльчане" ўтрымлівае адзнакі не толькі маладнякізму (неад'емны, напрыклад, вобраз радасці), а і спробы мастацкага ўвасаблення беларускай вёскі. Адразу мяняецца стыль апавядання, калі аўтар піша пра ўклад жыцця Чмарава, знаёміць з жыхарамі вёскі. Пісьменніка зачароўваюць народныя песні, хараство наваколля. "Поле, як мора. Зялёныя і шырокія прабягаюць хвалі з аднае паласы на другую. Пяшчотна гладзіць ласкава-ціхі ветрык з поўдня галоўкі збожжа. А яно рознымі колерамі гарыць, да пояса кланяецца-хістаецца ў бакі..." Але галоўнае: аўтар паказвае духоўную прыгажосць селяніна праз падзейнае выяўленне і ўзнаўленне асаблівасцей унутранага жыцця. Ствараецца аб'ектыўны партрэт героя-гаспадара, які сэнс свайго жыцця бачыць у руплівай працы. Аўтар не хавае сваіх адносін да вёскі і да селяніна ў прыватнасці, ён не падзяляе поглядаў некаторых тагачасных ідэолагаў, што вёска — гэта "недарэчная штука" і "патрэбна яна хіба што толькі дзеля змычкі" з горадам (Крапіва. Апавяданні. Менск, 1926. С. 49).

У апавяданнях зборніка "На загонах" (1928) В. Каваль паглыбляе падзейны аналіз, больш увагі аддае самараскрыццю герояў. Дзякуючы гэтаму вобразы становяцца больш матываваны ідэйна, набываюць вялікі гнасеалагічны патэнцыял. Усе вобразна-выяўленчыя сродкі апавядання "На загонах" падпарадкаваны паказу сутнасці селяніна, яго светапогляду, маральных прынцыпаў, мастак узнімаецца да тыпізацыі.

Шматпакутны беларускі селянін бачыцца ў вобразах лугінаўскіх мужыкоў і ў вобразе Максіма Холада, які ў роздуме перад смерцю "шукаў прыгожага, квяцістага ў сваім жыцці: перабіраў часы дзяцінства, маладосці — і не знаходзіў", бо, акрамя цяжкай працы, мала што мог успомніць. У працы ён знаходзіў радасць, праца да знямогі заглушала боль. Максім за свой век бачыў многа гора, але, нягледзячы на ўсё, застаўся чалавекам з цвёрдымі перакананнямі, са сваім разуменнем дабра і зла. Менавіта спрадвечныя ўяўленні штурхаюць галоўнага героя на рашучы крок: ён сам сабе выносіць прысуд. Апісанне прыняцця Максімам рашэння пазначана вялікім мастацкім майстэрствам, пісьменнік удала выкарыстаў прыём псіхалагічнага паралелізму.

Яркім, дасканалым у мастацкіх адносінах з'яўляецца апавяданне "Дзед Піліп", якое, на жаль, не трапіла ў зборнік 1959 года. Талент "паэтычнага пісьменніка" раскрыўся ў гэтым творы найбольш поўна і шматгранна. Па сваёй ідэйнай змястоўнасці, выразнасці дэталей прадметнага выяўлення, кампазіцыйнай завершанасці вобраз дзеда Піліпа можа стаяць побач з лепшымі вобразамі "Новай зямлі" Я. Коласа.

З этнаграфічнай дакладнасцю В. Каваль паказвае ўмовы жыцця большасці сялян, прычым пазбягае сацыяльна-класавых акцэнтаў і матывацый. Для пісьменніка яны з'яўляюцца элементамі побыту, адлюстраваннем беднасці матэрыяльнай, аднак яна, паводле мастака, не заўсёды спрыяе беднасці духоўнай. Назіраецца своеасаблівы кантраст нават паміж знешнасцю галоўнага героя ("Дзедава галава звесілася з печы. Кучмою панавіслі чорныя ўскудлачаныя валасы з кастрою і пылам. Цярэбіць зусім рэдкую абшчыпаную сівую барану...") і яго багатым духоўным светам.

Для стварэння лагічна завершанага вобраза В. Каваль выкарыстаў пераважна падзейны псіхалагічны аналіз, што дазволіла паказаць з розных бакоў галоўнага героя. Так, напрыклад, ён руплівы гаспадар, шчыры працаўнік. ("У самае лета, у гарачыню, дзед любіць хадзіць на поле. Апіраючыся на палку, ідзе па дарозе. Бабы жнуць, блішчаць сярпы, ціханька шуміць жыта. Стане на дарозе, прыставіць далонь к вачам ад сонца і паглядае. І зараз жа праходзіць усё яго жыццё... Пачуецца жніўная песня — ускалыхнецца дзедава старое бяскрылае сэрца і яшчэ больш захочацца жыць"). Па адносінах да праўнука Грышкі, да Гнядога відаць, што дзед вельмі чулы, спагадлівы чалавек. Ад прыроды надзелены ён разнастайнымі талентамі. Заварожваюць дзедавы казкі, бо "ў казкі дзед укладаў усю душу". Вабіць задушэўнасцю гранне на дудках. "І сапраўды, дудкі жывуць пад пальцамі дзеда. Ён ведае ўсе старасвецкія скокі і песні, ён сыграе прыгон і жніво. Вочы становяцца светлымі, радаснымі, крывыя чорныя пальцы жывуць. Гукі родзяцца чыстымі, звонкімі, мілагучнымі, гатовымі абняць і расказаць нейкую тайну".

Ідэйнай пераканальнасці спрыяе індывідуалізаваная мова героя, а таксама вельмі ўдалая кампазіцыя самога вобраза. Пісьменнік ідзе ад паасобных рыс характару героя, некаторых звычак, здольнасцей да паказу рашучага дзеяння, учынку як праяўлення сутнасці асобы.

Вобраз дзеда Піліпа, як урэшце і вобразы сялян з іншых апавяданняў В. Каваля, цікавыя сваім ідэйным зместам. Пісьменнік імкнуўся стварыць пазначаны рэалізмам вобраз беларускага селяніна, адлюстраваць яго тыповыя якасці. І гэта яму несумненна ўдалося. Перад чытачом паўстае працавіты, спагадлівы, багаты духоўна, таленавіты чалавек. Яму ўласцівы тыя рысы, якія сучасныя даследчыкі адносяць да асаблівасцей беларускага менталітэту (успрыманне зямлі як сапраўднай маці, адушаўленне прыроды, "каляндарны модус" мыслення і інш.).

КНІГАРНЯ

Поўня — яна і ў Канадзе поўня

Вось і для мяне настала часіна, калі не магу паехаць у вёску, у якой пражыў адзінаццаць гадоў, скончыў сярэднюю школу, куды наведваўся — часта, пры кожнай, як кажуць, магчымасці. Гады ж ішлі, турботаў большала і чамусьці думалася — яшчэ столькі часу наперадзе. І памыліўся, як у рэшце рэшт памыляюцца ўсе, хто думае, што бацькі вечныя. Мне іх, састарэлых, летась давялося забраць у Мінск. Нядаўна ж бацькі не стала... Вось цяпер і паехаць няма да каго. Бо вёска гэтая для мяне і родная, і няродная. Нарадзіўся ж у Слуцкім раёне, а яна — у Капыльскім. Сваякоў у ёй няма. Думалася...

З такім не вельмі радасным і далёка не аптымістычным настроем узяўся перачытваць кнігу паэзіі Леаніда Яўменава "Існасць". Даўно збіраўся прарэцэнзаваць яе, ды неяк не выпадала. Аднак, трымаючы яе ў руках каторы раз, зразумеў, чаму так атрымалася. Вершы Л. Яўменава, канечне ж, вартыя ўвагі, але мая душа пакуль не гатова была належным чынам успрыняць іх. Не хапала адпаведнага настрою, а ён пры сустрэчы з паэзіяй вельмі важны. А калі гэты настрой з'явіўся, дык творы адразу "загаварылі" найперш з раздзела "Магільнянскія вершы" (кніга і складаецца з падобных завершаных цыклаў — "Манрэальскія вершы", "Парыжскія вершы", "Каралішчавіцкія вершы", "Маскоўскія вершы", "Актэбельскія вершы", "Іспанскія вершы", "Гатавіцкія вершы" і нарэшце "Мінскія вершы", у чым, між іншым, адчуваецца ўдалая кампазіцыйная пабудова яе, а ў выніку лірычны герой робіць свайго роду падарожжа ў часе і адлегласці, запыняючыся там, дзе ён жыў, жыве, і там, дзе давялося некалі пабываць, а ўсе ўражанні, як бы зліваючыся, і даюць мажлівасць успрыняць свет і яго вачыма, і яго сэрцам, і яго душой. Душа ж найбольш чутная, душа не можа маніць...).

У "Магільняцкіх вершах" — асабліва моцная паяднанасць з прыродай, з наваколлем, з тым светам, з якім пераважная большасць нас, сённяшніх гараджан так званага першага пакалення, былі звязаны з маленства. І, зразумела, успрымалі яго як нешта звычайнае, пастаяннае, а з-за гэтага і не надавалі яму асаблівага значэння. Думалася, пра што я гаварыў вышэй, падобная лучнасць ніколі не парушыцца. Цяпер жа застаецца задавальняцца малым — спатканнямі з прыродай, вёскай падчас наведвання лецішча. А калі яго няма, дык адзінае душэўнае ўратаванне і заспакаенне — у такіх вершах, як у Л. Яўменава.

Можа падацца, што ў іх нічога новага, нават назвы традыцыйныя — "Родны кут", "Курганы", "Над безыменнай магілай", "Дыхае ноч", "Спрадвечнае"... Ды падобнае ўспрыманне — падманлівае, бо паэзія Л. Яўменава, пры ўсёй яе філасафічнасці, грамадзянскай напоўненасці і занепакоенасці (відаць, сказваецца і тое, што Леанід Фёдаравіч — прафесійны вучоны-філосаф, член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі) — гэта і паэзія пачуцця, настраёвасці, а ў яго лірычных вершах гэта пераважае, таму і кладуцца яны так хораша на душу, пранікаючы ў патаемныя сховы яе, калі карціць адчуць, перажыць акурат тое, што "рухала" і паэтам, калі ён браўся за пяро.

А калі становішся нібыта двайніком яго, дык "вочы" лірычнага героя — і твае "вочы", яго бачанне свету — і тваё бачанне:

Бы ў казцы дзіўнай,
Срэбным пухам —
Імхоў калматых кажухі.
Наўкол яліны, бы квахтухі,
Выседжваюць баравікі.

. . . . . .

І ўсё тут — шолахі ігліцы.
Як шорахі сівых вякоў.
Вятры, і людзі, і крыніцы —
Гамоніць моваю бацькоў.

Назва ж верша простая, надзіва традыцыйная — "Родны кут". Ды не ў назве справа, а ў напоўненасці радка, у свежасці аўтарскага бачання і светаўспрымання, і ў здатнасці быць ПАЭТАМ не столькі па ўменні авалодаць законамі вершаскладання, колькі ў душы:

Дыхае ноч
Верасамі і рутаю.
Ціша няўсцяж ля ракі.
Коні у мораку
Бразгаюць путамі,
Гаснуць сяла аганькі.

І сапраўды, гэтае "дыханне" так асязальна відавочна зусім не таму, што верш называецца "Дыхае ноч". "Дыханнем... ночы, наваколля, прыроды прасякнуты кожны радок. І што важна, Л. Яўменаў піша так, што лёгка "пракласці масток" ад твора да твора. Як і ў гэтым выпадку. Спачатку "Дыхае ноч", а праз верш — "Нараджэнне паэта". Нараджэнне з успрымання ўсяго гэтага хараства, той знаёмай зямной прыгажосці, якая кожнаму чалавеку, новаму пакаленню бачыцца па-свойму, а таму па-ранейшаму вабіць, а прываблівае нараджае жаданне выказацца так, як іншыя дагэтуль не гаварылі:

Ў цемры горла дзяруць драчы,
Ў лузе фыркаюць сонныя коні —
Я накрыюся небам начы,
Уладкую пад голаў поўню.

Пачуццё радзімы не пакідае Л. Яўменава і ў вершах, напісаных далёка ад яе. Але,

Вобразная сістэма апавяданняў "Сяляне", "На загонах", "Дзед Піліп" утрымлівае канцэптуальныя асаблівасці. У адрозненне ад многіх маладнякоўцаў, якія пайшлі па шляху сцвярджэння рэвалюцыйнай рамантыкі і адмаўлення нібыта патрыярхальнага сялянскага ўкладу жыцця, В. Каваль імкнецца да традыцыйна паэтычнай гаворкі "пра селяніна". Ён даводзіць, што селянін не толькі добры працаўнік і гаспадар, але і яшчэ цікавы як чалавек. Менавіта такая праблемная завостранасць і зварот да назапашанага беларускімі і рускімі мастакамі слова ў галіне стылявых рашэнняў былі арганічныя таленту пісьменніка.

Сёння можна толькі здагадвацца, пра якія таямніцы душы беларускага селяніна расказаў бы яшчэ В. Каваль у сваіх творах. На жаль, літаральна з 1927 года мяняецца тэматыка яго апавяданняў, гвалтам уводзяцца некаторыя акцэнты, паколькі залішне актыўны ўдзел у лёсе тагачаснай літаратуры прынялі "сацыяльныя інстытуты". Шматлікія абвінавачванні ў "ідэалістычных поглядах" садзейнічалі спрашчэння вобразнай сістэмы, паяўленню дэкларатыўнасці і дыдактыкі. Для ўзмацнення сацыяльных матываў замест галоўнага героя селяніна, усё жыццё якога прайшло ў вёсцы, уводзіцца герой, спрадвечныя погляды якога на сялянскі побыт змяніліся пад уплывам рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Ранейшая паэтызацыя вёскі, захопленасць духоўнай прыгажосцю селяніна паступова знікаюць. Пісьменнік вымушаны аддаць перавагу "новым людзям" (Алісей Сімчанок, "Ноч"), чалавеку ў скуранай куртцы (Сімак, "Ліпы"), адлюстроўваць слаба абгрунтаваныя светапоглядныя перарыентацыі, што адбываюцца нават са старымі людзьмі.

Назіраецца адыход ад першапачатковай трактоўкі жаночых вобразаў. У адпаведнасці з патрабаваннямі часу В. Каваль узнімае пытанні раўнапраўя жанчыны і мужчыны, разглядае праблему новай ролі жанчыны ў грамадскім жыцці. А для паказу хуткіх змен у поглядах сваіх гераінь выкарыстоўвае дастаткова распаўсюджаны ў прозе 20-х гг. сюжэтны ход: у вёску прыязджае гарадская жанчына, праводзіць гутаркі, знаёміць з новымі кнігамі. Пад яе ўплывам малаадукаваныя сялянкі амаль адразу ўключаюцца ў грамадскую працу, устанаўліваюць новы тып узаемаадносін у сям'і. Па такой схеме, напрыклад, разгортваюцца падзеі ў апавяданнях "За доляю" Каваля і "Гануля" М. Зарэцкага. Абодва пісьменнікі зрабілі дамінантнай ідэю, якая ў сваю чаргу без належнага мастацкага ўвасаблення прыняла выгляд малапераканаўчага тэзіса.

Больш плённым, на нашу думку, быў зварот пісьменніка да лірычнай прозы. Пра тонкі мастакоўскі зрок, што дапамагае знайсці характэрнае, здавалася б, у самых звычайных рэчах і падабраць выключна ўдалыя аналогіі, пра ўменне псіхалагічна дакладна паказаць складаныя рухі душы сведчаць вершы ў прозе "Жыццё і сонца" і апавяданне "Нянавісць" (1928). У гэтых творах выразна акрэслены асаблівасці светаўспрымання аўтара, які, нягледзячы на ўсе змены ў душы, застаецца назаўсёды селянінам, што бязмерна любіць зямлю-карміцельку, атаясамліваючы яе з жанчынай, з маці, і не вельмі любіць горад, бо, паводле Каваля, "горад грыміць жалезам".

Разам са сваім героем-селянінам В. Каваль спрабуе разабрацца ў навацыях, пераўтварэннях. "А вось — не разумею я, за што людзі біліся? Ты гаворыш, што за рэвалюцыю. А хто яна такая?.. Прыйшла яна — ходырам усё захадзіла, свет перавярнуўся, а я мала што разумею. Раўнапраўе, знацца, прыйшло, і завуць мяне цяпер дзе-небудзь не проста, а таварыш Карней Карпячонак, а мне з гэтага мала карысці..." Многае з'яўляецца незразумелым для герояў і ў рэвалюцыйных падзеях, і ў арганізацыі калгасаў. Аднак калі некаторыя асаблівасці ўспрымання сялянамі рэвалюцыі можна было паказаць, то пра ўяўнасць пераваг калгаснай гаспадаркі пісьменнік нават не мог намякнуць. У канцы 20-х пачатку 30-х гг. ад мастака патрабавалася толькі ідэалізацыя "новай" вёскі, сумненні ж у правільнасці змен былі недапушчальныя. Такая першапачатковая зададзенасць вяла да страт у вобразнай сістэме, да парушэння логікі развіцця. Таму нежыццёвымі выглядаюць героі апавяданняў "Ілька", "Дзень палымнее", "Нянавісць" (1935), бо цалкам падпарадкаваны загадзя распрацаванай схеме.

Васіль Каваль вымушаны быў зрабіць крок назад, адступіць ад прынцыпаў, якімі ён кіраваўся напачатку. У выніку беларуская літаратура страціла таленавітага мастака, паэтычнага празаіка, які паказаў чалавечую годнасць, духоўнае багацце, адоранасць свайго народа.

М. ЧАЕЎСКАЯ

што характэрна, паэт не клянецца ў любові да яе, не выкарыстоўвае прыём супастаўлення таго, што ёсць у іх і што ў нас, хоць цалкам пазбегнуць гэтага яму і не ўдалося. Любоў да Беларусі праяўляецца ў іншым, як на маю думку, больш істотным. Проста паэтычны малюнак убірае ў сябе тыя рэаліі, якія знаёмы здаўна, бо яны — часцінка ўражанняў, пачэрпнутых на роднай зямлі:

Паўзуць авечкамі аблокі
Адкуль няведама й куды,
А сонца, бы ў гарах далёкіх,
Чабан руплівы і руды.

Гэта з верша "Недзе па-над Грэнландыяй" з цыкла "Манрэальскія вершы", а вось адзін з "парыжскіх твораў" — "Зялёны сум". Калі б не геаграфічная прывязка, дык лёгка падумаць, што гаворка ідзе пра беларускія краявіды:

У Нарманды пахне сенам,
У Нарманды сенакос.
Годзе ў хаце тырчаць паленам,
Варушыць папяровы стос...

Праўда, адначасова відавочна і іншае: вершы "Зялёны сум" з той невялікай колькасці твораў, у якіх якраз і супастаўляюцца "два лады жыцця" а ў выніку з'явілася тое, што параўнальна нядаўна было абавязковым атрыбутам паэзіі:

Не, іначай усё тут,
Іначай:
Пераспелы зялёны сум
Цягне нудна
Задыханай клячай
Воз нялёгкіх пачуццяў і дум.

Паступова малюнак "таго свету" атрымлівае далейшае развіццё:

Гэта жытка, відаць, не павідла:
Пан, падаткі,
Даўгі на гарбе...
Асядлаўшы жалезнае быдла,
Кожны б'ецца тут
Сам па сабе.

А каб верш прагучаў — сцішана-лірычна, усхвалявана-душэўна, хапіла б той першай страфы і заключнай:

У Нарманды сенам пахне,
У Нарманды сенакос,
А па Міншчыне сэрца чахне,
Сумна гэтак
І скрушна да слёз.

"Існасць", вядома, не абмяжоўваецца згаданай тэмай. Са старонак кнігі паўстае наша сённяшняе жыццё ва ўсёй яго складанасці і шматграннасці. Лірычны герой паэта неабыякава ставіцца да змен, што адбываюцца ў сучасным грамадстве, ён актыўны ў адстойванні ўласнай пазіцыі, дзейсны ў яе сцвярджэнні. Магчыма, ён у нечым і памыляецца, але ў чым нельга яго абвінаваціць, дык гэта ў няшчырасці. А пазбавіць права на сваю думку, на сваё светаўспрыманне і светаразуменне, значыць пазбавіць яго і права быць індывідуальнасцю. Індывідуальнасць жа, калі падыходзіць да гэтага паняцця аб'ектыўна, улічваючы розныя нюансы, дык гэта і стан душы, а ў кожнага ж душа — свая. А калі да ўсяго табой пражыта шмат, дык гэта права — быць самім сабой — пераўтвараецца ў правіла.

Уяўленне аб творчых магчымасцях Л. Яўменава дапаўняюць яго пераклады паэтаў Францыі, франкамоўнай паэзіі Канады, творцаў са Злучаных Штатаў Амерыкі. Прытым зробленыя з арыгіналаў, бо Л. Яўменаў добра ведае французскую і англійскую мовы. Чаго нельга сказаць пра аўтара гэтых радкоў, пазнанні якога ў замежнай мове (як і ў пераважнай большасці з нас, грэшных) абмяжоўваюцца толькі "веданнем" яе ў аб'ёме універсітэта. Таму гаварыць аб вартасцях і недахопах перакладаў як быццам і не выпадае. Але ж ёсць той падыход, які ў дадзеным выпадку спрацоўвае бездакорна. Застаецца паспрабаваць высветліць, наколькі ў перакладзе ўсё натуральна, як кладзецца яно ў душу.

Не бяруся сцвярджаць наконт іншых твораў і іншых аўтараў, але верш "Абвіты святлом поўні" канадскага паэта Ражэ Брыяна атрымаўся надзіва "беларускім":

Над поўняй, нібы на світанні,
Я чую цішы цяжкі сум,
Душа, бы восень, — у тумане,
Бо выпіў лішку горкіх дум.

А поўня аднолькавая — і на Беларусі, і ў Канадзе. І яе лёгка і проста ўзяць і пакласці пад голаў. Безумоўна, калі ты ПАЭТ. А гэта і сцвердзіў сваёй кнігай "Існасць" Леанід Яўменаў.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Андрэй ФЕДАРЭНКА: "...Пасля прыязных, добрых слоў — пішацца лягчэй і лепш..."

У літаратуру Андрэй Федарэнка ўварваўся імкліва. Крытыка даволі прыязна паставілася да яго твораў, што ўжо само па сабе красамоўна сведчыць пра талент пісьменніка. Адным з крытыкаў ён нават быў названы "класікам" беларускай літаратуры. Як адчувае сябе малады класік не толькі ў літаратуры, але і ў жыцці, я і паспрабавала высветліць у час гутаркі...

— Андрэй Міхайлавіч, пачытаўшы некаторыя вашы творы і вытрымкі з інтэрв'ю, складваецца ўражанне, што стану вашай душы найбольш адпавядаюць словы з верша маладой паэткі Таццяны Барысюк:

Я — гэта сонмішча катаклізмаў,
што ў вар'яцкім натоўпе
рэжа свае вены...
Я — трапяткая адчайная знічка,
якая марыць стаць галактыкай,
але ўсе высілкі марныя...
Я — тая спакусная бязгрэшнасць,
якая ва ўсяленскім граху
адчувае сябе закамплексавана...
Дэкаданс і дэпрэсія...
Апакаліпсіс і расчараванне.
Самота і безвыходнасць...

Ці так гэта?

— Гэта не так. Уражанне пра нібыта "дэпрэсіі і безвыходнасці" ў маёй душы, а тым больш у творчасці (за выключэннем хіба што апавядання "Цверазілаўка"), можа ўзнікнуць толькі тады, калі чытаць, паводле вашых жа, Рая, слоў, адно **некаторыя** мае творы. Калі б гэтыя творы выйшлі пад адной вокладкай, тады, упэўнены, і ўражанне памянялася б.

— Многія крытыкі хваляць вашы творы, называючы вас "апошнім празаікам вёскі"... Дык вось мне яшчэ спадабалася выказванне Вольгі Куртаніч, якое мае сэнс прывесці цалкам: "... Праз пэўны час мы знікнем і знікне гэтая рэчаіснасць, народзіцца новая бунтарнасць, рэвалюцыйнасць, з'явяцца новыя глобусы, удзячныя глобусам папярэднім — тым, хто даў штуршок для наватворчасці, штуршок свабодзе духу. А федарэнкі атрымаюць кляймо, радзімую пляму: "класік".

Як вы ставіцеся да гэтага?

— Чаго толькі пра мяне не пісалі і не казалі... Добра, што хапіла розуму верыць свайму густу і старацца ісці сваёй дарогаю. Але адно магу сцвярджаць з пэўнасцю: пасля прыязных, добрых слоў — справядлівыя яны ці не — пішацца лягчэй і лепш; пасля любой, хоць 1000 разоў справядлівай крытыкі заўсёды пішацца горш. Ведаю, што гэтае сцвярджэнне спрэчнае, і ўсё ж для сябе вызначыў цвёрда: крытыка ў белетрыстыцы нікому не прыносіла і не прынясе карысці. Трэба або хваліць, калі спадабалася, або маўчаць, калі здаецца, што твор слабы.

— Неяк аднойчы вы зрабілі рэверанс у бок "Вялікай рускай класікі", хаця ў той жа час разумееце, што "мы найлепш выйгралі б — і ў сваіх вачах, і ў вачах народаў, да якіх стукаемся, — калі б менш гаравалі аб тым, чаго ў нас няма, а больш радаваліся таму, што ў нас ёсць". Назавіце творы, якія, павашаму, уваходзяць у Вялікую беларускую класіку, калі такая, на вашу думку, існуе...

— З беларускай класікай сапраўды нейкае унікальнае становішча. Гэта пацвярджае і нядаўняя дыскусія на старонках "ЛіМа" (і не толькі "ЛіМа") пасля артыкула С. Дубаўца. Я звярнуў увагу на адну акалічнасць — за рэдкім выключэннем практычна ўсе, хто ў той дыскусіі ўдзельнічаў, згодны, што беларускай класіцы трэба **рэвізія**. Рознагалоссі былі ў іншым — дзе б знайсці тых аб'ектыўных, непадкупных рэвізораў, "шчырых а мудрых гісторыкаў"?..

— Неяк вы ўзгадалі ідэалы ад літаратуры, іх тры, фотаздымкі якіх вісяць у вас над пісьмовым сталом... Але не назвалі іх імёны... Вельмі ўжо карціць запытацца: хто гэта?

— Цяпер у мяне над сталом абразок Жыровіцкай маці Божай, падараваны Алегам Бембелем. Некалі сапраўды віселі фотаздымкі Талстога, Чэхава і Караткевіча, але калі рабілі ў кватэры рамонт, я іх некуды схаваў і не магу знайсці.

— Андрэй Міхайлавіч, аповесць "Такое кароткае лета" мне падалася ў некаторай ступені біяграфічнай... Вядома, кожны творца піша пра тое, што блізкае асабіста яму... Некалі вы прызналіся, што і аповесць "Гісторыя хваробы" была асабістаю: "Я кахаўся з дзяўчынаю, потым мы раз'ехаліся на летнія канікулы, за лета я напісаў тую аповесць — ад першага да апошняга слова і... "накаркаў", сурочыў; калі сустрэліся, аказалася, дзяўчына ўжо не мая..." Ці былі ў вас яшчэ нейкія літаратурныя прароцтвы?

— Спадарыня Раіса, — як і кожнаму, каго даволі часта "інтэрпрэтуюць" як каму ўздумаецца, мне заўсёды хочацца, каб мае цытаты былі дакладнымі. Сапраўды, некалі я выказаўся, што "Гісторыя хваробы" была "**часткова** асабістаю, а на самай справе ўсё было лепш, чым апісана ў аповесці". Памойму, ёсць розніца. "Часткова" ж асабістае можна прышпіліць да любога твора, у тым ліку і аб палётах на Марс...

— Дарэчы, наконт жанчын... Прабачце за такое пытанне, але чаму вы іх так не любіце?

— Гэта поўная лухта, і менш за ўсіх яна дапасоўваецца да мяне як да чалавека і як да літаратара. Як можна не любіць, напрыклад, сваю нагу ці руку? Пра іх можна не думаць. Іх можна параніць. Але, як пісаў Бунін, "адарвіце мне руку — я ж крывёю сыду!"

— "...Найбольш адпавядае вобразу ідэальнай жанчыны Кіці з "Ганны Карэнінай"?!

— Ну, па-першае, гэта **мне** так здаецца, а пра густы не спрачаюцца... А па-другое, чаму, цікава, Кіці не можа адпавядаць вобразу ідэальнай жанчыны?

— Таму, што "сапраўднай" у творы з'яўляецца іншая...

— Гэта не значыць, што калі раман называецца "Ганна Карэніна", дык яна, Ганна, аўтаматычна — галоўная гераіня, цэнтр рамана? І, адпаведна такой дзіўнай логіцы, яна чамусьці павінна абавязкова адпавядаць вобразу ідэальнай жанчыны? Ёсць такі маленькі літаратурны сакрэт, я б абазначыў яго тэрмінам "галоўны другасны герой". Раман "Ганна Карэніна" універсальнае гэтаму пацвярджэнне. У ім няма галоўных герояў — кожны самакаштоўны на тле іншых. Мяне ў свой час уразіў артыкул не помню якога крытыка, дзе разумна і доказна даводзілася, што (даслоўна) "Толстой всех нас надул", што галоўны герой, дзеля якога і пісаўся раман — Карэнін, муж Ганны...

— Андрэй Міхайлавіч, я ведаю, што ў нью-йоркскім часопісе "Ікарус" надрукавалі ваша апавяданне "Бляха"... Ці прыходзілі яшчэ прапановы адтуль?

— Ніякіх больш. Р. Завістовіч, які перакладаў апавяданне, прыслаў мне неяк з Амерыкі ліст, у якім растлумачыў, што "Ікарус" увогуле не друкуе неамерыканскіх пісьменнікаў, і ўсяго аднойчы зрабіў выключэнне — дзеля такога факта, як распад СССР.

— Дзякуй за гутарку! Творчага вам плёну!

Гутарыла Р. МШАР

Якія яны, карасі... на пяску?

Чалавек на Гомельшчыне знаны (і не толькі на Гомельшчыне), Васіль Ткачоў смяяцца ўмее. Але не абы з чаго, а тады, калі ёсць на гэтае патрэба. Праўда, у нашым сённяшнім грамадстве падобных выпадкаў надараецца так шмат, што, як у той прымаўцы, хоць смейся — хоць плач. В. Ткачоў, калі з'явілася жаданне пасмяяцца, бярэ чысты аркуш паперы і... Тады нараджаюцца ў яго чарговыя творы. І звычайныя гумарэскі, і тое, што знаходзіцца на мяжы гумару і сатыры... Ды справа не ў жанры, галоўнае, што ўсё гэта жыццёва, пераканаўча, а да ўсяго і чытаць хочацца. У чым і пераконвае новая кніга Васіля Юр'евіча з інтрыгуючай назвай "Карасі на пяску", што папоўніла "Бібліятэку "Вожыка". Нават па назвах твораў, змешчаных у ёй, відаць, што тое, аб чым расказвае В. Ткачоў, не толькі жыццёва, але і актуальна для нашага сённяшняга дня — "Ганарар", "Уік-энд з дэпутатам", "Бізнесмены", "Забастоўка", "Кампраміс". Ёсць, праўда, і больш традыцыйнае — "Эх, жанчыны, жанчыны!", "Дзень нараджэння", "Як кінуць курыць", "Певень"... Ды, канечне ж, справа не ў назвах, а ў тым, што ...Чалавек на Гомельшчыне знаны, Васіль Ткачоў смяяцца ўмее.

Дык пасмяёмся разам з ім!

А. М.

ЛіМ ЧАСАПІС

У "Кнігу рэкордаў Беларусі"

Чарговым намінантам "Кнігі рэкордаў Беларусі", што ствараецца намаганнямі чытачоў і супрацоўнікаў штотыднёвіка "Аргументы і факты", стаў пісьменнік Віктар Гардзей. Як піша гэтая папулярная газета ў адным са сваіх нумароў, "пагадзіцеся, наўрад ці хто з нас, нават надзеленых вялікай уладай ці грашыма, можа пахваліцца, што яго імем (ды яшчэ пры жыцці, што, пагадзіцеся, рэдкасць) — названа цэлая вуліца". А ў падарунак вуліцу В. Гардзей "атрымаў" у 1996 годзе, калі адзначаў сваё 50-годдзе. Жыхары вёскі Малыя Круговічы Ганцавіцкага раёна, у якой нарадзіўся пісьменнік, зрабілі гэта ў знак удзячнасці за тое, што пра іх Віктар Канстанцінавіч расказвае ў многіх сваіх празаічных творах, ды і ў паэзіі не абыходзіць увагай родных мясцін. А вуліца немалая — працягласць яе 1 кіламетр 200 метраў.

А "Палессе" жыве...

Няхай пакуль і не рэгулярна, але літаратурна-гістарычны і грамадска-палітычны часопіс "Палессе", які выходзіць у Гомелі, дзякуючы яго заснавальніку і галоўнаму рэдактару Р. Андрэяўцу, радуе чытача новымі матэрыяламі. Не выключэнне і чарговы, пяты з дня выдання нумар. Адкрываецца ён апавяданнем М. Даніленкі "Егер", у якім прывабным атрымаўся вобраз немаладога чалавека, пасапраўднаму ўлюбёнага ў лес і ўсё жывое... Макар не думае аб уласнай бяспецы, калі сутыкаецца з чарговым браканьерам. І паплаціўся за гэта...

Проза прадстаўлена таксама заканчэннем рамана Ю. Фатнева "Куміры твараху". Той жа Ю. Фатнеў ("Адвяргаючы правінцыйнасць") знаёміць з паэтычнай поштай "Палесся", прад'яўляючы высокія патрабаванні да твораў, дасланых у рэдакцыю: "Жыць у паэзіі можна толькі, адвяргаючы правінцыйнасць". А наколькі строгі адбор, відаць па вершах Н. Шкляравай, В. Козырава, Т. Мельчанкі, Т. Краўчанкі, З. Бартосіка і іншых паэтаў, прадстаўленых у гэтым нумары.

На каляровай уклейцы "Палесся" — рэпрадукцыі карцін А. Ісачова. Пад рубрыкай "Успаміны, дзённікі, дакументы" пра яго як пра творцу і чалавека расказвае ўдава мастака Н. Ісачова. Назва матэрыялу "Не нам яго шкадаваць..." (змешчаны пачатак) запрашае да размовы аб'ектыўнай і ў нечым, магчыма, нечаканай.

В. Ткачоў, які даўно зарэкамендаваў сябе знаўцам людскіх характараў, найперш сваіх землякоў, гэтым разам выступае з п'есай у адной дзеі "Дурная баба".

Жыве ў Гомелі цікавы пісьменнік С. Масіяш, якому споўнілася 70 гадоў. Пра яго расказвае А. Ананьеў у артыкуле "Мінулае — настаўнік будучыні", што сведчыць аб гістарычным накірунку творчасці юбіляра. Пад той жа рубрыкай "Успаміны, дзённікі, дакументы" змешчаны і ўрывак з кнігі "Цеплыня", аўтарам якой з'яўляецца генеральны дырэктар Гомельскай ЦЭЦ-2 А.Бачурынскі ("Энергагігант на Палессі"). Публікуецца таксама гутарка Н. Раманавай "Атланты і карыятыды гомельскага трэста" са старшынёй вытворча-будаўнічага кааператыву "Трэст N 14" А. Бяляевым, а ў раздзеле "Хроніка" — падборка інфармацыйных матэрыялаў.

"Маладосць", N 2

Як вядома, у лютым У. Дамашэвічу споўнілася 70 гадоў. У другім нумары "Маладосці", дзе Уладзімір Максімавіч доўгі час працаваў, з гэтай нагоды пачала друкавацца яго аповесць "Лішняе дзіця, або Амплітуда жаданняў". Тут жа слова пра юбіляра прамаўляюць У. Саламаха, А. Федарэнка, В. Гігевіч, А. Казлоў, Ю. Станкевіч, І. Валасевіч, Г. Далідовіч.

У паэтычным "сшытку" — творы З. Вішнёва, Г. Ціханавай, І. Панінай, У. Гарачкі, В. Морт, С. Патаранскага (усе яны належаць да літаратурнай суполкі "Бум-Бам-Літ"), а таксама Р. Тармолы-Мірскага і М. Віняцкага. Змешчаны маленькія апавяданні байца А. Дзбіша, п'еса Ю. Станкевіча "Шэва", аповесць М. Воранава "Пакаянная галава", артыкул П. Пранузы "Нязгасная зорка паэзіі" пра М. Сурначова, Ю. Бубнава "Законы — не для мяне, або Чаму моладзь становіцца на шлях правапарушэнняў", Я. Анішчанкі "Статут жыцця Ясінскага", працяг "Старажытнай Беларусі" М. Ермаловіча, заканчэнне артыкула Т. Грыба "З віру дзён мінаючых". Я. Шунейка расказвае пра Г. Мяшкову ("Мадэльер новага напрамку"), у якасці ілюстрацый змешчаны рэпрадукцыі яе работ.

ПАЭЗІЯ

Віктар ЖЫБУЛЬ



З думкай пра жыццёвыя нягегласці...

Карэктар снег

У рыхла-белай гурбістай газеце,
што разгарнулася абрусамі па бруку,
у час, калі ўсе птушкі на дыеце,
карэктар Снег шукаў памылкі друку.

Працуе дзень і ноч амаль няспынна
друкарскі незмаўкальны наш станок,
што накладае кожную хвіліну
адбіткі шын,
лыж,
лап
І ног.

Вось так зіма нас робіць друкарамі:
ці то язда,
ці то хада,
ці бег.
Ды нашы ўсе радкі перабірае
і беліць начыста
карэктар Снег.

Ён пад станка прыглушаны стук-грукат,
трымаючы пушысты белы пэндзаль,
замазаў дужа шмат памылак друку...

Дык, можа, не карэктар ён,
а цэнзар?

Гэй, прахожы!

Гэй, прахожы! Навошта скруціў
ты свой сцяг?
Разгарні — і мы пойдзем тады за табой!
Гэта ж так нескладана:
адзін толькі ўзмах —
І пачне ён свабодна лунаць над зямлёй.

Гэй, прахожы! У нас анічога няма,
Але будзе яшчэ — толькі ты нас вядзі!
Не пужайся! Цябе не чакае турма!
Разгарні ты свой сцяг і да мэты ідзі!

Гэй, прахожы! Спыніся! Назад ты зірні!
За табою ўжо ў такт маршыруе народ!
Пашкадуй нас і сцяг свой высока ўздымі,
Каб пад ім мы ўсё ж выйшлі
з балота нягод!

Гэй, прахожы! Дарэмна дарогу шукаць
Мы не будзем, бо ступім
на даўні свой шлях.
Дык — ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!
Ды навошта трымаць
Без усякай патрэбы той скручаны сцяг?

Але дожджык вясновы як толькі паліў,
Запаветная мара пагасла, як сон,
Бо прахожы што нёс —
тое тут жа раскрыў...
Ён зусім нёс не сцяг. Гэта быў парасон...

●

Трыбуна — века вока велатрэка,
Што пазірае коса ў небасхіл.
І вам раскажа лавак картатэка,
Хто і адкуль, калі і з кім тут быў.

Па кожнай лаўцы тут прайшоўся ножык,
Увекавечыўшы гаспадара.
Сюды пускае сонца жоўты вожык
Іголкі-промні, быццам на экран.

Калі ж сцячэ святло праменных рэкаў,
Пачне свяціць сярод начных чарнід
Пражэктар — вейка вока велатрэка,
Што пазірае коса ў небасхіл.

Лысыя чарапы талерак

Нядзеля
перакрэслена рысамі:
настаў панядзелак.
І ззяюць
шчарбатыя, лысыя
галовы талерак.
А лыжкі
на іх накладаюць
парыкі з вермішэлі
дзеля таго,
каб
неўзабаве
згалілі відэльцы
іх
густую
кудзелю.

Не сёмае неба

За гарамі сонейка схавалася
І вадзічкі з лужынкі напілася.
Ззяла, ззяла зранку, і — наззялася!
Ох, як ужо сонейка стамілася!

І вяроўкай перацыраванае
Тоўстай рэактыўна-самалётнаю
Гнецца над зямлёй утрамбаванаю
Неба прэлае,
потнае.

Нейкае аранжава-пунсовае
Месіва да сонейка прыбілася
І разліла поліўку свінцовую...
З гора ў лужы сонейка ўтапілася!

З дзіркамі залатанымі, п'янае,
Бруднае, як кудла беспародная,
Трэцца аб зямлю атынкаваную
Неба цяжкае,
потнае.

●

Па гарызантальнай траекторыі
раўнамерна і прамалінейна
рухаўся суб'ект па тэрыторыі,
зробленай з матэрыі надзейнай.

З думкай пра жыццёвыя нягегласці
сам ступаў ён цяжка і нягегла.
Нейкая істота на адлегласці
з металічным тупатам прабегла.

Лініі штрыхоўкі вабна бліснулі —
залатыя, быццам струны арфы.
Ды суб'ект працягваў сваю місію,
позірк скіраваўшы ў кропку L.

След свой штрыхпункцірны пакідаючы
на прамой паміж паўпласкасцямі,
можа, лом, а можа, ключык гаечны
ён сціскаў свінцовымі касцямі...

Так ён шпацыруе з самай раніцы,
рухаючы целам нетаропка.
І засведчыў ён сабе ў механіцы
радавой матэрыяльнай кропкай.

Кош мар

Мара ў мяне не адна:
Ў мяне цэлы кош
мар,
Ў якога ёсць ручка, а
дна
Няма —
ну проста
кашмар!

Лёгкі мой кош.
І яго
Нясу я праз поле і лес,
Праз выган, загон, палігон,
Праз сад,
дзе квітнее бэз.

З надзеяй часам я ў кош
Засуну руку —
не нагу.
Дастаць мне б адтуль
хоць грош,
Ды не...
На жаль, не магу.

Бо мара ў мяне не адна —
Ў мяне ж цэлы кош
мар!
Прыгожы мой кош, ды
дна
Няма...
Сапраўды,
кашмар!

Ледзяная сківіца

Выскаліў дах сваю верхнюю сківіцу,
Выставіў іклы свае ледзяныя.
Толькі дарма:хутка сківіца скінецца,
Бо кожны зуб ужо выеі ныеі.

Што за надвор'е!?!...
У сонейка мара ёсць —
Мара, якую ўжо здзейсніць пара:
Каб падтачыў іклы гэтыя карыес,
Ды каб падгнілі яны, абламаліся
І паляцелі на глебу двара.

Выскаліў дах сваю верхнюю сківіцу,
Выставіў іклы свае, ды дарма:
Верхняя сківіца хутка ўжо скінецца,
Сківіцы ніжняй наогул няма!

ПРОЗА

ГЭТАЯ ГІСТОРЫЯ, пра якую мне хочацца расказаць, адбылася вельмі і вельмі даўно, яшчэ падчас муравінскага міжледавікоўя. Хаця не, адбылася яна крыху пазней, ужо тады, калі здарылася міжледавіковае пацяпленне пасля самага халоднга паазерскага абледзянення, — адбылася ля самага краю ледавіка.

Талая вада, што выцякала з-пад лёду і снегу, яшчэ шукала свае рэчышчы, на лугах, дзе пасвіліся маманты, бучная трава цешыла вока яркаю зелянінаю, а на высокіх выспах стаялі буданы з костак, каменю, галінак і шкур, у якіх жылі першалюдзі.

Не ведаю чаму, аднак усё гэта, пра што раскажу, чамусьці я добра, вельмі яскрава помню, быццам бы тое, што адбывалася тады, бачыў на ўласныя вочы.

Быццам бы і мой будан стаяў там на выспе, недзе паміж сённяшнімі Дняпром і Друццю — памятаеце, першы справа ў стойбішчы, калі падымацца на выспу ад вялікай вады? Звычайны такі буданок, складзены з буйных костак маманта, накрыты шкурамі, а перад уваходам, з двух бакоў — два вялікія, закручаныя ўсярэдзіну, павернутыя адзін да аднаго біўні, што тырчаць з мамантавых чарапоў...

Я памятаю, добра памятаю і тыя ловы, быццам бы і сам браў у іх удзел.

Ён зразумеў, што хоць і хутка бегае, але ўцячы ад гары не зможа, не паспее — мамант ужо разварочваецца на яго і, канечне ж, стопча, а калі не стопча, то праколе біўнем ці падчэпіць за шкуру, за адзенне, падыме над сабою і, як ужо здаралася неаднойчы, будзе трэсці над галавою, пакуль не зваліцца яму пад ногі. У паляўнічага не было часу на роздум, таму ён, на хаду размотваючы моцную, хоць і не вельмі тоўстую вяроўку, з валокнаў крапівы, прадбачліва зробленую яшчэ перад паляваннем, — вопыт! — імгненна кінуўся да задняй нагі маманта, хуценька ўвесь прысланіўся да яе, як прыліп усё роўна, — яна была намнога таўсцей за яго самога, — і, папусціўшы вяроўку ў сябе за спіною, пачаў паспешліва прывязвацца да нагі.

Мамант спачатку не зразумеў, дзе падзеўся чалавек, але адчуўшы, што нешта паўзе па ягонай назе ўгору, чапляючыся за поўсць, падымаецца вышэй і вышэй, зразумеў, што гэта і ёсць крыўдзіцель яго, пачаў хвалявацца, трэсці нагою, але гэта не было перашкодаю паляўнічаму — хіба можа такая тоўстая і непаваротлівая дыля скінуць з сябе лоўкага чалавека?!

Поўсць гары была доўгая і брудная, ад яе брыдка пахла, але Хуткія Ногі, не зважаючы на гэта, памагаючы сабе нават падбародкам, а то і зубамі, мацней сціскаючы імі валасы, — яны, доўгія і зліплыя, задзіраліся ўгору і заміналі лезці, — усё ж падымаўся і падымаўся да жывата жывёліны.

Калі ўпёрся галавою ў чэрава маманта, лавец, не здымаючы з шыі крамянёвы нож на доўгай почапцы, зручна ўзяў яго ў рукі і з усяе сілы, наколькі можна было размахнуцца, ударыў у мамантаў лантух.

Але нож — вельмі востры і ёмкі — адскочыў ад жывата, не пакінуўшы ніякага следу. Паляўнічы ведаў і памятаў, што скура ў мамантаў вельмі грубая і тоўстая, аднак ад свайго не адступаўся: адчуваў сваю сілу і верыў ёй. Ён адною рукою падцягнуўся яшчэ вышэй, а другою, увесь напружыўшыся, усю сваю моц аддаўшы нажу, стараўся прабіць ім, праціснуць, пракалоць жывот гары.

А мамант, востра адчуўшы небяспеку, захваляваўся яшчэ болей. Ён круціў галавою, стараўся біўнямі дастаць свайго крыўдзіцеля, але яны, вельмі закручаныя, натыкаліся толькі на бакі самой жывёліны, а да чалавека не даходзілі.

Мамант круціў сюды-туды хобатам, — сваім рабрыстым ротам, носам і нават рукою — спрабуючы дацягнуцца да Хуткіх Ног, аднак і гэтая рука мацала паветра далекавата ад чалавека і нічым лаўцу не пагражала. А паляўнічы ведаў, якую небяспеку тоіць, хавае ў сабе гэты хобат — вунь у мінулую траву мамант падняў з зямлі, здавалася б, і не вельмі вялікі каменьчык, ды з такою сілаю, выдыхнуўшы з хобата паветра, запусціў яго ў лаўца, што той тут жа паваліўся і памёр на месцы — каменьчык трапіў якраз у цемя. Але гэтага маманта Хуткія Ногі не баяўся — у яго быў паранены, адрэзаны пятлёю, хобат і да зямлі ён не даставаў, а таму падняць каменьчыка не мог.

Паляўнічы адхінуўся крыху ад нагі, налёг спіною на вяроўку, адпусціў валасы маманта, за якія трымаўся, і, сабраў-

Янка СІПАКОЎ

ХУТКІЯ НОГІ

АПАВЯДАННЕ

шы ўсе сілы, абедзвюма рукамі націснуў на нож. І тады, узрадаваны, пачуў, як скура гары трэснула і войстры крэмень, хоць і з цяжкасцю, але ж уваходзіць у вантробы.

Ён павярнуў, пакруціў там, у ране, нож, падоўжыў разрэз і яшчэ мацней налёг на крэмень, каб глыбей разрэзаць жывёліне жывот, але ў гэты час штосьці трэснула зноў. Паляўнічы падумаў, што трашчыць скура маманта, аднак калі сам пачаў падаць уніз, зразумеў, што парвалася ці развязалася вяроўка, якою ён быў прывязаны да мамантавай нагі. Лавец, страціўшы ўсялякую апору, ледзь паспеў учапіцца абедзвюма рукамі за касмылі жывёліны, выпусціўшы з рук нож, які застаўся ў ране.

Зараз ён вісеў толькі на валасах гары, дрыгаючы нагамі, спрабуючы, хоць як, хоць чым утрымацца, а на яго цякла сукравіца і выпадалі вантробы.

Мамант аж вар'яцеў ад болю, яго вялізнае цела хісталася з боку на бок, а разам з ім матляўся, як кавалак лёгкай шкуркі, і сам паляўнічы. Адкуль у гэтага грузнага велікана ўзяўся такі спрыт — ён вельмі лёгка пачаў падкідваць свой азадак — відаць, смяртэльная небяспека зрабіла яго такім рухавым. Лавец, як ні трымаўся, усё ж, выскубшы жменю валасоў, сарваўся і ўпаў пад самыя ногі маманту. Зверху на яго, балюча ўдарыўшы па галаве, упаў нож, які выцягнула з раны вяроўка.

Убачыўшы, што падымаецца ўжо нага маманта і вось-вось апусціцца на яго і растопча, чалавек, памагаючы сабе локцямі і каленямі, папоўз, не, не папоўз, а мільгануўся, юркнуў, як змяя, з-пад гары ў крушню камянёў, якую ўгледзеў тую ж хвіліну непадалёку, і ўплюшчыўся, нібы ўрос, паміж імі, спадзеючыся застацца жывым...

На гэтае палаванне стойбішча мела вялікую надзею.

Апошнім часам усё цяжэй і цяжэй даставалася ежа. Вялікія жывёлы, якім не спадабалася суседства з надакучлівымі людзьмі, кінулі свае старадаўнія пашы і водапоі і некуды сышлі, а меншыя — зрабіліся хітрэйшымі, больш асцярожнымі, пачалі абыходзіць тыя месцы, дзе загадзя былі выкапаны лоўчыя ямы, закіданыя галінкамі, пастаўлены сілы, петлі, пасткі, альбо раскіданы самаловы, якія путаюць ногі і валяць нават самых лоўкіх і моцных жывёл. Усё меней і меней здабычы прыносілі мужчыны з ловаў, а то здаралася, што вярталіся яны з пустымі рукамі. Усё племя — і старыя, і малыя — ела ўжо толькі траву, карэнне, жалуды ды яшчэ, можа, мышэй.

У стойбішчы пачалі занепакоена пагаворваць пра голад, і таму племя адважылася на гэтае вельмі цяжкое, вельмі далёкае, але такое важнае палаванне — палаванне на маманта: упалююць яны гэтага велікана — усяму стойбішчу надоўга хопіць ежы. Гэта ж у іх будзе цэлая гара мяса!

Да ловаў усё стойбішча рыхтавалася дужа заклапочана і старанна. Адны пераглядалі свае дзіды, другія, у каго не было зручнай зброі, рабілі з крэмневых адшчэпаў вострыя нажы-пласціны, трэція шылі са шкур валакушы, зручныя плечакі, каб было як і ў чым, калі палаванне ўдасца, данесці і дацягнуць да стойбішча ўсяго маманта.

Ад гэтага паходу залежала вельмі шмат: вярнуўшыся яны будуць вырашаць, што рабіць далей — ці то аставацца тут, у звыклых мясцінах, ля гэтай роднай, але чамусьці не рыбнай ракі, што ўнізе, ці то пакідаць свае буданы і родавыя агнішчы на такім зручным кургане і шукаць сабе новыя мясціны, дзе ніхто яшчэ не палохаў звяроў, каб пабудаваць там свае новыя жытлы.

Таму перад самым выхадам са стойбішча ўсе сабраліся на абрадак, які зычыў палаўнічым удачлівага палявання — і дзеці гэтак жа шчыра, як і дарослыя, бралі ўдзел у гэтым абрадку, угаворвалі Кагосьці, каб заступіўся за звераловаў, каб гэты Хтосьці дапамог лаўцам усім вярнуцца назад, і не з пустымі рукамі, а ў жывёл, якіх яны яшчэ ўпалююць, ужо зараз прасілі прабачэння.

Усюды было шмат чырвонага колеру — колеру агню і крыві, — на які таксама спадзяваліся паляўнічыя: яны абсыпалі вохраю сваю зброю, мазалі твары і трусілі яе на сцежку, якая ледзь была пазначана ў траве і па якой на досвітку яны выйдуць са стойбішча.

Куды ісці паляўнічым, падказаў Тым. Перад гэтым яго нейкі час не было відаць на Кургане, а калі з'явіўся ў селішчы, усе заўважылі, што ён, хоць і вельмі стомлены, але задаволены: Тым сказаў, што ў тым баку, дзе хаваецца і знікае сонца, бачыў шмат жывёлаў. Далёка, але ўсё ж...

Хуткія Ногі запярэчыў быў, што, можа, варта пашукаць што-небудзь бліжэй, аднак Тыма нечакана падтрымала Войха:

— Навошта шукаць тое, што ўжо знойдзена? — спытала яна. — Ён бачыў і быў, а ты і не быў, і не бачыў.

Хуткім Нагам гэта не спадабалася. Ён прамаўчаў, хоць і адчуў, як аднекуль знізу, ад самага жывата падымаецца да галавы незадавальненне і быццам бы рэўнасць.

Войха заўсёды вылучала яго з усіх мужчын стойбішча: спрытны, моцны, смелы, кемлівы, хуткі... А якія рукі мае — яны ўсё ўмеюць! У яго самая лепшая зброя. Ніводзін мужчына на Кургане не ведае, як можна выпрамціць сагнуты бівень маманта. А ён выпраміў — вунь якая ёмкая дзіда атрымалася! А колькі ў яго розных забавак, зробленых з костак, з якіх ён дастае губамі дзіўныя гукі. Войха любіць слухаць яго, калі ён здабывае са сваіх свісцёлак нейкую пранізлівую тугу, падобную ці то на шум дрэў, ці то на шум ветру. Хаця якая розніца, гэта ж адно і тое ж — дрэвы шумяць толькі тады, калі ёсць вецер...

Калі Хуткія Ногі грае, Войха сядзіць ля яго і сама не ведае, чаму трымціць як пазяблая, як ад холаду, а з яе вачэй чамусьці самі сабою коцяцца слёзы. Ёй падабаецца тады дакранацца пальцамі да яго рубцоў, шрамаў, рассечын — да ран, атрыманых на паляваннях. Столькі ран, як у яго, пэўна, ні ў кога ў стойбішчы няма: і біўнямі, і рагамі, і зубамі розныя звяры пакінулі на яго целе свае адмеціны.

Шкада, што якраз тую сваю забаўку, слухаючы якую плакала Войха, ён згубіў на адным з паляванняў — узяў з сабою і не збярог. І сам ужо не ведае, дзе згубіў. Хутчэй за ўсё там, дзе валасаты насарог ледзь не ўздзеў яго на абодва свае рагі адразу.

Войха слухала, як спяваюць забаўкі, зробленыя ім, лашчыла ягоныя раны — і свежыя яшчэ, і тыя, што ўжо зажылі, — а Тым злаваўся: ён таксама быў лоўкі і смелы, і ў яго была добрая зброя і не меней ран, а таму і ён спадзяваўся на ўвагу і ласку Войхі. Але Войха яго не заўважала — быццам Тыма і не было.

Гэта яго злавала, даводзіла да шаленства, ён ненавідзеў Хуткія Ногі, аднак не паказваў гэта нікому, таіўся, прыкідваўся сябрам, а часам, калі ў Хуткіх Ног з'яўлялася нейкая вялікая праца, якую не зробіш адзін, сам прыходзіў, каб памагчы.

Так было, як Хуткія Ногі будаваў сабе жытло. Тым тады цэлымі днямі цягаў разам з ім ад ракі на Курган косткі маманта — лапаткі, тазавыя косці, а таксама сківіцы, — і яны разам, выбудоўваючы сцены, складалі косткі адна да адной.

А вялізныя чарапы, з якіх тырчаць біўні, Хуткія Ногі захацеў паставіць на ўваход у свой будан, звязаўшы іх сухажыллем, удвух яны не змаглі ўзнесці на выспу, а таму давялося прасіць на дапамогу ўсіх мужчын селішча. Гэтак жа яны ўдвух не далі рады і шкуры маманцянятці, якую хацелі зверху ўсцягнуць на будан, і зноў жа прасілі дапамогі.

Тым адгаворваў — навошта, ні ў кога ж у стойбішчы гэтага няма, — але Хуткія Ногі не паслухаўся — усцягнулі ўсё ж усім гамузам на ягоны будан тую шкуру, хоць гэта і было дужа цяжка. Спачатку думалася, што Тым не хоча цягнуць шкуру, бо лянуецца, а потым ён зразумеў, што сапернику не падабаецца, што не ў яго, а ў некага іншага будан — адзіны ў селішчы — будзе накрыты мамантавою шкурою.

Тым і сам марыў накрыць свой будан гэтак жа, як і Хуткія Ногі, але зрабіць гэта яму ніяк не ўдавалася: маманцяня ўпалявать вельмі цяжка, бо маманты пільна ахоўваюць сваіх дзяцей, а шкуру дарослага велікана на жытло не ўсцягнеш.

Так і стаіць будан Хуткіх Ног — адзіны з такой накрышшаю на ўсё стойбішча, на ўвесь Курган.

Дык хіба ж можна было Тыму не зайздросціць шчасліўцу?! Тым болей, што сам, сваімі рукамі дапамагаў яму будаваць тое, чаму потым усе будуць зайздросціць. І заваёўваць увагу Войхі, чаму будзе ўжо зайздросціць ён адзін.

А цяпер Войха глядзіць толькі на Тыма. Яна, здаецца, толькі яму аддае пад прыгляд усё гэтае палаванне. Быццам ён і лаўчэй, і мудрэй за Хуткія Ногі...

З такімі невясёлымі думкамі і выходзіў ён разам з усімі мужчынамі са стойбішча.

І вось іх ужо вядзе Тым — па дарозе, якой няма, але якую ведае і памятае толькі ён адзін.

Яны, несучы з сабою ўсё, што трэба для палявання, — лаўцы неслі з сабою нават свой агонь — ідуць ужо дужа даўно. Два разы з'яўлялася і знікала сонца, а яны яшчэ не бачылі жывых буйных жывёл: во як далёка, заганяючы сваім крыкам у абрывы і лоўчыя ямы, спудзілі іх людзі. Дробныя, праўда, трапляліся, яны на іх палявалі, аднак толькі дзеля таго, каб пад'есці, каб назапасіць сілы перад сапраўдным паляваннем.

Хуткім Нагам ужо здавалася, што ніякіх мамантаў Тым не бачыў, а ўсё гэта ён выдумаў толькі дзеля таго, каб звярнуць на сябе ўвагу Войхі і раззлаваць яго. Тым болей, ён прыкмеціў, што гэтаю пуцявінаю яны ішлі ўжо раней — вунь ля той вунь гары валуноў, якая вельмі ж нагадвае статак мамантаў, яны тады ўпалявалі зубра.

Яшчэ раз з'явілася сонца. Яшчэ раз яны паснедалі — з'елі некалькі зайцоў, якіх засмажылі ў гліне. Тым, праўда, еў сваіх мышэй, мяса якіх ён вельмі любіў. І толькі тады нечакана ўбачылі мамантаў. Правільней, заўважылі спачатку маманцянятка, якое адно спакойна пасвілася на лужку, а пасля ўжо і саміх велікана.

Людзі, каб не спудзіць жывёл, кінуліся да крушні камянёў і, пахаваўшыся за валунамі, ужо трымцелі ад нецярплівасці, каб не ўпусціць зручнага выпадку, які Нехта падараваў ім.

Аднак статак іх пачуў. Маманты падняслі галовы, стаялі насцярожаныя: іх хобаты былі паднятыя ўгору, яны вадзілі імі, нібы нюхаючы паветра, ловячы кожны подых ветру.

Пасля, мусіць, убачыўшы ўсё ж людзей, жывёлы пахавалі хобаты за біўні, а самі біўні пагрозліва ўскінуўшы ўгору, з пранізлівым, хрыпла-вісклівым крыкам кінуліся на валуны. Але дабеглі толькі да маманцяняткі і, абкружыўшы яго з усіх бакоў, — зразумелі, што небяспека пагражае найперш яму, — папіхаючы яго хобатамі, павялі як надалей і ад гэтага камення, і ад гэтых людзей, якія пахаваліся за ім.

Назад яны ішлі спакойна, не спяшаючыся — як усё роўна ведалі, што цяпер ужо людзі даганяць іх не будуць. Ды і паляўнічыя разумелі, што даганяць статак марна, бо і маманцянятка ад іх не адаб'еш, і саміх мамантаў не напалохаеш, не распудзіш, колькі б ты за імі ні ішоў.

Але ўсё ж наперадзе іх чакала ўдача. Калі ўжо зноў збіралася схавацца сонца, калі з правага боку ў іх з'явілася шырокая, вельмі паўнаводная рака, паляўнічыя ўбачылі тое, што ім якраз і трэба было: пасярод шырокага лугу, стоячы на каленях, пасвіўся адзінокі мамант. І яго не трэба было ні ад кога адбіваць — статак хадзіў асобна, далекавата адсюль, а гэты быў зусім адзінокі: ці то яго адрынуў гурт, ці то ён сам меў такі няўжыўчывы характар, што лічыў за лепшае пасвіцца асобна.

Паляўнічым спадабалася і тое, што ён скубе траву на каленях — значыць, ведалі яны, мамант — даўняя ахвяра людзей; яго хобат некалі трапіў у сіло, якое ўкараціла яго так, што велікан ужо не можа дастаць да травы, стоячы, як і ўсе, на нагах.

Першы яго заўважыў Хуткія Ногі, але не паспеў сказаць пра гэта іншым. Яго апярэдзіў Тым і гартанна выкрыкнуў:

— Гара! — і паказаў пальцам на маманта.

Хавацца было позна. Мамант, пачуўшы Тымаў крык і ўбачыўшы людзей, пачаў падымацца. Таму ўсе той жа час кінуліся да яго, спадзеючыся яшчэ да таго, як ён устане з каленяў, смяртэльна параніць жывёліну, бо самае галоўнае ў паляванні на маманта — паваліць гэтую гару. А паваліўшы, людзі ўжо ведалі, што рабіць далей, як дабіваць велікана.

Усе беглі і бакавым зрокам назіралі за астатнім статкам, баючыся, што маманты кінуцца выручаць суродзіча. Аднак статак спакойна пасвіўся ля лесу і зусім не зважаў на людзей.

Хуткія Ногі дабег да маманта першы — той, устаўшы на пярэднія ногі, яшчэ не паспеў падняць свайго азадка. Разгарачаны няпростым пачаткам ловаў, ён, памагаючы сабе грудзьмі, усё ж востраю, як праколка, дзідаю з выпрастанага біўня прапароў тоўстую шкуру маманта, стараючыся ўвагнаць, уціснуць яе як мага глыбей. Але мамант падняўся і на заднія ногі, а з ім, вырваўшыся з рук, вагаючыся і спружынячы, паднялася і ягоная дзіда.

Мамант, які, вядома ж, адчуваў рану і якога злавала, раздражняла і непакоіла, што яе нешта вярэдзіць, вельмі жвава, што нязвыкла для такой гары, павярнуўся да Хуткіх Ног...

І вось тады лавец выразна зразумеў, што не паспее ўцячы.

І тады ён маланкава кінуўся да мамантавай нагі і вяроўкаю з крапіўных валокнаў прывязаўся да яе.

І тады крамянёвым нажом распароў яму жывот.

І тады, калі вяроўка парвалася, спіною ўпаў велікану пад ногі.

І тады, убачыўшы, што нага вось-вось раздушыць, расплюшчыць яго, шмыгануў у валуны і ўплішчыўся між іх, прыціснуўшыся да зямлі. Спяшаючыся, ён неяк не зразумеў ці то не заўважыў, што ногі яго засталіся па-за камянямі...

Болю, здаецца, лавец не адчуў. Толькі вельмі выразна, нават грамчэй, чым гэта было на самай справе, пачуў, як трашчаць, ламаючыся, косці. І тут жа страціў прытомнасць.

Апрытомнеўшы, адкрыўшы вочы, убачыў, што ляжыць адзін між камянёў. Паспрабаваў паварушыць сваімі нагамі і тут жа ад болю зноў страціў прытомнасць.

Калі наноў вярнулася да яго памяць, ён згледзеў, што маманта блізка ўжо не было: яны — і супляменнікі, і мамант — адышліся адсюль, з пераменным поспехам нападаючы адно на аднаго. Людзі стойбішча, нібы танцуючы, кружыліся вакол параненага гіганта, і іхні танец быў страшны і небяспечны — увесь у крыві.

Хуткія Ногі цяпер ужо назіраў за гэтым збоку, аднак усё роўна, трымцеў барацьбой, перажываў за ўсё, быццам ён і зараз быў там, ля маманта. Калі гара пачала завальвацца на той бок, у якім яшчэ тырчала дзіда, што ўсадзіў ён сам, з ягоных грудзей, як і з грудзей іншых супляменнікаў, вырваўся гартанны, пераможны крык. І гледзячы, як павольна падае, праколваючыся, пратыкаючыся на ягоную дзіду мамант, як пад цяжарам самой жывёліны дзіда ўваходзіць усё глыбей і глыбей у тушу, ён таксама так узрадаваўся, што, забыўшыся на патрушчаныя ногі, аж падхапіўся, каб устаць з зямлі, але тут жа, нема крыкнуўшы ад болю, зноў паваліўся між валунамі.

(Працяг на стар. 14—15)

ЛіМ ЧАСАПІС

"Двое на арэлях" у Мінску

Толькі адзін дзень гасцяваў у сталіцы Мінскі абласны драматычны тэатр з Маладзечна. На гэты раз на сцэне Тэатра юнага гледача быў паказаны спектакль "Двое на арэлях" па п'есе вядомага амерыканскага драматурга У. Гібсана. Паставіў спектакль, вырашаны ў жанры балады пра каханне, мастацкі кіраўнік тэатра, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь М. Мацкевіч, а галоўныя ролі выканалі заслужаная артыстка Беларусі Вера Кавалерава і артыст Яўген Іўковіч.

Дарэчы, такія аднадзённыя гастролі для маладзечанцаў становяцца ўжо традыцыйнымі. Так, два гады назад мінчукі змаглі пабачыць яшчэ адзін спектакль М. Мацкевіча — "Чорную нявесту" Жа. Ануя, а летась — "Саламею і яе аматараў" па п'есе маладога беларускага драматурга С. Кавалёва ў пастаноўцы Р. Таліпава. Цікава, што ўсе гастрольныя спектаклі абласнога тэатра прайшлі "абкатку" ў рамках рэспубліканскага тэатральнага фестывалю "Маладзечанская сакавіца".

М. СЕРАФІМОВІЧ

На здымку: сцэна са спектакля.
Фота М. ХАМЦА

Салдаты і "Паўлінка"

Добрай і трывалай традыцыяй сталі сустрэчы вайскоўцаў Мінскага гарнізона з культурнымі дзеячамі сталіцы. На пачатку чэрвеня адбылося чарговае мерапрыемства з шэрагу запланаваных — у Акадэмічным нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы сумеснымі намаганнямі Рэспубліканскай ваенна-шэфскай камісіі і Літаратурнага музея Янкі Купалы прайшла вечарына. Аб велічы асобы Янкі Купалы ў кантэксце сусветнай літаратуры пранікнёна гаварыла галоўны захавальнік фондаў Купалаўскага музея Марыя Чабатарэвіч, віталі гасцей Сяргей Панізнік і Пятро Прыходзька. Пасля была паказана неўміручая купалаўская "Паўлінка" ў новым акцёрскім складзе.

А. ДУБОВІК

"Сонейка"

Дзіцячы міні-тэатр створаны ў крычаўскім дзіцячым садку N 19 "Сонейка". Малыя выконваюць там казачныя ролі Царэўны, Папялушкі, злой Бабы-Ягі, лісы, жураўля і іншыя.

На здымку: юная артыстка міні-тэатра Каця Курносенка.
Фота Валерыя БЫСАВА, БЕЛТА

ВІНШУЕМ!

Самае важнае, самае галоўнае...

ДА 70-ГОДДЗЯ НАВУКОЎЦА, ДАСЛЕДЧЫКА, ПЕДАГОГА ГУРЫЯ БАРЫШАВА

Першыя дакументы і публікацыі пра пачынальнікаў беларускага тэатра. Першыя доследы ў галіне тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва. Доследы ў галіне цырка, балета, драмы. Падручнікі па гісторыі беларускага тэатра. Арганізацыя кафедры гісторыі мастацтва ў Тэатральна-мастацкім інстытуце (БелАМ). Стварэнне рэдакцыі мастацтваў у Беларускай энцыклапедыі. Шматгадовая служба ва Універсітэце культуры, — пакаленні студэнтаў і навукоўцаў. Дзеянні ды з'явы, да якіх просіцца абагульненне кшталту "вытокаў адраджэння". Іх напраўду абагуліў — сваім жыццём у навуцы пра мастацтва прафесар Гурый Іларыёнавіч БАРЫШАЎ.

Прыканцы сёлетняга красавіка ён сустракаў сваё сямідзесяцігоддзе.

— Самае галоўнае, — распавядаў усмешлівы юбіляр, — калі жыццё складаецца й фармуецца з людзьмі, якіх можна назваць сябрамі па духу, па прафесіі. Як хораша, калі сябрамі могуць быць сямейнікі! Пра што б я больш за ўсё пашкадаваў у раі? Ды пра што хочаш. Але больш за ўсё — пра сяброў. Дзеці — твой працяг, але сябры — нешта большае: асяродак, эпоха, зносіны, успаміны жыцця... Тыя, з кім ты ствараеш сваё бачанне свету. Часам хочацца перагледзець жыццё. Пасля цябе застануцца тры рэчы: твае дзеці, твае працы, твае сябры. Не ведаю, што трэба ставіць паперадзе. Усе, усё — разам... Я нарадзіўся ў Ташкенце ў сям'і цыркавога Франчэскі Куцэнкі і дачкі высланага вайсковага лекарскага памочніка. Па расповедах бабкі й дзеда я ведаў пра Беларусь, дзе апынуўся пасля вучобы: яны там гастралявалі. У сям'і збераглося фота: дзед у клоунскім касцюме, а ўнізе напісана "Гродна"... Я канчаў акцёрскі, потым тэатразнаўства, бо даўно зразумеў, што ў зале буду пачувацца куды лепш, як на сцэне. Пайшоў у навуку...

— Вы першым пачалі вывучаць беларускае тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва...

— Як ні дзіўна — я... Часцяком сцэнаграфія — палова поспеху любога спектакля. Паняцце "выяўленчая рэжысура" з'явілася куды пазней, мы пачыналі са сціплага "афармлення спектакля". Я быў пятым у былым

МУЗЫКА

"Кожны з нас набыў нямала сяброў..."

ПРЭМ'ЕРА Ў МАЛАДЗЕЧНЕ

Гэты год у жыцці Мінскага абласнога драматычнага тэатра адзначыўся прэм'ерай дзіцячага мюзікла — "Чарадзейства ў краіне Оз". Яна сталася сапраўднай падзеяй у культурным жыцці Маладзечна. Маляўнічасць пастаноўкі, яскравасць акцёрскіх работ, прыгажосць музыкі, — усё гэта настройвала гледачоў на пэўную эмацыянальную хвалю — веры ў перамогу святла, у магчымасць шчасця...

Свята сцэнічнай творчасці адбылося не толькі дзякуючы таленту рэжысёра Венядзікта Растрыжэнкава, драматурга Галіны Булыкі, кампазітара Алены Атрашкевіч, балетмайстра Людмілы Лагуновіч, мастака Яўгена Волкава, мастака па касцюмах Таццяны Дзямідавай, акцёраў. Але і таму, што ўсе стваральнікі гэтага дзівоснага відовішча ў ажыццяўленні пастаноўкі аказаліся аднадумцамі. "У часе працы над спектаклем кожны з нас набыў нямала сяброў", — скажа пасля В. Растрыжэнкаў, якому належала ідэя пастаноўкі.

"Чарадзейства ў краіне Оз" — не першы яго дзіцячы музычны спектакль. Раней для юных гледачоў Маладзечна В. Растрыжэнкаў паставіў казку С. Кавалёва "Драўляны рыцар" (музыка А. Залётнева); п'есы С. Казлова "Па блакітных хвалях васількоў" і "Нельга нам без сябра" (абодва з музыкай А. Елісеенкава).

Шчаслівым аказаўся выбар новага сюжэта — трынаццаці казак Ф. Баума, умела ператвораных паэтэсай Галінай Булыкай у лібрэта для мюзікла, якое ўяўляе сабой своеасаблівае папуры на казачныя тэмы амерыканскага пісьменніка. Літаратурная версія, створаная драматургам, напоўнена роздумам пра спрадвечнае і актуальнае — і ў жыцці, і ў мастацтве: антаганізм дабра і зла, пошук ісціны, імкненне да шчасця.

Ярка акрэслены вобразы галоўных герояў. Так, Чарадзей, — ключавая фігура дзеяння. Ён нябачна накіроўвае шляхі персанажаў; з ягонай дапамогай адбываюцца многія чароўныя ператварэнні; ягонымі вуснамі абвяшчаецца асноўная думка казкі: дабро і зло раздзеленыя неадольнай прасторай, паміж імі не існуе "ні мосціка, ні кладкі".

Загадкавы вобраз нястомнага вандроўніка Калматага, чыстыя і кранальныя ва ўсіх праявах, падобныя сваёй "рукатворнасцю" лялька Латачка, сшытая жонкай Чараўніка, і Цік-Ток — выраблены на заводзе універсальны механічны чалавек.

Вельмі каларытныя і прадстаўнікі цемры — ведзьма Блінкі і кароль землякопаў Ругеда, якога прыдворныя называюць не інакш, як "Ваша сквапнасць" ці "Ваша жахлівасць".

Жыццёвыя шляхі герояў пралягаюць праз барацьбу з абставінамі, зыход якіх цалкам іх перайначвае. Калматы знаходзіць ісціну ў сабе: толькі трапяткія адносіны да ўсяго навакольнага свету дапамогуць стаць асобай, набыць індывідуальнасць. Дачка Чараўніка Озма ўсведамляе, што "не ў знешнасці сапраўднае хараство чалавека, а ў ягонай душы". Цік-Ток робіць адкрыццё: аказваецца, "светам кіруе не адна дакладнасць механізмаў, але і пачуцці"...

І ўсё ж... Якія б цуды ні тварыліся з дапамогай чарадзейства, найбольшым, сапраўдным цудам з'яўляецца каханне, сцвярджае Чараўнік. Светам кіруе каханне — гэтая думка набывае ўрэшце значэнне звышідэі спектакля.

Усё гэта ўвасабляецца і ў музычнай сферы пастаноўкі.

Музыка "Чарадзейства..." вартая асаблівай увагі не толькі з прычыны яе "пярвічнасці", абумоўленай законамі жанру. Спектакль літаральна "купаецца" ў яркіх, дзівосных па прыгажосці і абаяльнасці мелодыях. Некаторыя з іх, напрыклад, песня Калматага "Падарожная", "Пуцяводная зорка кахання", мажліва, набудуць самастойнае жыццё ў эстрадным свеце і, на думку паэта Міколы Шабовіча, зробяцца шлягерамі.

●

Ва ўмовах сінтэтычнага відовішча музычная драматургія "працягвае" жыццё літаратурных персанажаў, узмацняе іхнія пачуцці. Музыка тут не толькі раўнапраўная ўдзельніца дзеяння, але, бадай, і галоўная асоба, якая выступае ў розных ролях: то як "двайнік" персанажа (нумары-характарыстыкі герояў), то як "фон" (уверцюра, якая адлюстроўвае пейзаж; тэма Макаў), то як "каментарый", даведзены да ўзроўню абагульнення (песня Чараўніка, дуэт "Пуцяводная зорка кахання", "Падарожная"). Перавага сольных канцэртных нумароў абумоўлена жанравай спецыфікай спектакля: паводле вызначэння рэжысёра, гэта казка-канцэрт. І такая спецыфіка вынікае з перапляцення ў лібрэта мноства сюжэтных ліній (у кожнага героя — свая гісторыя). Каб пазбегнуць перагрузкі падзейнага шэрагу (пастаноўка ж — для дзяцей), В. Растрыжэнкаў выбраў нумарны прынцып пабудовы. Кожны вобраз задуманы як яркі сімвал-карцінка, даступны разуменню нават самых маленькіх гледачоў. Вядома, гэтая "карціннасць" дасягаецца многімі выразнымі сродкамі, але перш за ўсё — музыкай. Развіваючы рэжысёрскую канцэпцыю, кампазітар храналагічна першымі стварае "выхадныя" канцэртныя нумары. Надзеленыя ўнутранай тэатральнасцю, яны робяцца найважнейшымі знакамі сцэнічнага жыцця герояў.

Характарыстыка Цік-Тока і Латачкі вяртае нас да музыкі рэтра; іх "аперэтачны" чапурысты дуэт раскрывае і рыцарскую галантнасць механічнага чалавека, які невядома колькі гадоў праляжаў на дне калодзежа, і сарамяжлівасць ад нечаканых пачуццяў. "Здаецца, мы ў палоне", — заўважаюць героі. Адценне светлага гумару ўзмацняецца інструментальным суправаджэннем: гулкая імітацыя фагота (Цік-Ток жа — жалезны волат) з кранальным гучаннем скрыпкі (увасабленнем маленькай, крохкай Латачкі), а механічная рытміка нараджае лялечна-абмежаваную пластыку іхняга танца.

Калматы — лірычны герой, за хвацкай каўбойскай знешнасцю якога хаваецца тонкая, утрапёная душа. Песня "Каб заўсёды пазбег нежаданых сустрэч" і падкрэслівае гэта шырокай блюзавай кантыленнай мелодыяй. У дуэце з Озмай ("Пуцяводная зорка кахання") лірычная сутнасць персанажа, як і звышідэя спектакля, раскрываецца цалкам.

Вобраз "агрэсіўнай жаноцкасці" — ведзьмы Блінкі — паўстае ў галавакружным танга, напісаным А. Атрашкевіч адлаведна задуме рэжысёра. Нечаканыя экспрэсіўныя павароты мелодыі, "падтрыманыя" адкрытай чуллівасцю тэмбру скрыпак, адлюстроўваюцца ў рэзкай пластыцы персанажа, выяўляючы патаемныя рухі гэтай злоснай душы і ператвараючы Блінкі ў сімвал усяго застрашвальна-непазбежнага.

Для галоўнага носьбіта змроку — Ругеды кампазітарам напісана віртуозная канцэртная арыя, опернае "паходжанне" якой адаптавана да стылістыкі рок-музыкі, блюза і рэгтайма. Музыка літаральна выпраменьвае (вуглаватасць мелодыі, празмерна гучныя водыгрышы суправаджэння) "вартасць" караля землякопаў — сквапнасць,

СССР, хто займаўся тэатральна-дэкарацыйным мастацтвам. Першыя работы па сцэнаграфіі Купалаўскага тэатра, музычнага тэатра... Кіраваў усім Сяргей Піліпавіч Мікалаеў, вучань Канстанціна Каровіна, — Мікалаеў зафундаваў цэлую школу, чаго вартыя Масленнікаў, Блішч, — гэта кірункі, гэта светы... Мы ішлі нецярэбленымі шляхамі, рабілі глупствы, часам — памылкі, імкнуліся сабраць, назапасіць, перш як асэнсаваць. Выйсце на тэорыю, на абагульненне — толькі з цягам часу, з узростам...

— Вы адначасова шукалі народныя формы культуры...

— Беларусы, як этнас, мелі ўсяго тры тыпы тэатра: скамарохаў, батлейку і народную драму. Уся народная тэатральная культура фармавалася ў выглядзе тэатра з лялькамі, з ценявымі вобразамі і з акцёрамі-батлеямі, якія ігралі лялечны рэпертуар. Пасля паэткі Цёткі хіба мы з Саннікавым намагаліся **вытлумачыць** гэтую тэатральную з'яву. Трэба было высветліць слаі культуры, бо паняцці "культура Беларусі" і "беларуская культура" — гэта розныя рэчы! Трэба было зразумець, што такое рэгіянальная культура ў поліэтнічным і полілінгвістычным асяродку Вялікага княства Літоўскага, якое, акрамя таго, было і Рускім, і Жамойцкім, не лічачы яшчэ процьмы з'яў ды этнічных прадстаўнікоў. Мне хацелася прасачыць асаблівасці развіцця беларускага этнасу, яго менталітэту, яго прафесійнай культуры. Гэта потым я зразумеў, якая цывілізацыя была ў Беларусі — на сутыку Захаду ды Усходу з 16 да пачатку 19 ст.: магнацкія, школьныя тэатры, прыгонныя трупы, спецыфічныя вучэбныя ўстановы, далучэнне народа да самай гэтай з'явы — тэатра! Не фальклорна-абрадавыя, а прафесійныя формы. На васьмі мовах ігралі спектаклі. А балет... Вучні вучняў вялікага Навэра, — потым увайшлі ў Санкт-Пецярбургскі імператарскі тэатр, у Варшаўскі балет...

— Як бы вы ацанілі стан сучаснага мастацтва Беларусі?

— Ён на ўзроўні сусветных крытэрыяў. Трэба памятаць і разумець, што мастацтва фармуецца й выяўляецца толькі праз канкрэтную асобу — праз Пінігіна, Раеўскага, Ляляўскага... Няможна забывацца, што толькі індывідуальнае бачанне спараджае адметныя творы, якія выяўляюць стан духу нацыі. Шмат у каго з нашых творцаў — трагічны, драматычны лёс. Дык мо свядомае грамадства дваццатага стагоддзя мусіць адмовіцца ад хуткіх высноў ды ацэнак?

— Зрэшты, менавіта яны надаюць нашаму свету так званую якасць — культуру, мастацтва...

— Мастацтва заўжды кажа пра сваё — пра дабро і зло, пра тое, якім мусіць быць жыццё і якім яно не павінна быць. Якія суадносіны этнічна-нацыянальнага і агульначалавечага? Агульначалавечае выяўляецца толькі праз нацыянальнае. Яно не бывае абстрактным. Знакамітае Шэкспірава сіта для зорак, — калі трэба прасеяць культуру, адкінуць дробнае, пераацаніць нязначнае. Каштоўнае — для нашчадкаў. Для сваёй высокай духоўнасці мусім браць самае каштоўнае з таго, што стварылі ўсе народы свету. Не абмяжоўваць сваю ўласную культуру, — беларуская культура адметна даводзіць, як можна карыстацца каштоўнасцямі свету... У тым, што пакінулі нам стагоддзі, мусім шукаць глыбіннага, сутнаснага... Каб адстаяць сваё, трэба ствараць сваё на сучасным узроўні, вывяраючы маштаб. Гэта так важна — каб любы кірунак меў сваё развіццё, каб у часе развівалася натуральная пераемнасць, перадача ведаў. І, самае галоўнае, — трэба падтрымліваць чалавека, які стварае, а не толькі таго, які перадае створанае... Мастака, кампазітара, рэжысёра, артыста... Самае важнае, самае галоўнае...

З Гурыем БАРЫШАВЫМ размаўляла Жана ЛАШКЕВІЧ

Фота Аляксея ІЛЛІНА

памаўзлівасць, выхвалянне. "Я самы магутны, я самы ўладарны", — усклікае Ругеда з гонарам. Чым не сучасны Фарлаф?

Весялінка, дачка Вясёлкі, характарызуецца флейтавай тэмай грацыёзнага, чароўнага чатырохдольнага вальса, з якога "вырастае" і ейны партрэт — вытанчаная песня, упрыгожаная "блюзавымі ўкропваннямі", характарызуючы бесцялеснасць і "нябеснае" паходжанне гераіні.

Усе асноўныя вакальныя эпізоды праз трапную рэжысуру робяцца нумарамі-абагульненнямі і даюць надзвычайны ўзор тэатральнага відовішча, героі якога, апантаныя верай у дабро, выяўляюць вялікую волю ў яго сцвярджэнні, а гэта не можа не выклікаць эмацыянальнага водгуку гледачоў.

●

Перавага ў музычнай форме новага твора сольных канцэртных нумароў надае ёй рысы сюітнасці. Але гэта не спараджае статычнасць, бо кампазітар скарыстоўвае скразное развіццё матэрыялу, інтанацыйныя сувязі ды рэмінісцэнцыі.

Напрыклад, найбольш шматзначная ў мюзікле скразная тэма Чараўніка праходзіць, пераўтвараючыся, некалькі фаз развіцця. Эпічна-апавядальны яе варыянт пакладзены ў аснову Уверцюры, якая малюе краявід з дарогай, што вядзе да Ізумруднага горада; як характарыстыка горада яна робіцца святочна-ўрачыстай; увасабляючы вобраз самога Чараўніка, тэма набывае энергічна-велічныя рысы трансфармуючыся затым у пагражальна-таямнічую (Калматы адрывае крыло матылька і г. д.). А найбольш поўна яна прадстаўлена ў песні Чараўніка — выказніку найважнейшай драматургічнай ідэі несумяшчальнасці дабра і зла.

Па-майстэрску выкананая аранжыроўка падкрэслівае мастацкія вартасці музыкі. У асобных, пераважна гукавыяўленчых, эпізодах пераважае шматколерная тэмбравая палітра класічнага сімфанічнага аркестра. Скажам, чароўны краявід, намаляваны музыкай уступу, увасоблены імітацыяй званочкаў, вібрафонаў і высокіх драўляных духавых; палёт матылькоў — трэлямі флейтаў: ператварэнне Калматага — чарадзейна-таямнічай кадэнцыяй арфы, якая асацыіруецца з аналагічнымі эпізодамі музыкі М. Рымскага-Корсакава. Тэмбравы ж фон вакальных нумароў — песень, дуэтаў — абумоўлены іх эстрадным кшталтам, блізкі па інструментальным каларыце да сімфаджаза.

У цэлым музычная мова спектакля — гэта прыклад арганічнага, удалага сплаву лірычнай песеннасці, блюза, рэгтайма і апрабаваных прыёмаў класіка-рамантычнага стылю. Такое збліжэнне акадэмічнай і эстраднай моўных сфер назіраецца ў кампазітараў т. зв. "трэцяга напрамку", да якога звычайна прылічваюць Г. Гладкова, М. Мінкова, В. Лебедзева, А. Журбіна, В. Сакалова, М. Кажлаева. Пры ўсіх адрозненнях, іх аб'ядноўвае, гаворачы словамі У. Дашкевіча, імкненне "спалучыць высокія традыцыі і патрабавальнасць да матэрыялу, уласцівыя класіцы, з дэмакратызмам і жыццястойкасцю сучаснай эстрады", што дазваляе ствараць музыку, даступную розным катэгорыям слухачоў. Такога роду сінтэз заўважны і ў творчасці Алены Атрашкевіч ("25 калыханак" на вершы Валянціны Аколавай, песні на тэксты Марыны Цвятаевай, музыка да "Чарадзейства"...). Гэта збліжае метад кампазітара з творчай практыкай прадстаўнікоў "трэцяга напрамку". Высокамастацкі меладыйны выток музыкі спектакля, безумоўна сведчыць пра прыродны дар меладыста, як, зрэшты, і пра значны досвед А. Атрашкевіч у асваенні складанай "пароды" эстраднай песні.

"Чарадзейства ў краіне Оз", яе першы мюзікл, удала дапаўняе шэраг твораў беларускіх кампазітараў у гэтым жанры за апошняе дзесяцігоддзе: "Дапытлівае сланяня", "Драўляны рыцар", "Адчыніце, казляняткі" А. Залётнева, "Прыгоды ў замку Алфавіт" В. Войціка, "Карлік Нос" У. Кур'яна.

●

Зразумела, увасабленне мюзікла ва ўмовах драматычнага тэатра — рэч складаная. Аднак атрымалася эстэтычна значнае, сапраўды мастацкае відовішча. Творчыя магчымасці артыстаў размеркаваныя рэжысурай вельмі ўдала. Адчуваецца адзінае імкненне — стварыць гармонію музыкі і відовішча. Многія выканаўцы галоўных роляў аказаліся ўладальнікамі нядрэнных галасоў, што дало ім магчымасць не толькі "пражыць" лёс сваіх персанажаў драматычна, але і ўвасобіць іх сродкамі вакалу без дапамогі "дублёраў". Нарадзіліся цікавыя акцёрскія работы. Яркa сыграў ролю караля Ругеды А. Чэчанеў, пераканальна ўвасобіла каварства ведзьмы Блінкі І. Кляпацкая. Выдатна атрымаўся ў А. Пашкевіча механічны чалавек Цік-Ток, а роля Латачкі — у актрысы А. Рахмангулавай. Словам, акцёрскі ансамбль з поспехам змог рэалізаваць задумкі рэжысёра, драматурга, кампазітара і — парадаваць гледача.

Цалкам падтрымлівае рэжысёрскую канцэпцыю мастацкае афармленне Яўгена Волкава.

Падаецца асабліва важным, што "швоў", якія часцяком непазбежна ўтвараюцца "на сутыках" лібрэта, яго сцэнічнага ўвасаблення і музыкі, тут не заўважаеш — напэўна, дзякуючы супадзенню і адзінству творчых імкненняў усіх, хто ўдыхнуў у "Чарадзейства..." жыццё.

Што ж датычыць "недабораў"... У мастацтве, як вядома, мяжы для дасканаласці няма. Зразумела, што шлях да ідэальнай гармоніі ў такім нялёгкім працэсе, як тэатральная пастаноўка, — найскладаны. Аднак, думаецца, і ступень мастацкай пераканальнасці новага спектакля маладзечанцаў дастаткова вялікая.

Людміла ЛЯШЧЭВІЧ

КІНО

Углыб душы

ДНІ ШВЕДСКАГА КІНО Ў МІНСКУ

Швецыя, Нарвегія, Фінляндыя... Колькі жыву, столькі мару апынуцца ў тых паўночных казачных краінах. Бясконца мару. Запісы народнай нарвежскай музыкі (касету падаравала знаёмая нарвежка) ажыўляюць фантазію: славутыя скандынаўскія ландшафты бачацца з птушынага палёту.

Аднак шведскі кінематограф — здзіўляе. Позірк шведскіх рэжысёраў ідзе ўглыб чалавечай душы, а чароўныя горы ды азёры застаюцца па-за кадрам?!

Прыгожых, паэтычных эпізодаў пазбаўлены карціны І. Бергмана. Сэнсавы цяжар яго фільмаў — у хваравітым надрыве чалавечай душы. Стылістычны — у дакладным увасабленні таго надрыву праз сродкі кіно. Часцей — у закрытых прасторах. І калі ўявіць, што Бергман — гэта своеасаблівае сонца ў "касмічнай" сістэме шведскага кінематографа, то зразумела адкуль чэрпаюць энергію іншыя планеты вакол яго. Зразумела з Дзён шведскага кіно ў Мінску (19—25 красавіка). Бо арганізатары іх (Шведскі інстытут, Пасольства каралеўства Швецыя ў Маскве, кінавідэастудыя "Таццяна", Беларускі саюз кінематаграфістаў, Міністэрства культуры РБ) адкрылі нам малавядомыя (але не безыменныя) зоркі. І хаця яблыку не было дзе ўпасці менавіта падчас паказу фільма Бергмана "Лета з Монікай" (1953 г.), без увагі не засталіся іншыя дваццаць чатыры карціны (палову з якіх складалі дакументальныя і анімацыйныя стужкі). Прынамсі, зала кінатэатра "Перамога" была поўнай амаль кожны вечар.

Аднак гісторыя шведскага кінематографа распачалася не з Бергмана. Першыя спробы здымак з'явіліся ў Швецыі ў 1895 годзе, адразу ж пасля эксперыментальных стужак братоў Люм'ер. Аб'ектыву шведскага кінаператара належыць афіцыйная хроніка знаходжання караля Чуланкорна ў Стакгольме. Ужо ў 1912 годзе ў Швецыі здымае першая жанчына-рэжысёр Ана Хофман-Уддгрэн. Росквіт шведскага кіно — 20—30-ыя гады. У кінематографе актыўна працуюць В. Шострам, М. Сцілер, Г. Муландэр. Узыходзяць зоркі Г. Гарбо, І. Бергман. У 40—50-ыя ў шведскае кіно прыходзіць новае пакаленне мастакоў: І. Бергман, А. Шоберг. Х. Экман. У 70-ыя да іх далучаюцца В. Відэрберг, В. Шоман, дакументалісты Я. Труэль і С. Ярл. Дарэчы, стужкі Я. Трузля не адзін раз былі намініраваны на "Оскар". Канец XX стагоддзя — час рэжысёраў так званага "іранічнага пакалення". Цудоўна, што арганізатары Дзён шведскага кіно прапанавалі карціны розных гадоў.

Сваім настаўнікам Бергман лічыў В. Шострама. Яго знакамітая "Карэта-фантом" (1921) дэманстравалася ў рамках Дзён шведскага кіно. Шкада, што арганізатары паказалі карціну ў апошні дзень. Нямая, чорна-белая стужка была ці не самай цікавай. Па сённяшніх кінематаграфічных стандартах "Карэта-фантом" — з катэгорыі павучальных. Рэжысёр так дакладна акрэслівае і размяжоўвае паняцці дабра і зла, што іх нават немагчыма пераблытаць!? Адпеты прапойца Дэвід (яго сыграў В. Шострам) "сустракае" свайго памерлага сябра, які цяпер — містычны фурман Смерці. І калі ў Дэвіда з'яўляецца магчымасць паглядзець на сваё жыццё збоку, ён адразу ж просіць у Бога, каб не даў яму памерці, пакуль душа не навучылася любові і міласэрнасці. Такім чынам у цэнтры ўвагі Шострама — хворая душа чалавека. А таксама — яе вылечванне. Несумненна, што фільм "Сёмая пячатка" І. Бергман зрабіў пад уплывам "Карэты-фантом". Толькі бергманаўскі герой размаўляе (і адначасова гуляе ў шахматы) ужо не з фурманам, служкам смерці, а з самой Смерцю. У душы сядзяць стрэмкі-пытанні: чаму на зямлі, якую стварыў Бог, ёсць пакуты, хваробы і страх смерці. У фільме "Лета з Монікай" рэжысёр назірае як горад траўмуе псіхіку чалавека, у прыватнасці семнаццацігадовай Монікі (Х. Андэрсан). Паступова, з прыгажуні, Моніка ператвараецца ў пачвару. Дзяўчына, якая ідзе за кавалак мяса на злачынства, пачынае выклікаць агіду ў гледача. Вядзе рэй натуралізм (рэха рацыяналізму шведскага кіно). У фільме ёсць эпізод, калі Моніка нечакана пераводзіць погляд з палюбоўніка ў аб'ектыў камеры: тут па ўспамінах Бергмана, ўпершыню ў гісторыі кінематографа, адбываецца бессаромна прамы кантакт з гледачом. Вочы Монікі на буйным плане — дзверы ўглыб яе душы.

Сюжэтныя карані сучасных шведскіх карцін — у сямейнай драме. Рэжысёры ўважліва сочаць за кожным, хто ўдзельнічае ў ёй. У "Каляднай араторыі" (1996 г.) рэжысёр Шчоль-Аке Андэрсан распавядае як смерць маці і жонкі паступова раз'яднала сына і бацьку. Яны перажываюць боль паасобку. Пакуль стары Арон спадзяецца на новае каханне, сын Сіднер трапляе ў вар'яцкі дом. Боль аднаго чалавека наслойваецца на боль другога, нязбытная мара — на мару. Здаецца, рэжысёр занадта захапіўся прэпарацыяй душы на экране. Цяжка дыхаць. Так і хочацца працытаваць Дастаеўскага: "Колькі болю..."

Трэба адзначыць і работу маладога шведскага акцёра Ю. Відэберга. Юнак з нервовым, хваравітым тварам вельмі натуральна сыграў параноіка ў "Каляднай араторыі" і разбэшчанага падлетка ў фільме яго бацькі Б. Відэберга "Пара квітнення" (1995 г.), які таксама дэманстраваўся ў рамках Дзён. Трагедыя — смерць жонкі напаткала і галоўнага героя карціны "Крыніца радасці" (1994г.) Р. Хоберта. Але тут трагедыя з'ядноўвае бацьку з сынам. Р. Хоберт услед за сваім настаўнікам К. Кеслеўскім уводзіць у тканіну фільма адвечны канфлікт духа і плоці. У 1994 годзе карціна "Крыніца радасці" атрымала шэраг узнагарод, у прыватнасці прыз імя І. Бергмана і прыз сімпатый гледачоў на кінафестывалі ў Гетэрбергу. Мяркуючы па рэакцыі мінскіх гледачоў, добры, не пазбаўлены камедыйных элементаў фільм Хоберта, спадабаўся ім. Рэжысёры "іранічнага пакалення" разважаюць, а ці трэба наогул мець сям'ю. У карціне "Адам і Ева" (выбар імёнаў здаецца сімвалічным, бо першыя людзі Адам і Ева склалі і першую сям'ю на зямлі) маладыя стакгольмскія рэжысёры Х. Хольм і М. Хернгерн справядліва "іранізуюць" над пакаленнем 30-гадовых, якія замест традыцыйнага шлюбу выбіраюць свабоднае каханне. Фільм дужа зацягнуты. Замест жадаемай кропкі, рэжысёры ўвесь час ставяць шматкроп'е...

З пачатку стагоддзя ў шведскім кінематографе вельмі актыўна здымаюць жанчыны-рэжысёры. Прынамсі, з пяці дакументальных стужак, тры належалі жанчынам. Адметная работа К. Олафсан "Штрыхі сэрца" (1996). За гадзіну гледачам адкрываюцца "штрыхі сэрцаў" трох славутых шведскіх актрыс Б. Андэрсан, Х. Андэрсан і Г. Ліндблом. Іх аб'ядноўвае не толькі ігра ў фільмах І. Бергмана (Х. Андэрсан Бергман лічыў геніяльнай актрысай) ці сумесная праца ў скандальнай карціне 60-х "Дзяўчаты", фемінісцкая накіраванасць якой відавочна асабліва цяпер, але і шчырая размова. У аб'ектыў кінакамеры. Актрысы згадваюць свае першыя ролі ў кіно і тэатры, разважаюць наконт лёсу жанчыны. Х. Андэрсан і Б. Андэрсан цалкам прысвяцілі сябе кінематографу і не маюць сям'і, а вось Г. Ліндблом — маці трох дзяцей. Фільм К. Олафсан можна назваць паэтычным, бо кожная яе гераіня — асобны верш. Гераіня карціны "Сонечны цень" (1996) рэжысёра С. Эдвардс — жанчына-тарзадор Крысціна Санчас. Старэйшы шведскі дакументаліст Я. Труэль прысвяціў сваю карціну танцу. На працягу дваццаці хвілін назіраеш цікавы кінаэксперымент: класічны і сучасны балеты, народны танец, просты вальс лучацца ў адзін вялікі Танец, калі гучыць "Балеро" М. Равэля. Гэты танец такі дзіўны і рамантычны, што рухі партнёраў пачынаюць нагадваць рухі палкіх каханых. Мара героя карціны С. Ярла "Яўна — пастух трэцяга тысячагоддзя" (1993 г.) дванаццацігадовага жыхара Лапландыі — усё жыццё займацца аленегадоўляй. "Вось толькі ўзровень цэзію ў зямлі пасля Чарнобыльскай катастрофы не робіцца менш ды алені хварэюць", — хвалюецца Яўна...

Нягледзячы на тое, што сваю апошнюю карціну І. Бергман зрабіў у 1982 годзе і цяпер цалкам прысвяціў сябе Каралеўскаму драматычнаму тэатру, нацыянальнае кіно працягвае жыць. Шведскія рэжысёры паранейшаму фіксуюць тое, што адбываецца ў душах сучаснікаў. На думку М. Формана, еўрапейскае кіно ў адрозненне ад амерыканскага мае самае галоўнае — свабоду, якая вызначаецца незалежнасцю ад вялікіх грошай і камерцыйных заказаў. І гэтая свабода дапамагае сучасным шведскім карцінам браць удзел у міжнародных кінафестывалях (фільм Б. Відэберга "Пара квітнення" атрымаў у 1996 Срэбранага мядзведзя на МКФ у Берліне). Цікава, што нават расійскі тэлевізійны канал знаёміць свайго гледача са шведскім кіно: у лютым дэманстравалася поўнаметражная карціна знакамітай шведскай актрысы (жонкі Бергмана) Л. Ульман "Сафі", а днямі — фільм К. Нюквіста "Жанчыны на даху". Адным словам, шведскае кіно ведаюць і цэняць ва ўсім свеце.

Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА

P. S. Кінатэатр "Перамога" з 1995 года з'яўляецца членам міжнароднай асацыяцыі Еўропа-сінемас. Адна з яго мэтаў — прапагандаваць еўрапейскае кіно ў Мінску. Дарэчы, у нашай сталіцы існуе здаровае экраннае чаргаванне амерыканскай і еўрапейскай кінапрадукцыі. Пасля Дзён украінскага кіно "экранная плошча" "Перамогі" справядліва дасталася славутаму "Тыганіку", які ўжо праз некалькі тыдняў уступіў яе шведскім фільмам.

ЛіМ ЧАСАПІС

З любоўю да Беласточчыны

МІКОЛУ ГАЙДУКУ — 65

Пісьменнік, журналіст, краязнаўца, педагог — так можна вызначыць абсягі дзейнасці Міколы Раманавіча. А нарадзіўся ён у вёсцы Кабылянка Беластоцкага ваяводства (Польшча) у сялянскай сям'і. З 1953 года вучыўся на філалагічных факультэтах ва універсітэтах Растова-на Доне, Ленінграда, Мінска. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1959) працаваў у агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання імя Б. Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім — выкладчык беларускай і лацінскай моў, дырэктар. У 1959—1964 гадах адначасова выкладаў беларускую літаратуру на беларускім аддзяленні завочнай настаўніцкай студыі ў Беластоку. З 1971 года — публіцыст у рэдакцыі газеты "Ніва" (Беласток), з 1986 па 1988 год — намеснік галоўнага рэдактара.

Літаратурную працу пачаў у 1957 годзе. Выступае як паэт, публіцыст, літаратуразнаўца, перакладчык з польскай мовы на беларускую. Апублікаваў каля 600 самім жа сабраных беларускіх песень з нотамі (нядаўна яны папоўнілі серыю "Беларуская народная творчасць", якую цяпер выпускае наша выдавецтва "Беларуская навука"). Аўтар кнігі паэзіі "Ціш", зборнікаў апавяданняў і аповесцяў "Трызна", гістарычных эсэ "Паратунак" і "Брэсцкая унія", казак "Белавежскія быліцы і небыліцы", народных песень "Легенды Беласточчыны". Сааўтар (разам з Л. Гайдук) падручнікаў па беларускай мове для 3, 4, 5 класаў (вытрымалі па тры выданні) і "Граматыкі беларускай мовы для 5—8 класаў беларускай пачатковай школы".

Віншуючы Міколу Раманавіча з юбілеем, зычым яму новых жыццёвых і творчых поспехаў!

Помняць землякі паэта

На пачатку верасня вядомаму беларускаму паэту, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Беларусі Анатолю Грачанікаву споўнілася б 60 год. На вялікі жаль, ужо колькі год яго няма побач з намі. Засталіся вершы. Добрыя, таленавітыя. І памяць тых, хто ведаў Анатоля Сямёнавіча.

На Гомельшчыне, дзе нарадзіўся, вучыўся і працаваў на заводзе і ў камсамоле А. Грачанікаў, берагуць і пры неабходнасці множаць памяць пра яго. Створана абласное літаратурнае аб'яднанне імя А. Грачанікава, выходзіць літаратурна-мастацкі альманах "Магістраль", у якім, як правіла, друкуюцца творы пачынаючых аўтараў. Называецца альманах па першай кнізе вершаў А. Грачанікава...

А нядаўна абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў і вытворчае аб'яднанне "Машынабудаўнік" (дырэктар — М. Афанасьеў) устанавілі штогадовую літаратурную прэмію імя А. Грачанікава, якая будзе ўручацца лепшым майстрам паэтычнага слова Гомельшчыны.

Раней такое ж рашэнне пісьменнікі вобласці прынялі разам са Жлобінскім гарвыканкамам (старшыня — У. Ерафееў): лепшыя творы прозы і публіцыстыкі будуць адзначацца абласной літаратурнай прэміяй імя А. Капусціна.

Зараз вырашаюцца пытанні, як увекавечыць памяць этнографа, гісторыка і фалькларыста Мітрафана Доўнар-Запольскага, пісьменнікаў Барыса Сачанкі і Леаніда Гаўрылкіна.

Ігар ЛЯСНЫ

З лазы і скуры

Таццяна і Ігар Пярвухіны — вядомыя ў Гродне майстры па мастацкай апрацоўцы металу і скуры. Цудоўнае веданне матэрыялу, яго магчымасцей, высокі мастацкі густ робяць іх вырабы сапраўднымі творамі мастацтва.

На здымку: Таццяна Пярвухіна дэманструе дэкаратыўныя работы са скуры і лазы.

Фота Яўгена КАЗЮЛІ,БЕЛТА

ВІНШУЕМ!

"Вось ідзе Гаспадар..."

Вось ідзе Гаспадар запаведнікам-садам,
Прыпыняе хаду ля вясковага тыну,
Задуменна-жывым,
клапатлівым паглядам
Азірае сядзібы і храмы-святыні.

Там патрэбна падладзіць страху,
там — вароты,
Там падмурак царквы ўмацаваць,
як належыць...
— Адпачні, Гаспадар!
— Не пускаюць турботы,
Расквітнее наш Сад —
адпачну непазбежна!..

Гэтыя радкі паэта У. Пецюкевіча прысвечаны чалавеку, грамадзяніну-патрыёту, гаспадарскім клопатам і намаганнем якога беларускі "скансэн", музей пад адкрытым небам, сапраўды становіцца запаведнікам народнай спадчыны, дзе сабраны унікальныя помнікі драўлянага дойлідства канца XIX — пачатку XX стагоддзя з розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.

Тут, над ціхаплыннымі водамі Пцічы і гістарычнай Менкі, побач з сядзібамі, цэрквамі, млынамі — ветракамі, свірнамі, гумнамі, карчмой і прыходскай школы, радуюць вока пасаджаныя маладыя дрэўцы, старанна апрацаваныя, дагледжаныя нівы з пасевамі жыта, ячменю, грэчкі, бульбы; хмеляць густым водарам лекавыя зёлкі — мята перцавая, рамонак аптэчны, нагаткі, святаяннік, валяр'ян, дзе збіраюць мёд-нектар пчолы, вылятаючы з музейнай пасекі...

Сёння, напэўна, мала хто ведае, што наш музей па сутнасці адпавядае прыгожай назве "Беларускі дзяржаўны музей-запаведнік "Менка". Ёсць спадзяванне, што новы статус і назвы музея будзе некалі зацверджаны.

У чэрвені дырэктару Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту Ткацэвічу Георгію Андрэевічу споўнілася 55 гадоў. Мы падносім яму чэрвеньскія палявыя кветкі і букет язміну, жадаем моцнага здароўя і новых поспехаў.

Супрацоўнікі Белдзяржмузея народнай архітэктуры і побыту

На здымку: Г. Ткацэвіч сярод наведвальнікаў музея.

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЯ МУЗЫКІ

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ

студэнтаў у 1998 годзе

У Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю і пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, а таксама грамадзяне Беларусі і беларусы, якія пражываюць за яе межамі, грамадзяне Расійскай Федэрацыі.

Абітурыенты, якія паспяхова здалі экзамены, але не прайшлі па конкурсе, а таксама грамадзяне іншых дзяржаў СНД, могуць быць залічаны ў акадэмію па кантракце на ўмовах поўнай кампенсацыі выдаткаў на навучанне.

Прыём ажыццяўляецца па спецыяльнасцях "Музыказнаўства" (спецыялізацыя музыказнаўства; музычная беларусістыка); "Кампазіцыя"; "Дырыжыраванне" (спецыялізацыі харавое дырыжыраванне; оперна-сімфанічнае дырыжыраванне); "Інструментальнае выканальніцтва" (спецыялізацыі фартэпіяна, скрыпка, альт, віяланчэль, кантрабас, арфа, флейта, габой, кларнет, фагот, труба, валторна, трамбон, туба, барытон, баян-акардэон, цымбалы, домра, балалайка, гітара); "Спевы" (спецыялізацыя акадэмічныя спевы).

Абітурыенты здаюць наступныя экзамены: спецыяльнасць; беларуская або руская (па выбары) мова і літаратура (пісьмовы пераказ).

Экзамен па спецыяльнасці складаецца з 4—6 раздзелаў, кожны з якіх ацэньваецца асобнай адзнакай: выкананне праграмы (выканальніцкія спецыяльнасці, харавое дырыжыраванне, оперна-сімфанічнае дырыжыраванне); дырыжыраванне аркестрам (оперна-сімфанічнае дырыжыраванне); выкананне ўласных твораў (кампазіцыя); музычная літаратура (музыказнаўства); гармонія (усе спецыяльнасці, акрамя спеваў); элементарная тэорыя музыкі (спевы); сальфеджыа (усе спецыяльнасці); калёквіум (усе спецыяльнасці); фартэпіяна (музыказнаўства, кампазіцыя, харавое дырыжыраванне, оперна-сімфанічнае дырыжыраванне).

Права на залічэнне маюць асобы, якія вытрымалі ўступныя экзамены і прайшлі па конкурсе. Залічэнне на ўсе факультэты праводзіцца па большасці набраных балаў на раздзелах экзамена па спецыяльнасці.

Асобы, якія скончылі сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову з дыпломам "з адзнакай" або з медалём, лаўрэаты і дыпламанты міжнародных юнацкіх і дарослых конкурсаў па выканальніцкіх спецыяльнасцях у якасці салістаў і па кампазіцыі, лаўрэаты нацыянальных конкурсаў па выканальніцкіх спецыяльнасцях (рангам не ніжэй за конкурс сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў) у якасці салістаў і па кампазіцыі здаюць раздзел спецыяльнасці "выкананне праграмы" або "выкананне ўласных твораў". Пры атрыманні адзнакі "пяць" яны вызваляюцца ад наступных экзаменаў; пры атрыманні адзнакі "чатыры" або "тры" яны здаюць усе астатнія экзамены. Да ўдзелу ў конкурсе на аддзяленне кампазіцыі дапускаюцца толькі абітурыенты, якія атрымалі на раздзеле экзамена па спецыяльнасці (выкананне ўласных твораў) адзнаку "чатыры" або "пяць". Паступаючыя на спецыяльнасць "Музыказнаўства", якія маюць дыплом з адзнакай або медаль, вызваляюцца ад экзамена па мове і літаратуры пры атрыманні адзнак "пяць" па ўсіх раздзелах спецыяльнасці.

Выпускныя экзамены ў Рэспубліканскім вучэбным комплексе гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі з'яўляюцца ўступнымі ў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі. Выпускнікі гімназіі-каледжа ўдзельнічаюць у агульным конкурсе па выніках адзнак, атрыманых на выпускных экзаменах.

Прыём на падрыхтоўчае аддзяленне спеваў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з "Приёмными требованиями по специальным дисциплинам для поступающих в Белорусскую государственную академию музыки", зацверджанымі Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. Абітурыенты здаюць адзін экзамен па спецыяльнасці. Экзамен складаецца з двух раздзелаў, кожны з якіх ацэньваецца асобнай адзнакай: першы раздзел — у класе, другі — у канцэртнай зале.

Прыём на падрыхтоўчае аддзяленне кампазіцыі ажыццяўляецца па рашэнні прадметнай экзаменацыйнай камісіі па выніках адзнакі прадстаўленых музычных твораў.

Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на экзаменах па ўсіх формах навучання залічваюцца:

воіны-інтэрнацыяналісты;

дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў; дзеці з сем'яў загінуўшых (памерлых) ці стаўшых інвалідамі ў час праходжання вайсковай службы або працы ў складзе савецкіх войск на тэрыторыях дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памерлых) у мірны час пры праходжанні вайсковай службы;

інваліды I і II груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі;

асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 18 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС";

суайчыннікі з іншых краін па рэкамендацыях беларускіх суполак і навучальных устаноў замежжа на спецыяльна выдзеленыя месцы.

Пераважнае права на залічэнне па ўсіх формах навучання пры аднолькавай агульнай колькасці балаў маюць: інваліды III групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў; асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 19, 20, 23, 24, 25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС"; звольненыя ў запас ваеннаслужачыя, якія маюць ільготы, устаноўленыя заканадаўствам і рэкамендацыі воінскіх часцей; асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў; выпускнікі Рэспубліканскага комплексу гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, атрымаўшыя на выпускных экзаменах адзнакі "пяць" па ўсіх раздзелах спецыяльнасці; абітурыенты, атрымаўшыя больш высокі бал за выкананне праграмы або ўласных твораў. У выпадку роўнасці балаў і аднолькавых балаў, атрыманых за выкананне праграмы або ўласных твораў, перавагай пры залічэнні карыстаюцца абітурыенты, якія атрымалі больш высокі бал на экзамене па мове і літаратуры (пісьмовы пераказ).

Абітурыенты прадстаўляюць у прыёмную камісію наступныя дакументы:

заява, дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале, 6 чорна-белых фотакартак памерам 3 на 4 см, медыцынская даведка па форме 086У (абавязковым з'яўляецца праходжанне ўсіх прышчэпак), даведка ўрача-фаніятра (спецыяльнасці "Спевы", "Харавое дырыжыраванне"), пашпарт і дакумент аб дачыненні да воінскай павіннасці (прадстаўляюцца асабіста), дакументы, якія пацвярджаюць перамогі ў музычных конкурсах у арыгінале.

Прыём дакументаў — з 16 чэрвеня па 30 чэрвеня.

Кансультацыі для абітурыентаў — з 28 па 30 чэрвеня.

Уступныя экзамены — з 1 па 15 ліпеня, на оперна-сімфанічнае дырыжыраванне — з 20 верасня.

На перыяд уступных экзаменаў абітурыентам прадстаўляецца інтэрнат (з 28 чэрвеня) з аплатай кошту пражывання.

Уступныя экзамены на завочнае навучанне — з 20 верасня.

Азнаёміцца з правіламі прыёму ў акадэмію і атрымаць кансультацыю па іншых пытаннях можна па адрасе: **г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30, Беларуская акадэмія музыкі.** *Тэл. прыёмнай камісіі 227-82-40 (з 16 чэрвеня).*

МАГІЛЁЎСКІ ПЕДАГАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ МУЗЫКІ

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ

на 1998-1999 навучальны годпа дзённай форме навучання

па спецыяльнасцях:

Інструментальнае выканаўства

(*Спецыялізацыі:* фартэпіяна, флейта, габой, кларнет, валторна, труба, трамбон, туба, ударныя інструменты, баян, акардэон, цымбалы, домра, балалайка)

Харавое дырыжыраванне

Пачатак заняткаў — 1 верасня 1998 года

Іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам.

Адрас педагагічнага факультэта Беларускай акадэміі музыкі: 212030, г. Магілёў, вул. Крыленкі, 12

Тэлефоны: 25-28-14; 22-54-75.

Вам кепска? Набірайце 03!

ХУТКАЯ ДАПАМОГА — ПАНАЦЭЯ АД УСІХ ХВАРОБ?

ВЫ ВЕДАЕЦЕ свайго ўчастковага ўрача ў твар? Калі вы не хранічна хворы і не прыкаваны да абрыдлага ложка, то адказ можна прагназаваць з дакладнасцю: не і яшчэ раз не! Але не спяшайцеся намацваць за пазухай камень, не спяшайцеся пацэліць ім у нашу сістэму аховы здароўя. Не спяшайцеся. Яна і так кволая. "Лекар-збавіцель, вылечыся сам!" — патрабаваў хтосьці з мудрых. І што ён меў на ўвазе? Але дасведчаныя людзі сцвярджаюць зараз, што асобныя паліклінікі дзяржавы нашай ўкамплектаваны медперсаналам на 40—50 працэнтаў. Чалавек шукае, дзе лепей, дык чаму ўрач — не чалавек? Адсюль, відаць, і нормы на ўчастковага "знахара" — дзве тысячы патэнцыяльных пацыентаў (!). Азадачыць бы такой нагрузкай любога закардоннага хатняга доктара (пад штодзённым платным, кантролем якога адна, дзве, ну няхай сабе і тры сям'і), не выйшаў бы з прастрацыі і да скону дзён сваіх, а нашым "айбалітам" усё па плячы. Праўда, лячыць такую прорву, сціпла кажучы, немагчыма. Больш-менш паверхнева пазнаёміцца ды стогны пра ўсе болькі выслухаць — і то месяца-другога не хопіць. Ну і няхай сабе. Звыклыя мы да самага ненавязлівага сервісу. Ходзім у паліклінікі самі, выстойваем пакутлівыя чэргі за дэфіцытнымі талонамі, жвава і зацікаўлена абмяркоўваем праблемы вяла цякучай шызафрэніі і заўчаснага маразму ў не менш доўгіх і самотных чэргах да ўрачоў, паддобрываемся, зазіраючы ім у вочы, энергічна лечым не тое, што баліць, нясём дахаты стосы рэцэптаў, аптэчнае атаварванне якіх пагражае назаўсёды адмовіцца ад бульбы з салам і перайсці на эпізадычнае, але надта прэстыжнае ўжыванне эфералгана і сальпадэіна...

Самы шчыры сябра, перад тым, як кульнуць чарку, ніколі не забывае пра аптымістычны заклік: "Не хварэць!" Ён мае рацыю. Не хварэць, родныя пенсіянеры! Не хварэць, адзінокія бабулькі! Не хварэць!

Аднак не слухаецца шматмільённы састарэлы электарат. Век гаруе і смаку не чуе. Бабулькі, стомленыя "ўсебаковай увагай улад", загнаныя ў кут радыяцыяй і забруджанай пітной вадой, з надзеяй пазіраюць у бок могілак. Копяць не на лекі — на труну. Перад раніцай, хапаючыся за сэрца, дрыжачым пальцам набіраюць "03". Яны таксама маюць рацыю. "Хуткая" ў адрозненне ад дзетак родных, якім да састарэлай маці дабірацца як на край свету белага (з Шабаноў на Паўднёвы Захад), прыедзе сапраўды хутка. І ўкол бясплатны зробіць, і таблетку-другую ля ложка пакіне. А калі, не дай Бог, пагоршала — дык і ў бальніцу бліжэйшую завязе. А там хоць які, а ўсё ж догляд, ды і за харчаванне грошай пакуль не патрабуюць. Вось і не змаўкаюць суткамі дыспетчарскія тэлефоны хуткай і неадкладнай медыцынскай дапамогі. Амаль палову гэтых тэлефанаванняў можна было б і скасаваць, калі б раённыя паліклінікі працавалі бездакорна, як мае быць...

— Штогод у сярэднім у нас больш за 500 тысяч выклікаў, — тлумачыць галоўны ўрач Мінскай станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Віталь Елісеевіч Ціцішын. — А кожны выезд брыгады, калі яна спецыялізаваная, каштуе дзяржаве больш чым з паўмільёна. У першую чаргу дапамогі патрабуюць людзі з сардэчна-сасудзістымі хваробамі (дзесьці 20 працэнтаў), у асноўным састарэлыя, 15 працэнтаў прыпадае на выезды да дзетак, 5 — выклікі ў выніку аварый ці траўм, усё астатняе — раптоўныя захворванні, выклікі несапраўдныя і безвыніковыя (скажам, прыехала брыгада, а боль у пацыента нечакана прайшоў)...

Кручуся па будынку станцыі, знаёмлюся з урачамі, радуюся, што Алена Белавусава, намесніца галоўнага, без перашкод дазваляе праехацца па выкліках з каардыялагічнай брыгадай N 11. "Праўда, "рафік" там старэнькі, ну ды што зробіш"...

Еду ў якасці, так бы мовіць, санітара. Вось толькі халацік белы не па памерах, трашчыць у рукавах — ды не бяды! Пакуль ёсць вольная хвілінка, "нагружаюся" інфармацыяй. Статыстыка такая: у сталіцы 112 кругласутачных брыгад неадкладнай медыцынскай дапамогі, з іх 55 — спецыялізаваных — 18 кардыялагічных, 4 — рэанімацыйныя, 2 — траўматалагічныя, брыгады неўралагічныя, педыятрычныя, кансультацыйныя... Карацей, 350 высокакваліфікаваных урачоў, 80 сумяшчальнікаў... 170 аўтамабіляў "Мінсанаўтатранса"... Для таго, каб у час дабраліся яны да хворых — сем раённых падстанцый у горадзе, адна галоўная з дыспетчарскай службай... Урачы працуюць не па 12 гадзін, а ў адпаведнасці з дамоўленасцю калектыву з мясцовым прафкамам — па сутках...

Але — хопіць лічбаў! "Нашу" брыгаду тэрмінова выклікаюць! У жанчыны штосьці з сэрцам. Маласямейка на вуліцы Казлова.

Праціскаюся ў салон і здзіўляюся: "Як, адны жанчыны?!" Чую пакрыўджанае вадзіцельскае: "Ну а мы з табой?" Канстанцін Аляксандравіч — мужчына салідны, мажны і ўдумлівы. Але галоўная тут — Ларыса Пяцеліна. Урач-кардыёлаг, у "хуткай" больш за 20 гадоў. Акрамя Ларысы Аляксандраўны і "яго са мной" — дзве смяшлівыя фельчаркі — Тамара і Галіна.

Не паспелі скрануцца, як ужо прыехалі. "Што тут дабірацца, — нервуе Аляксандравіч. — Рукой дацягнуцца. Праблема ў іншым. На большасці пад'ездаў ніякай інфармацыі, нумароў нават няма. Як вам тую кватэру шукаць? А калі б ноччу!" Пяцеліна супакойвае: маўляў, ведае жанчыну, неаднойчы тут бывалі. Цягну па лесвіцы за ўрачамі электракардыёграф. Адчыняе сын Ніны Іванаўны, якую з раніцы ўклаў у ложак высокі ціск і галаўны боль. Потым кроў носам пайшла.

— Чаму рызыкуеце гэтак? Чаму пазванілі позна? — хвалюецца Ларыса Аляксандраўна. — Вы ж пасля інсульту! А чакаеце да апошняга.

— Ды неяк сорамна турбаваць вас было...

Сын бурчыць штосьці пра ўчастковых урачоў, якіх не дачакацца, пра тое, што, каб маці ў бальніцу на тэрміновае лячэнне пакласці, перасварыцца з усімі медыкамі трэба.

Зрабіўшы дыягностыку, скінуўшы ўколамі ціск, наш кардыёлаг падводзіць вынік: "Гіпертанічны крыз! Тэрмінова ў бальніцу!"

Вязём Ніну Іванаўну на Кіжаватава, у клінічную бальніцу хуткай дапамогі. Быў тут якраз учора. Пазнаёміўся з Віталем Лунеўскім — намеснікам тутэйшага галоўнага ўрача. Расказваў той, што амаль на двухмільённы горад толькі адна бальніца неадкладнай дапамогі, нормы ўтрымання хворых перакрываюцца пастаянна. І не віна тут службы хуткай дапамогі. Дастаўляе яна пацыентаў ва ўсе без выключэння медыцынскія ўстановы сталіцы, сюды ж — толькі ў надзвычайных выпадках. Проста любім мы хварэць, а лячыцца як след, палюдску, неяк не прызвычаіліся...

Пакінулі мы Ніну Іванану. Ад'язджаем, бо па сувязі перадаў дыспетчар: чарговы выклік! Але не азначае гэта, што на далейшы лёс жанчыны-гіпертоніка "хуткая" забудзецца. Квіток аб стане яе далейшага здароўя абавязкова будзе перададзены на галоўную станцыю. Правіла жалезнае, бо не колькасцю выездаў тут выхваляюцца, а іх дзейснасцю. На сто пісьмовых удзячнасцяў — толькі некалькі скаргаў. І тыя пад вялікім сумневам. Прыляцела аднойчы спецбрыгада да жанчыны адной (дачка са слязьмі ў голасе выклікала па тэлефоне: прыязджайце, памірае!), а тая — ні сном, ні духам. Дачка, аказваецца, "хуткую" да кацяняці хворага з лініі сарвала, падлячыць хацела. Ну, безумоўна, незадаволенай засталася. Вось такія жартачкі жыцця...

...З вуліцы Калектарнай брыгаду кардыёлагаў таксама выклікалі не па профілю. Да 60-гадовай Тамары Іванаўны "хуткую" запрасіла чуллівая суседка: "Гляджу, дрэнна ёй, думала — з сэрцам штосьці"... Зашмальцаваная аднапакаёўка, сляды колішняга пажару на шпалерах і аконных рамах. "Дачка здуру падпаліла", — тлумачыць з канапы Тамара Іванаўна. У такіх умовах і здаровы захварэе. Наш урач прыступае да агляду. Сэрца, ціск — усё ў норме. Агульны дрэнны стан — з-за даўняй траўмы пазваночніка. Пяцеліна, зрабіўшы ўсё ад яе залежнае, тлумачыць:

— За суткі па 14—16 выклікаў і пастаянна асобныя з іх не маюць сэнсу ці не патрабуюць неадкладнасці. Звоняць іншым разам: "Ратуйце, сэрца адмаўляе!" Прыязджаем, а там дробязь якая-небудзь. Пытаемся: "Чаму гвалт падымаеце з-за тэмпературы невысокай?" А нам тлумачаць: "А каб хутчэй прыехалі, бо ў старасці і пагаварыць няма з кім!" Вось дзяўчаткі мае і размаўляюць з такімі бабулькамі па начах, калі ўжо ад стомы з ног валяцца. Але прыязджалі і прыязджаць будзем, бо дзе тая гарантыя, што сапраўды не смерць побач ходзіць? Крыўдна, безумоўна, бывае, што той, каму тэрміновая дапамога патрэбна, да апошняга цярпіць, а да п'яніцы ці бамжа іншым разам з сірэнай ляцім. Разумею, што чалавек, які такому "кліенту" брыгаду выклікае, не разбірае, ап'яненне гэта ці ўдар сардэчны. Але ўсё роўна крыўдна...

Без маёй "падтрымкі і дапамогі" брыгада кардыёлагаў з 9 раніцы паспела выехаць на два выклікі, абодва туды, дзе сапраўды чакалі і спадзяваліся — арытмія сэрца, і таксама ў састарэлых жанчын. Усё, дзякуй Богу і ўрачам, абышлося, не спазніліся...

Зараз час амаль абедзенны. Але пакуль не да адпачынку. Заскочылі на станцыю папоўніць запас лекаў, аднаразовых шпрыцоў. Затрымаліся ненадоўга. "Адзінаццатая, на выезд! Дрэнна мужчыне!" — падганяе трывожны голас дыспетчара. Называецца час рэгістрацыі выкліку, фіксуецца момант нашага выезду. На ўсё ідуць лічаныя хвіліны, а дабрацца да месца трэба за пятнаццаць. Гэта дапушчальны максімум... Імчым.

Вадзіцель наш уключае міргалку, а перад перакрыжаваннямі — яшчэ і сірэну. Але хуткасці, як ні дзіўна, такая надзвычайнасць не дадае. Дарогі ніхто не саступае. Аляксандравіч лаецца ўголас. З лаянкі гэтай зразумела, што мінскі "вадзіла" — яшчэ той штукар і нахабнік, што калі па горадзе картэжы высокіх гасцей возяць, даішнікі ўсіх па дарозе да абочын зганяюць, ледзьве аварыйныя сітуацыі не ўтвараючы, а з хуткай дапамогай сітуацыя адваротная. Сорам усе згубілі, трасца на іх. Чужое не баліць...

Няміга. Мітуслівы мурашнік перадабедзеннага гарадскога жыцця. Зялёны муражок за Петрапаўлаўскай царквой. Ляжыць на спіне, рукі уроскідку, нехта барадаты. Ідылія амаль што. "Ну ці ж бываюць у сардэчнікаў такія твары чырвоныя", — уздыхае кардыёлаг. "Ды колькі разоў яго ўжо забіралі", — прыглядаецца вадзіцель. Маладзенькія фельчаркі пырскаюць смехам. І грэх, і смех, сапраўды. Набраўся барадаты, як Гапон сліў, і адпачывае сярод бурлівага жыцця. Падымаем праспіртаванае цела. Апрытомнела яно як быццам, прачнулася, мармыча штосьці. Маўляў, мастак я, няўжо не ведаеце, станцыю метро імя Коласа афармляў, а вы мяне ў пастарунак. "Ды не ў пастарунак, а ў клініку бліжэйшую" — зноў уздыхае з прыкрасцю Пяцеліна і ў мой бок дадае: "Вось менавіта такія час і адымаюць. Але ж не кінеш, раптам сэрца сапраўды схопіць...". Зноў праверка ціску, а потым — укол. Дастаўляем паважанага і шаноўнага Генадзя Лаўрэнцьевіча ў першую гарадскую бальніцу. "Яшчэ не бяды, — каменціруе наш вадзіцель, — ціхі адносна. А бываюць такія п'янтосы, што і ў машыну ледзь зацягнеш, ды яшчэ і з нажом да ўрача кідаюцца..."

Гучная сувязь працуе ў салоне бесперапынна. Муж збіў жонку... "Траўматалагічная, на выезд!" Высокая тэмпература ў нованароджанага... Сардэчны прыступ... Зноў сямейная бойка з цяжкімі траўмамі... І так кожны дзень, кожную ноч, многія гады запар. Акумулюе "хуткая" чужы боль, ірвецца на выратаванне. Банальна, але так...

Перад урачом ды настаўнікам калісьці ў першую чаргу шапкі скідвалі, да пояса схіляліся. Зараз падыходы крыху іншыя: "слаба абароненая частка насельніцтва". Толькі і чуеш ад улад ва ўсіх краінах СНД: чаго вы патрабуеце, шахцёры, будаўнікі, метрапалітэнаўцы, гляньце, як урачы з педагогамі жывуць. Дык, мабыць, хопіць спекуляваць ужо гэтым. Але, відаць, чакаць слабаабароненым недачакацца...

У больш-менш прыстойнай дзяржаве ці патрэбна служба неадкладнай медыцынскай дапамогі? Не, была яна ў свой час і на Захадзе, але з ростам дабрабыту трансфармавалася ў вузкаспецыфічную надзвычайную службу, накшталт амерыканскай "911". Прэрагатыва яе — выратаванне людзей пры стыхійных бедствах, бандыцкіх нападах, карацей, у сітуацыях неардынарных і непрадказальных. А тамтэйшая сістэма аховы здароўя зрабіла такі крок наперад, што нам толькі і застаецца ўслед за ёй дыхаць пылам неажыццёўленых спадзяванняў. У іх — дасканалая дыягностыка, магутная прафілактыка захворванняў, эфектыўнае іх лячэнне ў зародкавым стане, падмацаванае страхавым полісам, процьма хатніх урачоў, запрашэнне якіх у дзесяць разоў таннейшае, чым выклік надзвычайнай дапамогі, здаровы лад жыцця ў мэтах элементарнай грашовай эканоміі ("Яны там усе здаровыя, як дубы! — здзіўлена смяецца сябар пасля закардоннай паездкі. — Згуба часу на хваробы пры такім жыцці — рэч проста недаравальная!")... У нас — дэфіцыт шчырасці і спачування, выкліканы дэфіцытам грашовай падтрымкі, блуканні ў пошуках танных лекаў і неаднаразова згубленай у раённай паліклініцы асабістай медыцынскай карты, выбіццё бальнічных лістоў, спадзяванні на экстрасэнсаў і на тую ж хуткую дапамогу, як на выратавальную ісціну ў апошняй інстанцыі, ды плюс упэўнены рух да поўнай нацыянальнай самаліквідацыі ("Жыць у нашай краіне яшчэ так-сяк можна, хварэць — не дай Бог!").

Ох і абурацца ж будуць медыцынскія чыны ўсіх рангаў: "Ды ўсё ж для таго толькі й робім, каб здароўе ваша падтрымаць. Вучым урачоў, выпускаем. Лекі за апошнія кроўныя за мяжой вышукваем. З чарнобыльскай навалай, сіл не шкадуючы, змагаемся! А вы мімаходзь, у глыбіню не зазірнуўшы, усе захады ачарнілі ды заплямілі!" Я дык і згаджуся, відаць, з такімі "аргументамі", бо прызвычаіўся ўжо. А пенсіянераў як пераканаеце, што ўсё добра ў нас ды гладка? А перасяленцаў-чарнобыльцаў, асобныя з якіх так і не зведалі, што такое поўны медагляд, як за сабой паведзяце? А бабулек адзінокіх? Ну, хаця б тую 63-гадовую Валянціну Сцяпанаўну, да якой на праспект Машэрава пры мчаліся за лічаныя хвіліны. Ёй бы зараз з такім ціскам ды з ныркай хворай у бальніцы ляжаць на лячэнні планавым. Дык не, на "хуткую" ўсе спадзяванні. Балазе, што тая іх і не падманвае...

Развітваюся з адзінаццатай брыгадай на станцыі. Той працаваць яшчэ вечар ды ноч усю. Зноў еду па выкліку, толькі цяпер ужо з рэанімацыйнай брыгадай Ігара Рубінштэйна, які ў "хуткай" таксама больш чым тры дзесяткі год.

— Самае страшнае, што можна ўявіць — гэта пахаванне чалавека, — даводзіць ён мне па дарозе. — А ты ведаеш, колькі інфарктаў па Мінску ў год? Паўтары тысячы! Ці ж паспееш да ўсіх, калі смерць раптоўная, нечаканая! Чаму раптоўная, напэўна, ведаеш. У нашых людзей такія ўжо адносіны да здароўя ўласнага. Ні сябе падтрымаць, ні іншых... Хто зможа аказаць першую дапамогу пры няшчасным выпадку, сапраўды карысную, каб мы паспелі прыехаць і выратаваць? Ды не больш за сотню чалавек на горад!

"Хуткая" нясецца па праспекце Скарыны. У адным з дамоў па вуліцы Каліноўскага памірае жанчына. Той рэдкі выпадак, калі рэанімацыйную брыгаду выклікалі іх калегі — урачы "хуткай". З міргалкай і сірэнай, ад якіх, зрэшты, зноў ніякага толку, дабіраемся за 9 хвілін. Муж жанчыны, яе суседка тлумачаць, што прыходзіў участковы ўрач да хворай, параіў нейкія таблеткі, тая выпіла і праз час адчула сябе надзвычай дрэнна, пачырванела, страціла прытомнасць. Суседка выклікала "хуткую". Тая зрабіла ўсё, што змагла, але стан не палепшыўся, жанчына задыхалася. Выклікалі рэаніматараў. А пакуль тыя ехалі, жанчына апрытомнела, акрыяла крыху. Перастрахоўка першай брыгады? Так, але ўсім бы так перастрахоўвацца! І ў гэты раз урачы спрацавалі як мае быць.

Рубінштэйн, мераючы пакой вялікімі крокамі, супакойвае расхваляванага мужа, які ўсё скардзіцца на ўчастковага: "Ніхто не хацеў кепскага! Класічная алергічная рэакцыя на таблеткі"...

Напрыканцы рабочага дня працягваю гаворку з галоўурачом "хуткай" В. Ціцішыным.

— Віталь Елісеевіч, наколькі ведаю, вы яшчэ і вядучы спецыяліст па справах рэспубліканскай хуткай меддапамогі. У Мінску гэтая служба дзейнічае бездакорна, а на перыферыі?

— У раённых і абласных цэнтрах Беларусі справа пастаўлена няблага. У Гродзенскай, Віцебскай абласцях, напрыклад. Штаты ўкамплектаваныя. З лекамі асаблівых праблем няма. А вось на вёсцы... Там у асноўным фельчарская дапамога на "уазіках". Але, акрамя іх, які яшчэ аўтамабіль па сельскіх дарогах пройдзе? Думаю, што і кваліфікаваныя спецыялісты праз нейкі час прыйдуць у раённыя паліклінікі, мясцовыя службы хуткай дапамогі . Гомельскі медінстытут на гэта працаваць пачаў. Як бы цяжка ні было з фінансамі, аднак справа рухаецца. І ў сталіцы, і на месцах.

— Асобныя машыны мінскага парка хуткай дапамогі яўна састарэлі. Ды і з абсталяваннем, відаць, не ўсё добра. Як тут выкручваецеся?

— Так, на "рафікі" асаблівых спадзяванняў ужо няма. Прыбалтыка іх больш не выпускае. Штогод імкнёмся 25—30 машын замяніць. Расійскімі маркамі, "фордамі", якія ў Мінску выпускаюцца. Грошы для гэтага выдаткоўваюць і гарвыканкам, і міністэрства наша. Гуманітарная дапамога ідзе. Летась закупілі 15 аўтамабіляў. Калі б і сёлета прыдбаць 25 "фордаў", былі б на кані... З абсталяваннем, сапраўды, шмат галаўнога болю. Вымушаны купляць яго ў Расіі. І дарагое яно, і не вельмі якаснае. Узяць хоць б той танометр (для вымярэння ціску). Пастаўляе іх Санкт-Пецярбург. Можна ў Пінску браць (мясцовы завод выпускае такія прыборы), але там яны на батарэйках, а значыць для нашых патрэб надта нязручныя... Вельмі дапамагло акцыянернае таварыства "ІТЭК", якое пастаўляе нам кардыёграфы — збірае і наладжвае з імпартных дэталяў. У пачатку года ўсе нашы брыгады гэтым абсталяваннем (дарэчы, вельмі танным) былі ўкамплектаваны. Менавіта такога камерцыйнага супрацоўніцтва і не хапае іншым разам... Элементарную пласцікавую сумку для ўрача купляць вымушаны ў Прыбалтыцы. А ў нас жа свой завод ёсць — "Тэрмапласт"...

Галоўная станцыя неадкладнай зусім блізка ад нашай рэдакцыі, па Захарава, 52. Заканчваю гэты матэрыял, а за рэдакцыйным акном разпораз "праскокваюць" машыны з лічбамі "03"... У гэтым свеце пастаянна камусьці блага...

Яўген РАГІН

Танцуюць дзеці

Танцавальны калектыў "Мазаіка", створаны пры Крычаўскім Доме дзіцячай творчасці, ужо выступаў са сваімі нумарамі перад гарадскімі і сельскімі жыхарамі.

Фота Валерыя БЫСАВА, БЕЛТА

Шмат воблікаў... "сцяга"

З 5 чэрвеня 1908-га па 25 кастрычніка 1923 года ў Вільні выходзіла газета "Вольны сцяг", што з'яўлялася органам Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі. Праўда, "Вольны сцяг" — назва ў пэўнай ступені афіцыйная, бо з-за пастаянных праследаванняў польскіх уладаў часта даводзілася мяняць яе, а ў выніку "ВС" быў і "Нашым сцягам", і "Паднятым сцягам", і "Сцягам", і "Сцягам народа", і "Вольным сцягам", і "Сцягам волі". І нават называўся "Воляй народа". Газета вялікую ўвагу надавала праблемам нацыянальнага жыцця, шырока асвятляла сялянскія пытанні, а таксама дзейнасць Беларускага пасольскага клуба. Крытыкавала марудныя дзеянні па дулучэнні да БССР беларускіх зямель на Усходзе, пісала пра нацыянальнае і культурнае будаўніцтва ў Савецкай Беларусі. Былі надрукаваны драматычныя абразкі М. Гарэцкага "Чырвоныя ружы", верш М. Чарота "Чырвоныя вяснянкі" з даведкай пра аўтара, артыкулы А. Міцько "Агульналюдскія матывы ў творчасці Янкі Купалы", А. Дыліса "Якуб Колас як нацыянальны паэт", кароткія рэцэнзіі на аповесць Я. Коласа "У палескай глушы" і зборнік "Беларускі лірнік" У. Тэраўскага, асобныя артыкулы пра рукапісную спадчыну М. Багдановіча, пра архіў і бібліятэку Е. Раманава. Дарэчы, газета ўдзяляла немалую ўвагу прапагандзе друкаванага слова — рэгулярна прысутнічала на яе старонках рубрыка "Бібліяграфія". Пад псеўданімам Суліма публікаваўся ў "Вольным сцягу" У. Самойла.

Рэзчык з Лагойска

Работы рэзчыка па дрэве з Лагойска Андрэя Скавінскага здзіўляюць сваёй філіграннасцю. Нават цяжка ўявіць, як з суцэльнага кавалка дрэва можна стварыць кісяю найтонкіх узораў. Прыродны талент Андрэя і вучоба ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя Глебава дазволілі яму стаць выдатным спецыялістам. Ён член Лагойскага народнага клуба майстроў і абавязковы ўдзельнік выстаў.

На здымку: Андрэй Скавінскі са сваімі работамі.

Фота Яўгена КАЗЮЛІ, БЕЛТА

ХУТКІЯ НОГІ

(Працяг. Пачатак на стар. 8—9)

На гэты раз прытомнасць да яго не вярталася доўга.

А калі вярнулася, першае, што ён убачыў, было неба: блакітнае і бяздоннае, яно калолася ў вочы. У небе, высока-высока, кружыла шмат птушак, якія без парадку, уразлад, як каму хацелася, махалі крыллем.

І яшчэ што яго здзівіла — гэта ціша. Хуткія Ногі падумаў, што супляменнікі, падзяліўшы і ўпакаваўшы маманта, пайшлі са здабычаю ў селішча, хацеў паглядзець, дзе яны, аднак, навучаны горкім вопытам, ужо не падхапіўся з месца, а толькі крышку павярнуў галаву. І тады ўбачыў, што паляўнічыя яшчэ тут, а цішыня стаіць таму, што ўсе засяроджана заняты працаю — разбіраюць гару: мужчыны, абступіўшы маманта з усіх бакоў, рэжуць яго на кавалкі і складаюць іх у заплечныя торбы — плечакі, у скураныя мяшкі, кладуць на валакушы.

Ад маманта ўжо амаль нічога не асталося — толькі бялеюць, гэтак жа, як і біўні, абрэзаныя косці, на якіх няма мяса. Ужо не пазнаць, што гэта зусім нядаўна быў мамант — на зямлі цяпер ляжыць адна гара касцей, раскіданых у беспарадку.

Разбіранне маманта, ён разумее, ужо заканчваецца. Кіруе ўсім, канечне ж, Тым — да яго падыходзяць, каб нешта спытаць, ён сам знаходзіць іншых, каб нешта загадаць ім.

Словам, яны разбіраюць маманта без Хуткіх Ног! Тым, Тым, а не ён, герой гэтага палявання! Зірні, як ганарыста глядзіць той на ўсіх, — нібыта збоку любуецца самім сабою. А ён нічога не можа зрабіць — не можа ні паспрачацца з ім, ні хоць бы запярэчыць. Ляжыць вось тут, між валуноў, баіцца нават паварушыцца, каб не самлець. А на яго ўсе забыліся, махнулі рукою — ніхто і не падышоў. А гэта ж ён, ён, ён, Хуткія Ногі, уваткнуў першую дзіду ў бок гіганта, ён, толькі ён разрэзаў яму жывот ды і падаючы мамант праткнуўся на яго ж дзіду. А ўся ўвага і павага Тыму. Быццам усё гэта яго работа. Быццам гэта ён паваліў гару.

Як горка і балюча ляжаць вось тут аднаму, забытаму без ног!

Тым як усё роўна пачуў гэта. Ён падазваў да сябе некалькіх мужчын, паказаў ім рукою ў ягоны бок, нешта сказаў. Мужчыны пайшлі да сваіх плечакоў і валакуш, а ён, узяўшы ў рукі ягоную дзіду, якая ўсё яшчэ стаяла між мамантавых касцей, накіраваўся ў яго бок. Хуткія Ногі не разумеў, чаго Тым ідзе сюды, але нейкім невядомым чуццём адчуваў, што нічога добрага чакаць яму не даводзіцца.

— Я сказаў ім, што ты памёр, — падышоўшы, буркнуў Тым.

Хуткія Ногі нічога яму не адказаў. Ён моўчкі, не хаваючы сваёй непрыязнасці, глядзеў у Тымавы вочы і думаў: колькі ж і ў іх злосці і нянавісці!

— Хочаш, я памагу табе памерці? — нібы павесялелы ад гэтай думкі, прапанаваў Тым.

— Маёю дзідаю?

— А яна ўжо мая! — усміхнуўся ён і ў навісе лёгка перахапіў дзіду рукою.

Мамантаў бівень быў увесь у крыві, нібыта яго толькі што выламалі з чэрапа і яшчэ не паспелі абцерці.

— Ну што, Хуткія Ногі, няма ўжо хуткіх ног? — зларадніча Тым.

Дзіда ўжо завісла над ім — якраз у тым месцы, дзе моцна, устрывожана стукала яго сэрца. Хуткія Ногі разумеў, што Тым не жартуе. Спачатку ён знайшоў і моцна сціснуў даланёю крамянёвы нож, але той жа час вызваліў руку — што ён, бязногі, можа зрабіць яму нажом?!

І калі Тым, крыху счакаўшы, нібы молячыся Некаму, напружыўся і, сабраўшы ў адну руку ўсю сілу, моцна ўдарыў у яго дзідаю, Хуткія Ногі імгненна адбіў яе рукою, і дзіда глыбока ўторкнулася ў зямлю — побач з ягоным сэрцам, прыбіўшы да дзёрну крысо адзення.

Тым не спяшаўся выцягваць яе з зямлі. Стаяў, маўчаў, думаў, глядзеў туды, дзе ўдзяўбнулася дзіда. Пасля падняў вочы, паглядзеў на неба. Потым спакойна сказаў — як нешта даўно вырашанае:

— Усё роўна ты памрэш, — і паказаў на неба. — Яны табе памогуць.

У небе кружылі вораны, груганы. Іх, здаецца, яшчэ пабольшала. Тым памаўчаў, падумаў, пасля азірнуўся на астаткі маманта і дадаў, растлумачваючы сваю ранейшую думку:

— Думаеш, ім маманта хопіць? Не! Аб'ядуць яго косці — на цябе ўсе зляцяцца. Усе! А ты ж ад іх і не ўцячэш, і не абаронішся...

Рашуча ўхапіўся абедзвюма рукамі за дзіду, пахітаў яе ва ўсе бакі, выцягнуў з зямлі і з ёю, спяшаючыся, пайшоў прэч. Ужо адышоўшыся крыху, павярнуўся і нямоцна крыкнуў яму:

— А Войсе я скажу, што цябе растаптала гара.

Паляўнічыя ўжо збіраліся ў зваротны шлях. Яны закідвалі за спіну цяжкія, наладаваныя мясам плечакі, спрабавалі, ці зручна будзе цягнуць нагружаныя валакушы. Тыя, што ўжо былі гатовы, шукаючы, выбіраючы сабе сцежку, паціху выходзілі ў дарогу, а за імі выпраўляліся іншыя.

Тым стаяў і чакаў, пакуль усе лаўцы стануць у гэты доўгі шэраг, які ўжо расцягнуўся на ладную адлегласць, а тады і сам лёгка закінуў цяжкі мяшок за плечы, узяў у руку вяроўкі ад валакушы, паторгаў іх, нібы спрабуючы, ці парвуцца, і пайшоў услед за ўсімі.

Хуткія Ногі глядзеў услед Тыму, усім супляменнікам, што пайшлі ў стойбішча, і нейкае невыразнае пачуццё ўсё больш і больш авалодвала ім, вярэдзіла яго душу і думкі. Яму было і радасна, што пакуль застаўся жывы, але ж было і горка, прыкра і балюча, што свае людзі з Кургана так нядобра абышліся з ім — ніхто не падышоў да яго, ніхто не пакінуў яму хоць які кавалак мяса, не прапанаваў агню, які яны забралі з сабою і панеслі назад у стойбішча.

Яму тужліва было глядзець на гэты цуг знаёмых людзей, які ўсё змяншаўся і змяншаўся. Але пакуль ён бачыў людзей, было нібыта і спакойна — людзі ж тут, побач, ён іх бачыць, яны недалёка: здавалася, крыкні — прыбягуць, дапамогуць. Аднак пасля таго, як апошні паляўнічы знік, схаваўся за далёкім пералескам, калі ён адчуў усёю сваёю істотаю, што астаўся адзін, яго ахапіў неймаверны жах: цяпер ужо, што б з ім ні сталася, ніхто не прыбяжыць, ніхто яму не паможа, ніхто не абароніць...

Пакуль людзі былі навідавоку, ён нічога не чуў, нічога не бачыў вакол сябе — уся ягоная ўвага была занятая імі, скіравана на іх. І толькі калі яны зніклі з вачэй, заўважыў, што на асвежаванага маманта, на тое, што асталося ад яго, зляцелася дужа шмат груганоў — у небе, здаецца, амаль не засталося птушак. Яны ў адрозненне ад людзей, якія толькі што працавалі тут ціха, амаль нячутна, шумелі, крычалі, сварыліся між сабою, адпіхваючы лапамі і крыллем адно аднаго ад касцей.

Некаторыя груганы і адтуль, як яму здавалася вельмі зацікаўлена час ад часу пазіралі ў гэты бок — нібыта пасвілі яго, нібыта сачылі, ці на месцы ён, ці не ўцёк яшчэ. Яны пакідалі яго назапас, і ён ведаў, што Тым казаў праўду: як толькі справяцца з мамантам, адразу ж зляцяцца на яго...

А паміраць Хуткім Нагам яшчэ не хацелася.

Усяго дваццаць снягоў сустракаў ён і дваццаць разоў праводзіў іх вясною, калі гэтыя снягі скідваліся вадою. Але ж многія не дажывалі і да гэтага — паляванне забірала самых смелых мужчын са стойбішча. Лепшыя мужчыны-паляўнічыя — упрыгажэнне племені, але ж яны — і найпершыя ахвяры палявання: адных прапорвалі наскрозь сваімі рагамі насарогі, другія звяры адкусвалі ім рукі і ногі, і яны паміралі ад ран, трэціх растоптвалі маманты.

Амаль ніхто ў стойбішчы не дажываў да старасці — усе паміралі маладымі: давалі патомства і паміралі. Таму ў свае дваццаць снягоў ён сябе лічыў вельмі старым. Але ж паміраць яшчэ не хацеў.

Бачачы, што груганы ўсё яшчэ пазіраюць у яго бок, зразумеў, што трэба як найхутчэй выбірацца адсюль, з гэтай крушні.

Эх, ногі! Дзе ж вы, хуткія ногі?!

Ногі былі на месцы, яны ляжалі на зямлі, але памагчы яму ўжо нічым не маглі. Цяпер уся надзея была толькі на рукі.

Зараз ногі яму толькі заміналі — без іх, такіх вось, нерухомых, было б і прасцей, і зручней. Нічога, ён і цяпер не адмовіцца ад іх — усё роўна павалачэ, патрушчаныя, за сабою!

Аднак паўзці яму трэба якраз туды, дзе ляжаць ногі. Як іх адсунуць, прыбраць з дарогі? Як перавярнуцца самому? Успомніўшы, як трацію прытомнасць, калі рэзка падхопліваўся з месца, Хуткія Ногі зразумеў, што ўсё гэта дасца яму нялёгка.

Куды і як паўзці? Варта б зірнуць, што ў яго наперадзе, але ж для гэтага трэба перавярнуцца са спіны на жывот.

Разумеў, што без болю зрабіць гэта не ўдасца. І таму рашыў перавярнуцца адным махам — хай лепей пабаліць і мацней, але хай боль гэты будзе карацейшы.

І ён рэзка, у міг вока перавярнуўся на жывот.

І той жа момант зноў страціў прытомнасць.

Апрытомнеўшы, падняў галаву і ўбачыў, што наперадзе, між валунамі, ёсць вузкая шчыліна, па якой можна выпаўзці з крушні.

І Хуткія Ногі павольна, асцерагаючыся рэзкіх паваротаў, папоўз між камянямі. Паўзці было вельмі нязручна, бо кожны няпэўны рух адгукаўся нясцерпным болем у нагах.

Аднак ён, сціснуўшы зубы, усё ж не спыняўся, а калі і спыняўся, то ненадоўга, і поўз наперад — пакуль што ў адваротны бок, не туды, куды яму трэба. Калі выпаўз з валуноў, паступова — рэзка мяняць накірунак баяўся — пачаў заварочваць у той бок, у які пайшлі суродзічы.

Сонца неўзабаве знікла, а ён, ужо крыху прывыкшы да болю, усё поўз, поўз і поўз — яшчэ завідна за ім былі паляцелі некалькі груганоў, якія, крыху пакружыўшыся над ім, зноў вярнуліся на мамантавы косці, аднак Хуткія Ногі ўсё роўна спяшаўся як мага далей адпаўзціся ад іх.

Не памятае, ці спаў ён гэтую ноч — мусіць, усё ж драмаў, прыпаўшы да зямлі, правальваючыся ў неспакойны сон, але ж к таму часу, калі сонца зноў знайшлося ў тым баку, дзе стойбішча, Хуткія Ногі дапоўз да пералеску, за якім учора надвечар схаваўся апошні лавец.

Сцяжынку, па якой пайшлі дадому суродзічы, ён знайшоў адразу. Ды яе і шукаць не трэба было — суродзічы праклалі яе самі: утапталі нагамі зямлю, дзе ўзлахмацілі, а дзе прыгнулі траву валакушаю. Да таго ж паляўнічыя вярталіся ў стойбішча па тых жа самых слядах, якія пакінулі ідучы сюды, а таму пракладзеная сцяжынка ўжо нагадвала дарогу.

Успоўзшы на яе, Хуткія Ногі ўзрадаваўся — цяпер яму, ляжачаму, не трэба раз-пораз падымаць галаву і распазнаваць, ці туды паўзе: гэтая сцежка сама прывядзе ў роднае селішча.

Толькі вось цяпер адчуў, што галодны — яму вельмі хацелася есці. Пашукаў вачыма, павадзіў рукамі па траве, выглядаючы і выбіраючы, дзе могуць быць самыя смачнейшыя карані, узяў у руку нож — той, што пабываў у чэраве маманта: ён не сарваўся з почапкі і цяпер поўз разам з чалавекам, — накапаў каранёў, абцёр іх спачатку аб траву, а затым яшчэ пашморгаў па шкурцы на сабе і паснедаў.

І ўжо збіраўся паўзці далей, і ўжо ўпёрся локцямі ў зямлю, як раптам адчуў, што нешта яму замінае, муляе. Ён рукою дастаў з-пад локця нейкую костку, хацеў адкінуць убок, але, міжволі

зірнуўшы на яе, знямеў: гэта была тая яго забаўка, якую любіла слухаць Войха і якую ён згубіў калісьці на паляванні. Паляўнічы так узрадаваўся, што адразу ж узяў забаўку ў губы і пачаў даставаць з яе шум дрэў, шум ветру, шум дажджу, што шапаціць па траве. Гукі былі такія тужлівыя, што і ў яго самаго, як і ў Войхі, самі сабою пакаціліся з вачэй слёзы...

Не выпускаючы з рукі свісцёлкі-забаўкі, Хуткія Ногі з яшчэ большай настойлівасцю папоўз па ўтрамбаванай валакушамі сцежцы.

Двойчы ўзыходзіла і заходзіла сонца, і калі б у яго былі здаровыя ногі, ён бы за гэты час паспеў прыйсці ўжо ў сваё стойбішча. А так дапяў толькі да таго месца, дзе яны, яшчэ ідучы на паляванне, налавіўшы ў вялікай рацэ рыбы, сілкаваліся ёю. Што цікава, што лаўцы і вяртаючыся назад з набыткам, таксама перакусвалі тут, каля старога вогнішча. Зноў жа налавілі рыбы, зноў жа елі яе сырую і пяклі. Ён думаў, штонебудзь з ежы знойдзе пасля іх, але нічога не знайшоў — тут жа, як яны пайшлі, відаць, балявалі звяры і птушкі...

Падумаўшы так, падняў галаву, паглядзеў у неба. Там, хоць і было іх няшмат, але ўсё ж кружылі крумкачы — ці то прыляцелі ўслед за ім тыя, ад маманта, ці гэта ўжо новыя дзюбатыя шукаюць сабе здабычу. Але яны былі высока, і ён чамусьці іх не баяўся.

Зноў, выбіваючыся з сіл, папоўз наперад, капаючы на перакус карэнне і збіраючы мінулагоднія жалуды, што трапляліся яму на сцежцы.

Аднак цяпер часцей за ўсё на сцежцы трапляліся кветкі, якіх, ідучы на паляванне, ён чамусьці не бачыў — мусіць, таму, што тады ішоў, а не поўз і краскі былі далекавата ад вачэй. Цяпер жа яны самі кідаліся ў вочы. А гэтая, як жывая, тыцнулася яму прама ў губы — яе чамусьці абмінулі, не зачапілі валакушы і ногі лаўцоў.

І ён нават спыніўся — загледзеўся на яе, залюбаваўся ёю.

Яна была вельмі прыгожая, яркачырвоная, з вялікімі пялёсткамі, але яны былі настолькі вытанчаныя, што кветка не выглядала лапавухаю.

Якраз вось такую кветку ён убачыў зімою снягі тры таму назад, калі адзін вяртаўся з ловаў. Яна стаяла ў снежнай ямачцы — сама сабе надыхала, — і гэтае яе дыханне застыла зверху празрыстаю льдзінкаю. Кветка цікава асвятляла снег.

Ён тады доўга любаваўся ёю сам, а затым збегаў па Войху, і яны ўдваіх доўга і шчыра радаваліся гэтаму цуду ў снезе, і Войха не злавалася на яго за тое, што змусіў яе ісці ў такую далеч з-за нейкай там кветкі.

Гэтая кветка абудзіла ў ім раптам чысціню і надзею і той жа час засмуціла яго, прымусіла зірнуць на сябе збоку.

"Пачакай, пачакай, — разважаў ён зараз, — вось ты паўзеш, спяшаешся ў стойбішча. Але навошта? Хто цябе там чакае? Суродзічы ўжо, мусіць, пахавалі і забыліся пра цябе. Войха? Ды ёй, мусіць, захоплена расказвае Тым, як ён паваліў маманта. Астатнія радуюцца ўдаламу паляванню, запякаюць мяса ў гліне, смажаць на гарачых каменнях, рэжуць яго тонкімі палоскамі і вешаюць вяліцца — каб было што есці потым, калі здарыцца раптам голад. Смяюцца, весяляцца, цешацца... І тут з'явішся ты, нібы нябожчык, нібы той, хто вярнуўся з таго свету..."

Хуткія Ногі раздражнёна змяў даланёю, расцёр у пальцах кветку, быццам у тым, што здарылася з ім, вінавата якраз яна, а потым яшчэ прапоўз па ёй жыватом і заскарадзіў яе нагамі...

— Ты жывы?! — нечакана пачуў ён над сабою. — А Тым казаў што цябе растаптала гара. І я іду, каб аддаць цябе зямлі. Каб ты застаўся цэлы і пад зямлёю. Каб цябе не з'елі тыя, каго ядзім мы...

Ён падняў галаву — над ім стаяла Войха. Паляўнічаму нават здалося, што яна ласкава ўсміхаецца яму.

— Ты паўзеш? Не ідзеш, а паўзеш? Пакажы мне свае ногі, — адразу ж папрасіла яна.

Войха вельмі асцярожна пачала іх абмацваць, пагладжваць, злёгку сціскаць. Яму было балюча. Каб не крыкнуць, каб крыху заглушыць боль, ён узяў у губы забаўку — Войха гэта не бачыла — і зайграў. Войшыны пальцы, нібы наткнуўшыся на што, здрыгануліся, крыху памаўчалі, а тады зноў — толькі ўжо ласкавей і далікатней — пачалі абмацваць яго ногі. І чым тужлівей ён іграў, тым беражлівей рабіліся яе рукі.

— Ага, наша жыццё залежыць перш за ўсё ад нашых ног, — нібы сама сабе, нібы прадаўжаючы нейкую сваю думку, ціха сказала Войха. — Ёсць ногі — мы жывыя, а няма...

Яна не дагаварыла, задумалася: нібы сама ў нечым сумнявалася, на нешта адважвалася.

Ён усё яшчэ іграў — усё даставаў з забаўкі шум дажджу, які яшчэ не дайшоў сюды, але які ўжо і чуваць,і відаць. Забаўка шапацела, шумела, лопала, нібыта буйныя кроплі і напраўду скочваліся па лісці дрэў у траву.

Ён не бачыў яе, але адчуваў, што яна адышлася да свайго плечака і нешта там шуршэла, нешта шукала. Калі яна зноў падышла, ён убачыў, што ў руках Войха трымае кавалак гатаванага мяса.

— Я спякла яго на камянях, — сказала яна. — Табе.

— Дык Тым жа сказаў, што я мёртвы, — Хуткія Ногі дастаў на хвіліну з рота забаўку, а сказаўшы гэта, зноў сунуў яе ў губы.

— А я не паверыла яму...

Войха прысела наўколенцы перад ім, сваім нажом адкроіла ад кавалка лусту мяса і дастаўшы з ягоных вуснаў забаўку, пачала карміць.

Яна карміла яго, як дзіця, — з рукі. Ён, абапёршыся на локаць крыху прыўзняўшыся над зямлёю, еў тое, што яна давала яму, а сам усё глядзеў на яе — любаваўся ёю.

Потым яна, абцёршы сваёю даланёю яму вусны, зноў пайшла да плечака і вярнулася адтуль з валакушаю — і пра яе Войха не забылася. Яна разаслала валакушу на траву, сказала:

— Я зраблю табе ногі, мой мужчына. Я збяру табе іх нанова. І ты будзеш бегаць лепей, чым на тых, што ў цябе былі.

Яна хацела ўсцягнуць яго на валакушу, але ён не даўся і ўспоўз на яе сам.

Войха ўзялася за вяроўкі, паспрабавала, ці зручна будзе цягнуць, сказала:

— А цяпер пайшлі ў стойбішча, Хуткія Ногі.

І пацягнула валакушу ў той бок, адкуль кожны дзень з'яўляецца сонца.

У стойбішчы на гэтым Кургане ў Войхі і Хуткіх Ног нарадзілася дзесяцёра дзяцей. І хоць яны рана паміралі, усё ж паспелі даць патомства, нарадзіць сваіх дзяцей. Ад гэтых дзяцей пайшлі Бус і Бераж, Жыва і Светлавока, Гарабой і Мікаш, Краска і Міланега, якія таксама раджалі нашчадкаў, што зноў жа раджалі сваіх нашчадкаў.

Ад гэтых перашалюдзей нарадзіліся і язычнікі Лютабор і Дуброўка, Вышата і Купалінка, Дабранег і Людуміла, Позвізд і Галуба, Вышата і Забава, Машэка і Яліна. І яны раджалі і пладзіліся, жылі і весяліліся на той зямлі, якую ж потым самі назавуць Беларуссю. На той зямлі, на якой праз нейкі час з'явіцца Друцкае княства, з'явіцца Орша, з'явіцца двор Зубрэвічы, дзе будзе князяваць Дзмітрый Зубрэвіцкі.

А тая сцяжынка, якую, цягнучы ў стойбішча мяса маманта, праклалі валакушамі першалюдзі і па якой прапоўз ён, Хуткія Ногі, стане праз стагоддзі ці то насыпным кацярынінскім шляхам, ці то шашою Мінск—Масква.

Тут, між Дняпром і Дзвіною, народзяцца пасля Анціп, Сямён, Хімка, знойдуцца таксама Пракоп і Яўхім'я, Іван і Васюта, якія народзяць Улляну і Данілу — маіх бацькоў.

Адзін толькі Хуткія Ногі ад самага пачатку ў мяне так і называўся. Тым жа быў Хвірам, а Войха — Вольшаю.

Аднаго разу я неяк сасніў тую дарогу, па якой поўз Хуткія Ногі. Збоч яе ўсё з той жа дзідаю з мамантава біўня стаяў, нібыта чакаючы каго, чалавек.

— Слухай, яшчэ здалёк загаварыў ён да мяне, — навошта ты выдумаў мне такое непрыгожае імя? Мяне ж усе ў стойбішчы звалі Тымам. І твая Вольша была ў нас Войхаю.

І чалавек грозна ўваткнуў дзіду ў зямлю.

І я не тое, што спалохаўся, але ўсё ж памяняў імёны — хай яны будуць такія, пад якімі іх ведалі калісьці ў стойбішчы на Кургане.

ПАМЯЦЬ

Жонка, сяброўка, каханая

З вялікім смуткам успрыняла вестку аб смерці Марыі Філатаўны — жонкі нашага слыннага пісьменніка Івана Пятровіча Шамякіна. Мне пашчасціла неаднойчы сустракацца з Марыяй Філатаўнай. Была ў яе нейкая прыцягальная сіла, што прываблівала да сябе людзей незвычайнай добразычлівасцю, сардэчнасцю, жаночай абаяльнасцю. У жалобны час, сам па сабе, перада мной паўстаў яе вобраз — і не толькі ў мастацкім адлюстраванні Івана Пятровіча, — а і ў рэальнасці.

Калі я працавала ў "Настаўніцкай газеце", мне даводзілася звяртацца да Івана Пятровіча, як былога настаўніка, з просьбай выступіць у нашым выданні. Не памятаю выпадку, каб Іван Пятровіч адмовіў рэдакцыі. А яго, нават кароткае пісьменніцкае слова, было важным і значным для педагагічнай грамадскасці. У асяроддзі настаўнікаў, асабліва старэйшага пакалення, яго ўсе паважалі і паважаюць, цэняць аўтарытэтнае слова, бо Іван Пятровіч ніколі не быў абыякавы да жыцця школы, яе праблем, праблем народнай адукацыі.

І калі здаралася, што, тэлефануючы, я не заставала Івана Пятровіча дома, трубку брала Марыя Філатаўна. Мяне прыемна здзіўляла і кранала яе ветлівасць, добразычлівасць, уважлівасць. Ад яе нельга было пачуць нетактоўнага слова, раздражняльнасці, калі хочуць адчаліцца ад чалавека, які надакучае і адымае час. Наадварот — яна заўсёды гаварыла, куды пайшоў Іван Пятровіч і калі можа вярнуцца, і што абавязкова перадасць просьбу рэдакцыі, нават раіла, калі лепей пазваніць у наступны раз. З такой увагай, разуменнем мала хто з пісьменніцкіх жонак ставіўся да газетчыкаў. А калі мне неяк давялося зайсці па матэрыял, які Іван Пятровіч падрыхтаваў да друку і не змог перадаць з-за сваёй занятасці, я была проста расчулена сустрэчай з Марыяй Філатаўнай. Кранала яе душэўнае хараство, спагадлівасць, жаночая шчырасць і даверлівасць. Акрамя таленту маці, у яе быў надта рэдкі талент — талент жонкі пісьменніка, які дадзены далёка не кожнай жанчыне, лёсам наканаванай быць спадарожніцай жыцця мастака слова, ды яшчэ — знакамітага. Я часта пра гэта думала, захапляючыся такім талентам Марыі Філатаўны.

Пашчасціла мне сустракаць Марыю Філатаўну і ў маладзейшыя гады. Не, не тады, калі Іван Пятровіч пакахаў маладую дзяўчыну сваю будучую жонку, а значна пазней, калі ў іх былі ўжо дзеткі. Так здарылася, што мы з мужам патрапілі ў госці да Васілеўскіх — Галіны і Пятра. Былі там — светлай памяці — Андрэй Макаёнак, Аляксей Кулакоўскі, а таксама Іван Пятровіч з Марыяй Філатаўнай. Надта даўно гэта было. Сплылі тыя гады, нібыта плынь ракі, ужо і залатое вяселле адзначылі Васілеўскія, але памяць аб той сустрэчы захавала ўсё да драбніц, быццам у звілінах мозгу ёсць свая магнітная стужка, якая навечна "запісвае" непаўтоныя моманты жыцця. Час непадуладны іх сцерці.

Марыя Філатаўна вылучалася адметнай прыгажосцю беларускай жанчыны з натуральнай аксамітнай белізной твару. І ўсё было ў яе натуральнае — не падфарбаванае, не падробленае — ад знешнасці да душэўнай прыгажосці. Памятаецца, яна спяшалася пайсці пакарміць немаўля, якое ў іх нарадзілася. Гэта рабіла яе па-асабліваму адухоўленай, шчасліва заклапочанай жанчынай.

Жонка, сяброўка, каханая — Марыя Філатаўна пражыла складанае і цікавае жыццё, напоўненае клопатам пра дзяцей, пра сям'ю, і вядома ж, пра неардынарнага свайго мужа, таленавітага пісьменніка, якому ведала цану і ўмела спрыяць яго творчай працы. Напэўна ж, не без яе заслуг, той ношы фізічнай і маральнай, якую давялося несці па жыцці і якую ні на якіх вагах не ўзважыць, Іван Пятровіч напісаў столькі непаўторных, цудоўных твораў.

Нягледзячы на ўсе нягоды, вялікія страты, якіх амаль ніхто не мінае ў жыцці, у Марыі Філатаўны была шчаслівая доля жанчыны, маці, жонкі славутага пісьменніка. І да апошніх дзён яна заставалася добрым, сціплым, высакародным чалавекам.

Усе, хто ведаў Марыю Філатаўну, захаваюць светлую памяць пра яе, бо сваім жыццём, адносінамі да жыцця і да ўсіх, хто яе акружаў, яна заслужыла вялікую пашану і ўшанаванне.

Вельмі спачуваю Івану Пятровічу, яго дзецям, унукам, усім, для каго Марыя Філатаўна была самым дарагім і блізкім чалавекам.

Вядома, што ў жыцці ёсць свае непазбежнасці. Усе гэта ўсведамляюць. Але перажываць іх вельмі цяжка. І няма слоў, каб суцешыць...

Лідзія ДАНІЛОВІЧ

БЕЛАРУСКІ КАЛЕГІУМ

АБВЯШЧАЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ

на дадатковае з 1 кастрычніка 1998 г.

Бакалаўрскае /магістэрскае навучанне ў спецыялізацыях:

— **філасофія/літаратура** (праграма навучання прадугледжвае спецыялізацыю: пераклад літаратуры па сацыяльных навуках)

— **журналістыка**

— **найноўшая гісторыя**

Цыкл навучання — тры гады, з наданнем па выніках навучання ступеняў бакалаўра і магістра.

Прымаюцца студэнты старэйшых курсаў гуманітарных спецыяльнасцяў альбо асобы з вышэйшай адукацыяй па выніках сумоўя. У выключных выпадках прымаюцца і студэнты малодшых курсаў. Навучэнцы Калегіуму забяспечваюцца навучальнымі і метадычнымі матэрыяламі.

Навучэнцамі непасрэднай адукацыйнай сістэмы Калегіуму могуць быць толькі асобы, што стала альбо на час вучобы пражываюць у Мінску. Разгортванне дыстанцыйнай сістэмы навучання (для студэнтаў Калегіуму па-за межамі Мінска) плануецца распачаць з 1 чэрвеня 1999 года.

Навучанне ў Беларускім Калегіуме — бясплатнае.

Дыплом Калегіуму не замяняе сертыфікат аб вышэйшай адукацыі.

Лекцыі Калегіуму з'яўляюцца адкрытымі. Асобы, якія не з'яўляюцца студэнтамі Беларускага Калегіуму, але сістэматычна наведваюць лекцыі, рэгіструюцца ў якасці вольных слухачоў.

Навучальныя праграмы Калегіуму не дублююць існуючыя праграмы дзяржаўных і недзяржаўных універсітэтаў у Беларусі.

Кірункі навучання па спецыялізацыях ажыццяўляюць Цэнтр Еўрапейскага Супрацоўніцтва "ЭўроФорум" (філасофія/літаратура), Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва", інстытут Цэнтральна-Усходняй Еўропы (найноўшая гісторыя), Беларуская Асацыяцыя Журналістаў (журналістыка).

Запіс абітурыентаў — па тэл.: 256-36-13 з 10.00 да 17.00 штодня, акрамя суботы і нядзелі.

ПАРОДЫЯ

Радыёвішчанне перабудоўваецца!

ВЯДУЧЫ. Пачынаем перадачу "Для тых, у каго не ўсе дома". Вітаем, сардэчна вітаем вас, сябры! Мы, супрацоўнікі радыё, рашуча перабудаваліся ў рабоце. І, як паказвае апытанне, правільна зрабілі! Больш бадзёрасці і аптымізу! Згодна з апошнімі ўказаннямі, жыць становіцца лепш, жыць становіцца весялей! Сваімі перадачамі мы пастараемся і вам падвысіць настрой. Слухайце нас кожны дзень у абедзенны перапынак на ўсіх хвалях! Прабачце, тэлефонны званок! Гэта просіцца на сувязь па сваім пейджары наш спецыяльны карэспандэнт Антаніён Губа-Шлёпаў, які толькі што вылецеў на верталёце нашай радыёкампаніі на месца невялікай аўтакатастрофы. Антоша, ты ў прамым эфіры! Мы слухаем цябе, даражэнькі!

ГУБА-ШЛЁПАЎ. Так, так, спадары-таварышчы! Катастрофа не отчань вялікая. У аўтафургоне-маразільніку, што ляжыць дагары ў кювеце, яшчэ дрыгаюць ногі... э-э, прабачце, круцяцца колы. Вакол — скопішча машын, гэта астанавіліся не проста цікаўныя, так змусіла зрабіць вадзіцеляў і пасажыраў іх добрае сэрца. З раскрытых дзвярэй ззаду фургона насыпалася цэлая гара ружовых апельсінаў, мы тут і спусціліся. Каля гэтай гары натоўп астанавіўшыхся, усе смакуюць апельсіны, хваляць тавар, а сёй-той запіхвае гэтае аранжавае дабро ў кішэні і торбачкі. Ваісціну, нету худога без добрага. Твары ва ўсіх свецяцца дабрынёй і спагадай — цудоўная рыса нашага менталітэту! Я лупіны ад апельсінаў не выкідваю, не засмечваю экалогію, я хаваю іх у кішэню — спатрэбяцца дома на цэдру... А цяпер паспяшаемся да легкавой машыны-інамаркі... Ляжыць на ўзбочыне дарогі на баку, крыху памятая. Яе разрэзваюць аўтагенам, каб дастаць шафёра. Пасажыраў гэтай машыны ўжо запіхваюць ў "скорыя помашчы", павязуць каго ў бальніцу, каго ў морг. Ва ўсіх твары спакойныя, добрыя, я сказаў бы — рахманыя. "Як вам працуецца?" — гэта я пытаюся ў аўтагеншчыка.

АЎТАГЕНШЧЫК. Мне пашанцавала, да гэтага я паўгода хадзіў у беспрацоўных. Пажаданне адно... Не — лепш два! Каб працы было больш, мы сваіх мазоляў не пашкадуем. Другое... Магутнасць аўтагенаў нашым канструктарам трэба павялічваць, бо сталь у машынах агліцкая, паддаецца рэзанню цяжка.

ГУБА-ШЛЁПАЎ. А вось шафёру інамаркі пашанцавала менш. Яго ўжо можна дастаць, хаця і па частках. Да той часткі, што з галавою, я і абрашчаюсь з пытаннем: "Як ваша прозвішча, калі ласка?"

ШАФЁР. Бутылёнак... Гаўрыла.

ГУБА-ШЛЁПАЎ. Как вы сібя чуйствуеце?

ШАФЁР. Нарма... Ды...-хаю...

ГУБА-ШЛЁПАЎ. Думаю, што вы на дасцігнутым не астановіцеся. Хутка ў вас будзет новая інамарка. Віншуем вас з будучаю пакупкаю! Якую песню вы хацелі б паслухаць? Вы міня слышыце? Гм, гм... Паважаныя радыёслухачы! Просім прабачэння... Частку цела з галавою ўжо панеслі, засталася ніжняя. Мы і звяртаемся да ніжняй... Вам, спадар Бутылёнак Гаўрыла, мабыць, будзе прыемна паслухаць песню пра рамантычную прафесію шафёраў. Папросім студыю ўключыць запіс!

ВЯДУЧЫ. Нам думаецца, што і будучым шафёрам, і тым, хто сёння ў дарозе, таксама будзе да душы такая песня! Хоць яна і пра геолагаў.

(Гучыць песня "А путь твой далек и долог, и нельзя повернуть назад!")

ВЯДУЧЫ. Працягваем сваю работу. За мінулы тыдзень у рэспубліцы адбылося 57 пажараў. Агнём знішчаны кароўнік з каровамі, свінарнік са свіннямі і парасятамі, збожжасховішча, сем адзінак сельгастэхнікі, дзесяць індывідуальных дамоў. У агні загінула чатыры чалавекі, у тым ліку пяцігадовы хлопчык. Панесеныя страты невялікія, усяго на нейкіх два трыльёны рублёў. Але грошы што — глупства. Калі сёння няма — заўтра надрукуюць. Крыху прыкра, што гінуць зусім непавінныя людзі, наша асноўнае багацце. Наш карэспандэнт Андрон Умалішэўскі перадае з вёскі Сяміхатка, што ў Хамутоўскім раёне.

УМАЛІШЭЎСКІ. Паважаныя і радыя слухачы. Вы рады зноў пачуць мой жыццёрадасны голас... На месца пажару я прыбыў яшчэ за гадзіну да пажару. Вось такі я чалавек... Вядома ж, давялося прабавіць крыху часу ў мясцовай краме з напоямі. Яшчэ раз пераканаўся, як хораша і весела, з песнямі жывуць тут людзі! Але вось і пажар, дзякуй Богу, дачакаўся... Ай-яй-яй, ад хаты засталіся адны галавешкі, яны яшчэ нават дымяцца. Дзякуй раённым пажарным! З агаркаў, якія яны паспелі патушыць можна будзе нарыхтаваць дроў на ўсю зіму. Пад плотам бачу рахманую, прыемна азызлую жанчыну з двума дзецьмі, каторыя ёсць амаль голыя... Іх можна зразумець! Горача сёння, сонца так і смаліць, так і смаліць... У цяньку, пад плотам вельмі прыемна пасядзець. Як ваша прозвішча, прыгажуня цётачка?

ЦЁТАЧКА. Апівуда... ік!.. Ганна... ік!.. Петрапаўлаўна;

УМАЛІШЭЎСКІ. Усё згарэла?

ЦЁТАЧКА. Усё!.. Ік!.. І муж... Дзяцей паспела выхапіць.

УМАЛІШЭЎСКІ. А як усё здарылася?

ЦЁТАЧКА. Проста... Заснуў мужык п'яны... з цыгаркаю ў пасцелі.

УМАЛІШЭЎСКІ. Дзетачкі, а вы што скажаце дзядзю? Сюды во гаварыце, у мікрафон!

ДЗЕЦІ. Мы такія радыя: усе пацукі і мышы пагарэлі. Мы іх так баяліся — горш за тату!

УМАЛІШЭЎСКІ. Віншую вас усіх... Э-э... Пардон, спачуваю вам усім. У вашым становішчы, каб паставіць на месца стрэс, вельмі карысна і прыемна будзе адцягнуцца і паслухаць добрую песню.

ВЯДУЧЫ. Памехі ў эфіры, мы не пачулі адказу шаноўнае Ганны Петрапаўлаўны. Каб патрапіць вашаму густу, паслухайце нават дзве!

(Гучаць упярэмешку, нібы абняліся на падпітку, дзве песні: "И пить будем, и гулять будем, а смерть придет — помирать будем!" — "Час такі і век такі — піце піва, мужыкі!")

ВЯДУЧЫ. Рэспубліка наша квітнее і будуецца. Нядаўна ва ўрачыстай абстаноўцы паблізу сталіцы быў адкрыты першы ў рэспубліцы хоспіс. Даруйце, дарагія слухачы, што наша мова засмечваецца інастраннымі. Хоспіс — здаецца, з японскіх двух слоў: хоцу піса... Але не будзем адцягваць вашу ўвагу на дробязі. Лепш паслухаем рэпартаж з гэтай урачыстасці. На сувязі — наша спецкарэспандэнтка Сюсюзяна Кураедава.

КУРАЕДАВА. Ад замілаванасці мне хацелася б весці свой сённяшні рэпартаж, распяваючы, як гэта робяць у операх. Або вершамі... Але я не спявачка і не паэтэса, я насмелюся толькі агалосіць маю пяшчотную перапрабку з Маякоўскага: "Я знаю — будзе горад, і сад будзе цвісці, калі старыя й хворыя свой дом змаглі знайсці!" Так! З'явіўся ўжо свой дом у безнадзейна хворых і старэнькіх-нямоглых! Іхнім бліжэйшым сваякам з-за шчырай працы на карысць сабе і Радзіме, з-за ўшчыльненага рытму жыцця няма калі паклапаціцца пра тых, хто гасцюе на зямлі апошнія свае дзянькі-дзянёчкі. Пакуль распачаліся ўрачыстасці, я паспела крыху пагаварыць з дырэктаркай дома-хоспіса Ружай Барысаўнай Берышвілі-Мацюк. Яна сказала:

ДЫРЭКТАРКА. Нашы безнадзейна хворыя і знямоглыя старыя паміраюць у цяпле і доглядзе. Кормім іх па ўзмоцненай праграме, не шкадуем спісваць на іх прадукты.

КУРАЕДАВА. Можа, з'явіліся ўжо спонсары, фундатары ў вашага дома?

ДЫРЭКТАРКА. О, так! Першы адгукнуўся Дуралобаў Еван. У яго тут здадзеная пад распіску маці. На яго грашовую дапамогу мы нядаўна купілі оптам дваццаць дамавін.

КУРАЕДАВА. Прабачайце, злыя языкі распускаюць плёткі, што быццам з-за гэтага ў вашым доме адбыўся ледзь не бунт?

ДЫРЭКТАРКА. Іменна — злыя языкі. Іменна — плёткі. Але бунт быў: адзін стары адмовіўся піць кампот, бо ў яго шклянцы было на тры ізюмінкі менш, чым у суседа.

КУРАЕДАВА. Дзякуй вам, Ружа Барысаўна, за такія мацярынскія клопаты. Бо яшчэ невядома, мо і нам давядзецца дажываць свой век у гэтым доме. А цяпер пярэйдзем непасрэдна да ўрачыстасці... Яна прайшла весела і натхнёна. Стужку ля дзвярэй перарэзаў сам мэр бліжэйшага пасёлка, ля якога размешчаны крэматорый. З прамовамі выступалі і мэр, і дырэктарка дома, і загадчыца сталовай дома-хоспіса. А ў час урачыстага банкета выступіў шырокавядомы ў ваколіцах бард Афінагеня Бардадым, які пад гітару і прытанцоўкі мілагучна прахрыпеў некалькі песенек, і ўсе яны прыгучалі жыццесцвярджальна. Затым усе з захапленнем праслухалі выступленне аркестра з пацыентаў. Ён натхнёна выканаў малавядомы твор Ігана Бахасына "Паміраць — дык з музыкай!" Я слухала пранікнёныя гукі і расчульвалася да слёз. Якія таленавітыя нашы людзі! Колькі іх і дзе ляжыць! Які здатны на ўсякія выдумкі наш народ! Напрыклад, двое старых трымаюць гелікон, трэці дзьме ў гэтую шырачэнную, разяватую трубу, чацвёрты перабірае клавішы-"гузікі" — а ў выніку музыка, класіка. Потым аркестр выканаў песню "Апошні нынешні дзянёчак гуляю з вамі я, друззя!", якая плаўна перайшла да мажорнай, заліхвацкай беларускай полечкі-трасухі. Яна нават і паўмёртвых падняла на ногі — пусціліся ў скокі. Адна закаханая пара дзевяностагадовых тут жа павезла на калясачках заяву мэру, каб зарэгістраваў іх шлюб. Гулянка закончылася пад раніцу, калі пацыенты даўно ўжо спалі мярцвецкім сном.

ВЯДУЧЫ. Так, так, дарагія радыёслухачы! Як тут не расчуліцца! Праўду пісаў вялікі пралетарскі пісьменнік Максім Горкі: любоў перамагае смерць... Наша перадача падыходзіць к канцу. Але ў заключэнне хочацца хоць два словы сказаць пра нашу пошту. Яна вельмі багатая, на нашу перадачу прыходзіць шмат пісьмаў і просьбаў з падзякамі і ўхваламі. Вельмі цёплае пісьмо, напрыклад, мы атрымалі ад пятай жонкі грамадзяніна Сяміпсова Стругайлы Жыўкавіча. Жонка просіць перадаць прывітанне трэцяй і чацвёртай жонкам Сяміпсова, што знаходзяцца ў тым, памянёным ужо намі, домехоспісе. Зваць іх Таіса і Раіса. Пятая жонка Сяміпсова піша: "Праспявайце для іх беларускую песню, забыла, як называецца, але ў ёй ёсць такія радкі: "А раўнівы муж вёў жану тапіць..." Вельмі шкада, паважаная пятая жонка Сяміпсова, што вы не напісалі, як вас завуць. Тым не менш просьбу вашую выконваем. Нам зразумела ваша гора і спачуванне да тае песеннае жонкі, якую вялі тапіць, а яна "плакала шчэ й прасілася: "Не тапі мяне рана звечара, а тапі мяне ночкай цёмнаю: людзі будуць спаць, меней будуць знаць".

(Гучыць заказаная песня)

ВЯДУЧЫ. На гэтым наша перадача закончана. Праз хвіліну слухайце інфармацыйную праграму "Брэха дня".

Паўлюс КАШАПЛЁТАЎ

Марцін КОЎЗКІ

Доля праўды

— Прыкра, — скардзіўся чалавек, — вечна нешта недапрацуеш. Колькі зроблена ў камп'ютэрны век, а на клавішы націскаем уручную. Хай бы фартэпіяна іграла, а рука яго не кранала. Ёсць такія ўзоры між намі — вунь двое размаўляюць вачамі.. — Нам бы, — марылі няўмекі, — неяк пераўзысці чалавека.

●

Майстэрства калажу. Каб усё змянілася, нічога не трэба перарабляць, дастаткова парушыць маштабы: адных зрабіць вялікімі, а іншых вакол дробненькімі. І справа не столькі ў аднолькавасці, як у колькасці тых і другіх.

●

Слепавокі (з народнага). — Як справы? — пытаўся ва ўсіх слепавокі. — Як бачыш, — казалі яму абібокі. — Навошта вы кліце з мяне, мужчыны? — Ты ж сляпы. — А я ўсё бачу спінаю. Добра ведаю вашы турботы: зачыняць краму, а заўтра субота. Не бачу пакуль што на тварах сцень, бо ўжо зачынілі — на санітарны дзень... Абібок усхапіўся: — Праўду кажуць, відушчы не ўбачыць, сляпы заўважыць.

●

Пісьмо ў Саюз пісьменнікаў. Нешта мала ў нас акадэмікаў. Прапаную для чынадральства і прэмій утварыць пры саюзе свае акадэміі — акадэмію прозы, акадэмію паэзіі, акадэмію крытыкі, акадэмію гарэзіі. Уяўляеце: правадзейныя члены, члены-карэспандэнты, вылучэнні, выбары, мантыі, пазументы. З якой удзячнасцю некаторыя скромнікі напішуць новыя званні на помніках, спачыюць на лаўрах пад шляхетнай сігнатурай. А літаратура — што літаратура? Літаратура як сістэма будзе развівацца і без акадэмій.

●

Жаба спыталася плотку, як змагацца супраць патоку. — Хвастом віляць, — адказала плотка, — збоку браць, не пасяродку.

●

Сельскія могілкі са згоды многіх вынесены на край аўтамабільнай дарогі. "Будзем ляжаць як ля крамлёўскай сцяны", — вырашылі вясковыя чыны. Колькі трэба яшчэ пакаленняў, каб вёска перастала жыць "па Леніну"?

●

"Адцвіла кветка", — падумаў пра суседку. І пачуў услед: "Састарэў дзед"... Ну і што, дзед, будзь мужчынаю, адчувай праўду спінаю. Старасць не спозніцца, але "дзед" не "пясочніца", мо што шчэ і споўніцца.

●

Спектраграма: хлусіць — не чырванее, хвалюецца — не бялее, зайздросціць — не жаўцее, злуецца — не зелянее. Прырода хваробы: шэрая асоба.

●

Гонкі па вертыкальнай сцяне, матацыкла ўзлёт матыльковы. Погляд на прыцягненне зямлі, скажам шчыра, аднабаковы. У мільгаценні колаў і сцен мірсціцца тварык крытыка Н. Стыль ягоны і метад звыклы: зверху ўніз, са сцяны, з матацыкла.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЛіМ

ЗАСНАВАЛЬНІКІ

Саюз беларускіх пісьменнікаў; рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Галоўны рэдактар Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Мікола ГІЛЬ — *намеснік галоўнага рэдактара*
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ,
Жана ЛАШКЕВІЧ,
Алесь МАРЦІНОВІЧ,
Барыс ПЯТРОВІЧ — *першы намеснік галоўнага рэдактара,*
Віктар ШНІП — *адказны сакратар*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі — 2848-461
намеснікі галоўнага рэдактара — 2848-525, 2331-985
АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 2848-204
пісьмаў і грамадскай думкі — 2331-985
літаратурнага жыцця — 2848-462
крытыкі і бібліяграфіі — 2331-985
паэзіі і прозы — 2848-204
музыкі — 2848-153
тэатра, кіно і тэлебачання — 2848-153
выяўленчага мастацтва, аховы помнікаў — 2848-462
навін — 2848-462
мастацкага афармлення — 2848-204
фота-карэспандэнт — 2848-462
бухгалтэрыя — 2366-071

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку" (г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77)

Індэкс 63856.
Наклад 4282
Нумар падпісаны ў друк 11.6.1998 г. у 17.30.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 999
Заказ 3560/Г

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12